Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

3 ЛІПЕНЯ 2014 г. ЧАЦВЕР № 123 (27733) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Дарагія суайчыннікі!

Віншую вас з галоўным дзяржаўным святам — ДНЁМ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ (ДНЁМ РЭСПУБЛІКІ)!

Гэта знамянальная дата ў гістарычным календары нашай краіны сімвалізуе вызваленне беларускага народа ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Роўна 70 гадоў таму мы адстаялі мірную будучыню Радзімы, і гэты бясцэнны здабытак мы абавязаны захаваць для нашых нашчадкаў.

Сёння мы ўспамінаем імёны загінулых герояў: байцоў Чырвонай Арміі, партызан і падпольшчыкаў. Цаной неймаверных намаганняў, а часам і самога жыцця яны здабылі Перамогу ў той страшнай вайне.

Змагаючыся плячо ў плячо, народы Савецкага Саюза перамаглі агульнага ворага і пазбавілі чалавецтва ад фашысцкага рабства.

На шляху да незалежнасці нам давялося пераадолець шмат выпрабаванняў. Дзякуючы самаадданай працы і дапамозе брацкіх савецкіх народаў мы аднавілі рэспубліку з руін, дабіліся права самастойна вызначаць свой лёс і занялі дастойнае месца ў сусветнай супольнасці.

За гэтыя гады мы сталі мацнейшымі, мудрэйшымі і гатовы адказаць на любыя выклікі сучаснасці.

У гэты вялікі дзень жадаю ўсім моцнага здароўя, шчасця і плённай працы на карысць любімай Айчыны! Няхай у вашых дамах пануюць мір і дабрабыт!

Са святам вас, дарагія сябры!

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.



СІМВАЛ ВЕРЫ Ў ЛЮДЗЕЙ І Ў ПЕРАМОГУ ПРАЎДЫ І ДАБРА

Беларусь была першай у свеце краінай, якая стварыла Музей Вялікай Айчыннай вайны. Учора ў Мінску адкрыўся яго новы будынак

Адной з ключавых падзей святкавання 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў стала адкрыццё новага будынка Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў Мінску. У цырымоніі адкрыцця, якая адбылася ўчора, прынялі ўдзел Прэзідэнты Беларусі і Расіі Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін.

Фотаздымкі БЕЛТА.

Расійскі лідар прыбыў да абеліска «Мінск — горад-герой», дзе яго вітаў кіраўнік беларускай дзяржавы. Затым прэзідэнты разам падняліся па лесвіцы да абеліска і ўсклалі да яго падножжа букеты кветак.

У музеі лідары дзвюх краін азнаёміліся з экспазіцыяй, пагутарылі з ветэранамі.

У выступленні на цырымоніі адкрыцця новага будынка музея Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў Беларусі вельмі высока цэняць факт прысутнасці Прэзідэнта Расіі — кіраўніка братняй дзяржавы, самага бліжэйшага і надзейнага саюзніка — на гэтым памятным мерапрыемстве. «Менавіта разам з вялікай Расіяй, з братнім рускім народам мы здабылі тую цяжкую, але вельмі патрэбную Вялікую Перамогу. Сімвалічна, што мы адкрываем гэты святы храм памяці разам. Гэта была наша агульная вайна. Гэта была наша агульная перамога, і такой яна застанецца навечна», — падкрэсліў беларускі лідар.

Нягледзячы на акупацыю ў гады Вялікай Айчыннай вайны, беларусы засталіся непакораным народам, заявіў Прэзідэнт Беларусі. «Галоўны ўдар гітлераўцаў прыйшоўся на Маскву праз нашу Беларусь. Бясстрашныя абаронцы Брэсцкай крэпасці і Магілёва, героі Мінскага падполля і беларускія партызаны — усе яны разумелі сваю праўду ў барацьбе з агрэсарам і мужна змагаліся, не шкадуючы ўласнага жыцця».

Прэзідэнт падкрэсліў, што беларускі народ заплаціў за Перамогу самую высокую цану: «Кожны трэці загінулы жыхар Беларусі, сотні тысяч вязняў канцлагераў, тысячы разбураных гарадоў і спаленых вёсак — такая страшная цана нашай свабоды».

«Мы глыбока шануем агульны летапіс гераізму і подзвігаў савецкага народа. Ганарымся тым, што беларусы плячом да пляча з рускімі, украінцамі, азербайджанцамі, армянамі, казахамі і іншымі народамі СССР адстаялі Маскву, абаранялі Ленінград, удзельнічалі ў Сталінградскай бітве, на Курскай дузе і ў стратэгічнай аперацыі «Багратыён», якая вызваліла Беларусь», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што неўміручыя словы князя Аляксандра Неўскага «Не ў сіле Бог, а ў праўдзе» з'яўляюцца ключом да разумення вытокаў Вялікай Перамогі ў бітве з фашысцкімі захопнікамі, удзел у якой прымалі ўсе народы Савецкага Саюза.

«Менавіта паражэнне гітлераўцаў на Усходнім фронце вызначыла зыход Другой сусветнай вайны, а затым і ўсё пасляваеннае светаўладкаванне. І гэта праўда! Здавалася б, заходнія дзяржавы павінны шанаваць унёсак нашых народаў у Вялікую Перамогу, аднак замест удзячнасці ад іх мы бачым пагардлівы дыктат і санкцыі. І гэта, на жаль, таксама праўда!» — адзначыў беларускі лідар.

«Сапраўдную пагарду ў нашых людзей выклікае адкрытая хлусня пра вайну, калі розныя псеўдагісторыкі выстаўляюць здраднікаў героямі, а захопнікаў — вызваліцелямі, калі яны бессаромна перакройваюць гісторыю пад канкрэтны палітычны заказ і спрабуюць скрасці ў нашага народа Вялікую Перамогу. Такім марадзёрам мы давалі і будзем даваць рашучы адпор, адстойваючы гэты найважнейшы гістарычны здабытак. І ў гэтай вайне супраць марадзёраў мы таксама будзем разам», — падкрэсліў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка асабліва адзначыў, што Беларусь заўсёды была супраць скажэння праўды пра вайну і стала першай у свеце краінай, якая стварыла Музей Вялікай Айчыннай вайны. Рашэнне аб яго стварэнні было прынята ў адзін з самых цяжкіх перыядаў вайны, калі Беларусь знаходзілася пад акупацыяй. «Якой жа моцнай і непахіснай была вера людзей у перамогу праўды і дабра!» — заўважыў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт падзякаваў архітэктараў, будаўнікоў, супрацоўнікаў музея і ўсіх тых, хто прымаў удзел у стварэнні гэтага храма народнай памяці. «Яго адказная місія — данесці будучым пакаленням усю праўду пра вайну», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка адрасаваў цёплыя словы падзякі ветэранам за вялікі подзвіг. «Мы зробім усё магчымае, каб новыя пакаленні ніколі не забыліся аб сапраўдных героях Вялікай Айчыннай вайны», — запэўніў беларускі лідар.

У сваю чаргу Уладзімір Пуцін адзначыў, што беларускі народ у гады Вялікай Айчыннай вайны паказаў прыклад самаахвярнасці і шчырай любові да Радзімы. «Мы схіляемся перад мужнасцю і воляй беларускага народа», — падкрэсліў расійскі Прэзідэнт.

Уладзімір Пуцін павіншаваў ветэранаў, працаўнікоў тылу і «ўвесь братэрскі беларускі народ» з 70-годдзем вызвалення ад гітлераўскай акупацыі і Днём Незалежнасці. Ён таксама адзначыў, што Беларусь перажыла цяжкую акупацыю, зведала ўсе жахі вайны, жорсткасць нацызму. «Мы памятаем трагедыю Хатыні, іншых беларускіх вёсак, спаленых разам з жыхарамі», — сказаў Уладзімір Пуцін.

Прэзідэнт Расіі нагадаў, што больш за 1,3 млн ураджэнцаў Беларусі змагаліся на франтах Вялікай Айчыннай вайны, а звыш 400 — сталі Героямі Савецкага Саюза. Акрамя таго, вялася барацьба ў тыле ворага. «Партызанскі рух Беларусі, у якім змагаліся людзі розных нацыянальнасцяў, стаў сімвалам народнага гераізму», — падкрэсліў Уладзімір Пуцін, нагадаўшы, што менавіта ў гэтыя дні 70 гадоў таму партызаны прымалі ўдзел разам з савецкімі войскамі ў легендарнай аперацыі «Багратыён».

СТАР. 2

ВІНШАВАННІ З ГАЛОЎНЫМ СВЯТАМ

На адрас Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі і беларускага народа паступаюць шматлікія віншаванні ад замежных лідараў, вядомых грамадскіх і палітычных дзеячаў з нагоды Дня Незалежнасці Беларусі, які ў гэтым годзе супадае з юбілейнай датай — 70-годдзем вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе кіраўніка беларускай дзяржавы.

Віншавальныя пасланні паступілі ад лідараў краін СНД, Старшыні Кітайскай Народнай Рэспублікі, Прэзідэнта Ісламскай Рэспублікі Іран, Караля Саудаўскай Аравіі, кіраўнікоў шэрагу краін Еўропы, Азіі, а таксама палітычных і грамадскіх дзеячаў.

Кіраўніка беларускай дзяржавы таксама павіншавалі Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Кірыл, Папа Рымскі Францыск, Князь і Вялікі Магістр Суверэннага Мальтыйскага Ордэна Фра Мэцью Фестынг.

У віншаванні Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі Уладзіміра Пуціна, у прыватнасці, гаворыцца: «Адносіны паміж нашымі краінамі дынамічна развіваюцца, апіраючыся на шматвяковыя традыцыі дружбы, саюзніцтва і ўзаемадапамогі. Трывалыя расійска-беларускія сувязі служаць асновай для інтэграцыйнага супрацоўніцтва на прасторы СНД, якое выходзіць на якасна новы ўзровень дзякуючы падпісанню Дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе. Упэўнены, што сумеснымі намаганнямі мы забяспечым паспяховую рэалізацыю гэтага важнейшага праекта».

Старшыня КНР Сі Цзіньпін у сваім віншаванні адзначыў, што надае вялікую ўвагу развіццю кітайска-беларускіх сувязяў і мае намер падтрымліваць добрыя дзелавыя адносіны, умацоўваць дружбу з беларускім бокам, прыкладаць сумесныя намаганні для вывядзення адносін на новы ўзровень.

Віншавальныя пасланні ў адрас Прэзідэнта Беларусі і беларускага народа прадаўжаюць паступаць.

ПАМЯЦЬ БЕЗ МЕЖАЎ

Вянок ад Прэзідэнта Беларусі ўчора ўскладзены ў Маскве да Магілы Невядомага салдата каля Крамлёўскай сцяны. Урачыстая цырымонія была прысвечана 70-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Дню Незалежнасці, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Кветкі таксама ўскладзены да памятных знакаў «Горад-герой Мінск» і «Брэсцкая крэпасць-герой», устаноўленых на Алеі гарадоў-герояў у Аляксандраўскім садзе.

У цырымоніі прынялі ўдзел пасол Беларусі ў Расіі Ігар Петрышэнка, ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, намеснік дзяржсакратара Саюзнай дзяржавы Іван Бамбіза, члены Калегіі (міністры) Еўразійскай эканамічнай камісіі Сяргей Сідорскі, Уладзімір Гошын, Валерый Карашкоў, намеснікі выканаўчага сакратара СНД Анатоль Дронь і Сяргей Іваноў, намеснік генеральнага сакратара АДКБ Генадзь Нявыглас, прадстаўнікі фракцый палітычных партый КПРФ, «Адзіная Расія», «Справядлівая Расія» ў Дзярждуме РФ Генадзь Зюганаў, Дзмітрый Савельеў, Франц Клінцэвіч, Таццяна Маскалькова, лётчыкі-касманаўты Валянціна Церашкова і Пётр Клімук, прадстаўнікі беларускай дыяспары, беларускія курсанты, якія навучаюцца ў Расіі, дыпламаты.

Пасля заканчэння цырымоніі ў Пасольстве Беларусі ў Расіі адбылося ўшанаванне ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. Пасол Ігар Петрышэнка ўручыў франтавікам — удзельнікам наступальнай аперацыі «Багратыён» медалі «70 гадоў вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў».

■ Незалежнасць — гэта...

ГОНАР, САМАСВЯДОМАСЦЬ, ПАТРЫЯТЫЗМ

У жыцці кожнага народа ёсць лёсавызначальныя дні, якія становяцца кропкай адліку новага этапу. 3-га чэрвеня 1944 года — знакавая для нашай краіны, для кожнага яе жыхара дата, сапраўды ўпісаная ў сэрцы крывёю. Менавіта гэты дзень па волі беларусаў стаў Днём Незалежнасці, звязаўшы ў адно цэлае такія паняцці, як «перамога» і «свабода». Свабоду нельга здабыць па загадзе, дзякуючы росчырку пяра. Наша незалежнасць заснавана на заслугах пакаленняў пераможцаў. А абараняць і захоўваць яе — нам. Так, дарэчы, лічаць і тыя, каму мы прапанавалі адказаць на, здавалася б, простае і, разам з тым, вельмі складанае пытанне: «Што такое незалежнасць?»

Мікалай САМАСЕЙКА,
старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах:

— Любая дзяржава, якая пазіцыяніруе сябе як паспяховая, павінна ставіць перад сабой рэалізацыю дзвюх асноўных задач: забеспячэнне нацыянальнай бяспекі і клопат пра дабрабыт. Выкананне гэтага і фарміруе незалежнасць краіны. Свята 3 ліпеня — гэта свята ўсенароднае, калі кожны беларус адчувае сваё дачыненне да тых працэсаў, што адбываюцца ў рэспубліцы; свята, якое дорыць аптымістычныя надзеі на будучыню.

Адам КАВАЛЬКА,
член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, старшыня Астравецкага райвыканкама:

— Калі чалавек незалежны, ён самы шчаслівы чалавек. І гэта тычыцца ўсіх кірункаў нашага жыцця. Тое самае можна сказаць і пра дзяржаву. На незалежнасць нашай дзяржавы працуе і грандыёзны праект, які сёння ажыццяўляецца на Астравеччыне, — будаўніцтва атамнай электрастанцыі. Яго мэта — не толькі ўнесці важкі ўклад у эканоміку краіны, бо 25 працэнтаў электрычнай энергіі ад патрэб усёй Беларусі дасць наша станцыя. Самае галоўнае — у выніку мы зменшым выкарыстанне газу, а значыць, знізім энергетычную залежнасць краіны, што, у сваю чаргу, звязана з нацыянальнай бяспекай.

Дзень Незалежнасці ў Беларусі асаблівы яшчэ і тым, што супадае з 70-годдзем з дня вызвалення нашай сталіцы ад гітлераўскіх захопнікаў. Гэта — вялікае свята, асаблівая радасць!

Аляксандр ФЕНЬ,
ветэран Вялікай Айчыннай вайны, удзельнік Сталінградскай і Курскай бітваў, удзельнік вызвалення Беларусі:

— Аб незалежнасці сведчыць тое, што мы можам самастойна планаваць развіццё нашай дзяржавы, вырашаць, з кім наладжваць міжнародныя сувязі, а не падпарадкоўвацца загадам іншых дзяржаў, як сёння гэта адбываецца ва Украіне. Да вайны мы былі незалежнымі: усе рэспублікі былога Савецкага Саюза складалі адзіную незалежную дзяржаву. Калі гітлераўская Германія, парушыўшы дагавор аб ненападзенні, вераломна напала на СССР, мы сталі залежнымі ад дзеянняў фашысцкіх элементаў, якія падпарадкавалі сабе ўвесь Захад. Мы ўступілі ў барацьбу за нашу незалежнасць і дамагліся свайго. І сёння ўдзельнікі вайны вельмі рады, што тая барацьба за незалежнасць была недарэмнай.

Сцяпан БАМБІЗА,
генеральны дырэктар Нацыянальнага парку «Прыпяцкі»:

— Асабіста для мяне незалежнасць — гэта найперш прыгожая, цудоўная, моцная краіна, гэта шчаслівыя людзі, дагледжаныя дарогі і палі, па якіх едзеш і разумееш, што ўсё ў нас у парадку. Гэта таксама і мудрае, узважанае кіраванне краінай, дзякуючы якому сталі магчымымі ўсе названыя дасягненні. Гэта аптымізм, з якім людзі глядзяць у будучыню, і непаўторнае адчуванне, калі мы самі, беларусы, ганарымся сваёй краінай.

Уладзімір ГРОЗАЎ,
старшыня праўлення міжнароднага дабрачыннага фонду «Сям'я — Яднанне — Айчына», намеснік старшыні Грамадскай рады па маральнасці ў Беларусі:

— Увесь час гісторыя распараджалася так, што Беларусь пастаянна імкнуліся паглынуць, падмяць — то з усходу, то з захаду... А з атрыманнем незалежнасці беларусы, па сутнасці, упершыню сталі самі сабой — як нацыя, духоўная супольнасць, цэласнае грамадства. І ўсведамленне таго, што мы — адзіная, незалежная, свабодная, дружалюбная сям'я, дарагога каштуе. Для мяне як грамадзяніна, для маіх дзяцей гэта вельмі важна. А як прадстаўнік духоўнай сферы, дадам, што духоўны вектар для хрысціянства — таксама незалежнасць: незалежнасць ад граху, ад усяго таго, што пастаянна цягне чалавека да нізкага. Беларуская праваслаўная царква ў гэтым сэнсе ўяўляе сабой прыклад гарманічнага супрацоўніцтва з дзяржавай, з грамадствам — і гэта зноў жа вынік нашай рэальнай незалежнасці.

СТАР. 2

ISSN 1990 - 763X

СІМВАЛ ВЕРЫ Ў ЛЮДЗЕЙ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Гэтая пераможная бітва — адна з найбуйнейшых у гісторыі Другой сусветнай вайны. Яна прадэманстравала талент палкаводцаў, мужнасць салдат і афіцэраў. Увесь свет убачыў, што такую армію — нашу армію — перамагчы нельга», — сказаў Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі. «Бліжэй стала перамога ў Вялікай Айчыннай вайне, наша агульная перамога, за якую народы Савецкага Саюза заплацілі вялікую цану», — дадаў расійскі лідар.

Ён адзначыў, што менавіта таму так беражліва захоўваецца памяць пра тыя падзеі. Уладзімір Пуцін пазітыўна ацаніў факт адкрыцця новага будынка музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў Мінску: «Гэта сапраўдны помнік несмяротнаму подзвігу нашых продкаў і нашых суайчыннікаў, усім, хто змагаўся з фашызмам». Ён таксама адзначыў, што экспазіцыі музея будуць спрыяць выхаванню падрастаючага пакалення, якое павінна раўняцца на сапраўдных герояў, якія абаранілі сваю Радзіму і адстаялі свабоду. «Вельмі важна выхоўваць у моладзі катэгарычнае непрыманне саміх ідэй нацызму, каб ён больш нідзе і ніколі не падняў галаву», — асобна адзначыў Прэзідэнт Расіі.

Уладзімір Пуцін нагадаў, што ў будучым годзе будзе адзначацца 70-годдзе Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. «Беларусь у якасці старшыні СНД уносіць вялікі ўклад у падрыхтоўку да юбілейных мерапрыемстваў на прасторы Садружнасці. Будзем і далей цесна каардынаваць планы па арганізацыі ўрачыстасцяў з беларускімі сябрамі. Нашы бацькі і дзяды перамаглі, таму што былі разам», — сказаў расійскі Прэзідэнт.

Таксама ён адзначыў, што Расія і Беларусь працягнуць умацоўваць добрасуседскія сувязі ў рамках Саюзнай дзяржавы. Больш за тое, новыя вялікія магчымасці для паглыблення ўзаемаадносін дае дагавор аб ЕАЭС.

«Перакананы, стабільнасць і росквіт нашых краін, адзінства народаў Расіі і Беларусі — менавіта тое, за што змагаліся і пра што марылі героі Вялікай Айчыннай вайны. Няхай слаўныя традыцыі братэрства, узаемадапамогі, адзінства будуць і далей служыць надзейнай асновай для развіцця расійска-беларускіх сувязяў і саюзных адносін», — рэзюмаваў Уладзімір Пуцін.

Прэзідэнт Расіі зрабіў запіс у кнізе ганаровых гасцей музея. «Экспазіцыя нікога не можа пакінуць абыякавым. Яна распавядае пра герояў, якія адстаялі свабоду і незалежнасць Радзімы, пра неўміручы подзвіг воінаў, партызан, працаўнікоў тылу. Ад усёй душы дзякую калектыву музея за вашу вельмі патрэбную і карысную працу», — гаворыцца ў запісе. Прэзідэнт Расіі паднёс у дар музею перыёдыку, прысвечаную вызваленню Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка таксама зрабіў запіс у кнізе ганаровых гасцей, у якім падкрэсліваецца, што адкрыццё абноўленага музея з'яўляецца знакам падзякі і павагі да герояў Вялікай Перамогі.

Падчас адкрыцця новага будынка музея ў прысутнасці Прэзідэнтаў Беларусі і Расіі таксама адбылася ўрачыстая цырымонія перадачы памятнага мяча «Гораду-герою Мінску» з серыі падарункавай зброі «Меч Перамогі». Меч «Гораду-герою Мінску» выраблены аўтарскім калектывам Златаустаўскай зброевай кампаніі. Формай і зместам гэта падарункавая зброя сімвалізуе нязломны дух, згуртаванасць і гераізм савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Плануецца, што меч зойме пачэснае месца ў экспазіцыі музея.

У ходзе сустрэчы двух прэзідэнтаў у Мінску Аляксандр Лукашэнка назваў прыезд Уладзіміра Пуціна ў Беларусь у гэтыя святочныя дні сімвалічным. «Гэта сімвалізуе наша адзінства, сведчыць пра тое, што мы як былі тады разам, так і заўсёды будзем разам, — сказаў Прэзідэнт Беларусі. — Мы вельмі цэнім ваш прыезд у гэтыя святочныя дні. Няхай і цяжкія былі часы, але ўсё-такі перамога пасля ўсіх цяжкасцяў была жаданая і агульная».

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў Уладзіміру Пуціну за прыезд, а таксама за дапамогу і падтрымку, якія аказваюцца краіне і эканоміцы. «Мы гэта памятаем, і паверце, што паволі і Расія, і Беларусь з сусветнага крызісу выходзяць. Мы станем на ногі і, упэўнены, эканамічна будзем яшчэ мацнейшымі», — падкрэсліў беларускі лідар.

У сваю чаргу Прэзідэнт Расіі павіншаваў кіраўніка беларускай дзяржавы і ўвесь беларускі народ з 70-годдзем вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. «Мы ўжо сёння ўспаміналі аб тых неверагодных ахвярах, якія прынёс на алтар перамогі беларускі народ, як шмат было зроблена пасля Вялікай Айчыннай вайны для аднаўлення рэспублікі і такога светлага, прыгожага горада Мінска», — сказаў кіраўнік расійскай дзяржавы.

Гаворачы аб двухбаковым супрацоўніцтве, Уладзімір Пуцін падкрэсліў, што краіны будуць і далей аб'ядноўваць свае намаганні. «Нашы сумесныя намаганні па інтэграцыі ў эканамічнай сферы, безумоўна, прыносяць і прынясуць свой плён у яшчэ большым памеры, і мы не толькі павялічым аб'ёмы нашай эканомікі, але і яе якасць», — адзначыў Уладзімір Пуцін. Ён звярнуў увагу на тое, што зусім хутка пачне дзейнічаць Еўразійскі эканамічны саюз. «Без усякага сумневу, гэта будзе яшчэ адным крокам наперад у аб'яднанні намаганняў нашых народаў, нашых дзяржаў на базе ўсяго таго станоўчага, што дасталася нам з ранейшых часоў і што было зроблена рукамі і паліта, прама скажам, крывёю, калі мець на ўвазе ваенны час, нашых продкаў, бацькоў і дзядоў», — сказаў Прэзідэнт Расіі.

Паводле БЕЛТА.

■ Клопат і пашана

ФОТА НА ПАМЯЦЬ

На іх тварах — шырокія ўсмешкі, радасць вялікага свята. Мы запомнім іх такімі: мужнымі, бадзёрымі, шчаслівымі людзьмі, з мноствам ордэнаў і медалёў на грудзях. Мінскі гарадскі Савет дэпутатаў і Мінгарвыканкам арганізавалі здымку на памяць, дзякуючы якой у альбоме гісторыі краіны назаўсёды захаваюцца твары тых, хто прайшоў праз страшнае пекла, каб падарыць нам чыстае мірнае неба.

Старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Васіль Панасюк адзначыў, што клопат пра ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны знаходзіцца ў зоне асаблівай увагі дэпутацкага корпуса сталіцы. Старшыня таксама паведаміў, што шмат мерапрыемстваў арыентавана менавіта на тое, каб кожны з ветэранаў адчуваў гэты клопат, быў акружаны ўвагай, атрымліваў неабходную дапамогу ад дзяржавы.

— Сярэдні ўзрост ветэранаў — 90 гадоў, але многія з іх прымаюць актыўны ўдзел у мерапрыемствах, што праводзяцца ў горадзе, — расказвае Васіль Панасюк. — Яны ўважліва ставяцца да знешняга выгляду горада, стану вуліц і дварою. Іх жыццёвы вопыт вельмі важны для нас.

Самых актыўных грамадскіх дзеячаў сярод ветэранаў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны Мінгарсавет дэпутатаў узнагародзіў ганаровымі граматамі.

Акрамя таго, на пляцоўцы каля Беларускага дзяржаўнага музычнага тэатра разгарнулася прадстаўленне ад студэнтаў Універсітэта культуры з танцамі, ваеннымі жартамі і песнямі, якія клікалі ў бой, весялілі салдат на фронце, сумавалі разам з жанчынамі падчас чакання з вайны сваіх герояў з перамогай.

Любоў БЯЛЯЕВА, Фота аўтара.

■ Міжнароднае супрацоўніцтва

НАТУРАЛЬНАСЦЬ АДНОСІН

Беларусь зацікаўлена ў сяброўстве з Кітаем у сферах эканомікі, інвестыцый і культуры

Пра гэта паведаміў учора кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Андрэй Кабякоў на сустрэчы з намеснікам загадчыка Міжнароднага аддзялення ЦК КПК Чжоў Лі.

«Я спадзяюся, што вам вельмі спадабаецца ў нашай сталіцы, — звярнуўся да кітайскай дэлегацыі Андрэй Кабякоў. — Тым больш, што ў нас вялікае свята — 70-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Праўда, надвор'е не самае лепшае, аднак мы хмары не разганяем. Мы аддаём перавагу ўсяму натуральнаму. Прычым як у таварах, так і ў адносінах. І паверце, што адносіны Беларусі і Кітая самыя натуральныя — адносіны сяброўства».

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта паведаміў, што беларусы ў пэўнай ступені захапляюцца дасягненнямі Кітая, якія ён здолеў зрабіць за апошняе дзесяцігоддзе. «Мы вельмі зацікаўлены ў тым, каб наша ўзаемадзеянне развівалася як у эканамічным, так і культурным плане».

Андрэй Кабякоў таксама лічыць, што адносіны Беларусі і Кітая «павінны праяўляць сябе ў палітычным і крэдытна-інвестыцыйным супрацоўніцтве». Беларусь зацікаўлена і ў інвестыцыйным супрацоўніцтве, прычым гаворка ідзе аб узаемных інвестыцыях. «У тым ліку мы рады прадоўжыць наша ўзаемадзеянне з Міжнародным аддзяленнем ЦК КПК. І я думаю, што ваш візіт стане адным з элементаў напаўнення рэальным зместам стратэгічнага партнёрства нашых краін», — падкрэсліў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі.

Чжоў Лі, са свайго боку, выказаў меркаванне аб тым, што дзвюм краінам было б карысна наладзіць абмен вопытам у сферы падрыхтоўкі кадраў. «Двум бакам — Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі і Міжнароднаму аддзяленню ЦК КПК — неабходна ўмацоўваць супрацоўніцтва і абменьвацца думкамі аб кіраванні дзяржавай і падрыхтоўцы кадраў», — адзначыў намеснік загадчыка Міжнароднага аддзялення ЦК КПК. Ён запрасіў дэлегацыю маладых спецыялістаў Адміністрацыі кіраўніка беларускай дзяржавы наведаць Кітай з візітам у другой палове гэтага года. Кітай, са свайго боку, таксама гатовы накіраваць у Беларусь дэлегацыю маладых палітыкаў.

Чжоў Лі запрасіў наведаць Паднябесную і Андрэя Кабякова, а таксама выказаў падзяку Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі за намаганні па ўмацаванні супрацоўніцтва і двухбаковых адносін паміж краінамі. «Пасля ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж Кітаем і Беларуссю мы пастаянна падтрымліваем адзін аднаго, умацоўваем палітычны давер. Мы сапраўды з'яўляемся надзейнымі партнёрамі», — падкрэсліў прадстаўнік кітайскай дэлегацыі.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ

СВЯТА, ЯКОЕ СТВАРАЕ ТРАДЫЦЫІ

Канцэрт сімфанічнага аркестра Маладзечанскага музычнага каледжа «Дарога любові» адбыўся ў Вялікай зале дзяржаўнай філармоніі пад кіраўніцтвам дырыжора Рыгора Сарокі.

Канцэрт прысвечаны Дню Незалежнасці і 70-годдзю вызвалення краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Праграму, у якой прагучалі песні ваенных гадоў і творы сучасных кампазітараў, падрыхтаваў ураджэнец Беларусі, кампазітар з Санкт-Пецярбурга Леанід Левашкевіч. Арганізатарамі дабрачыннага канцэрта выступілі Беларускае грамадска-культурнае таварыства Санкт-Пецярбурга і Творчая садружнасць «Маэстра» з паўночнай сталіцы Расіі — сябры гэтых аб'яднанняў прыбылі ўчора ў беларускую сталіцу ў рамках акцыі «Цягнік памяці і славы».

На мерапрыемства былі запрошаны ветэраны, прадстаўнікі буйных арганізацый, перадавікі вытворчасці, моладзь.

«Правядзенне дабрачыннага канцэрта становіцца добрай традыцыяй: ужо чацвёрты год запар прадстаўнікі Беларускага грамадска-культурнага таварыства Санкт-Пецярбурга дораць ветэранам, жыхарам Мінска канцэрт напярэдадні Дня Незалежнасці, — распавёў Аляксандр Станкевіч, прадстаўнік Беларускага грамадска-культурнага таварыства Санкт-Пецярбурга.

Аляксандр Станкевіч перадаў таксама гасцям мерапрыемства прывітанне ад губернатара Санкт-Пецярбурга: «Сённяшні святочны канцэрт — падарунак расійскіх і беларускіх музыкантаў. «Дарога любові» спрыяе ўмацаванню братэрскіх адносін паміж нашымі народамі. Подзвіг беларусаў у гады Вялікай Айчыннай вайны бессмяротны. Разам з усімі народамі Савецкага Саюза яны мужна абаранілі сваё права на будучыню».

Госць канцэрта Аляксей Варанцоў, дэпутат заканадаўчага сходу Санкт-Пецярбурга, таксама перадаў вітальнае слова і віншаванні з Днём Незалежнасці ад дэпутатаў заканадаўчага сходу Санкт-Пецярбурга і яго старшыні Вячаслава Макарава.

«Я заўсёды прыязджаю ў Беларусь з вялікай радасцю. Я савецкі чалавек па сваіх поглядах і ладзе жыцця і бачу ў Беларусі куток таго, што мы амаль страцілі», — адзначыў Аляксей Варанцоў.

Фота БЕЛТА.

Кіраўнік расійскай дэлегацыі, якая прыехала на «Цягніку памяці і славы», віцэ-губернатар Санкт-Пецярбурга Вольга КАЗАНСКАЯ.

Калектыў сімфанічнага аркестра Маладзечанскага музычнага каледжа імя М.К. Агінскага яшчэ ў 1987 годзе атрымаў званне народнага. За час свайго існавання паспеў стаць не проста ўдзельнікам, але і пераможцам шматлікіх рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў і фестываляў. Сімфанічны аркестр выступае, акрамя Беларусі, таксама ў Расіі, Польшчы, Літве, Эстоніі, Чэхіі, Германіі, Галандыі, Францыі.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.

ЗА КОЖНАЙ ЛІЧБАЙ — ЛЁС І БОЛЬ

Міністр унутраных спраў генерал-маёр міліцыі Ігар Шуневіч сустрэўся з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, каб павіншаваць іх з 70-годдзем вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Днём Незалежнасці.

Не ўсе запрошаныя, што з'яўляліся некалі супрацоўнікамі МУС, а цяпер знаходзяцца на заслужаным адпачынку, здолелі прыйсці ў залу прыёмаў. Усё ж такі самаму малодшаму з чатырнаццаці чалавек, што прыйшлі на цырымонію ўшанавання, — 87 гадоў, старэйшаму — 97. Дарэчы, усяго ў ветэранскай арганізацыі міністэрства каля 500 чалавек.

— Традыцыйна мы ўшаноўваем і аддаём даніну павагі ўсім тым, хто забяспечыў мірнае жыццё Беларусі, — сказаў спадар Шуневіч журналістам перад пачаткам мерапрыемства. — Наша ветэранская арганізацыя прысутнічае на ўсіх значных падзеях міністэрства, а самі ветэраны па меры магчымасці бяруць удзел у выхаванні асабова саставу, дзеляцца з намі сваім вопытам і дапамагаюць быць годнымі людзьмі, адданымі служэнню сваёй Радзіме...

У сваёй прамове перад ветэранамі міністр нагадаў, што трагедыя вайны закранула кожнага чалавека. У развалінах апынулася 209 беларускіх гарадоў і гарадскіх пасёлкаў, было спалена 9 200 вёсак, многія — часткова ці цалкам з усімі жыхарамі. Загінулі 2,5 млн чалавек, сярод якіх амаль 1,5 млн — мірныя жыхары.

— За кожнай з гэтых сухіх лічбаў — чалавечыя лёс і боль, — сказаў Ігар Шуневіч. — І сёння мы схіляем галовы перад тымі, хто не вярнуўся да сваіх сем'яў... Мы ўдзячныя ўсім, хто дайшоў да Перамогі, хто тытанічнай працай ліквідаваў наступствы вайны і гітлераўскай акупацыі... Вызваленчы шлях нашай арміі па Беларусі пачаўся 23 верасня 1943 года ў раённым цэнтры Камарын і завяршыўся менш як праз год у Брэсце — гераічным горадзе, які першым прыняў на сябе ўдар вайны. У шарэнгах вызваленцаў, партызанаў, падпольшчыкаў змагаліся супрацоўнікі органаў унутраных спраў і ваеннаслужачыя ўнутраных войскаў. Кожны з вас, дарагія ветэраны, — частка багатай гераічнай гісторыі нашай краіны. Кожны з вас з'яўляецца прыкладам для цяперашняга пакалення праваахоўнікаў.

Наша сённяшняя ўрачыстая сустрэча — гэта не толькі працяг добрай традыцыі ўшанавання, магчымасць аддаць вам даніну павагі і выказаць словы глыбокай удзячнасці за бясприкладны подзвіг. Гэта яшчэ пацвярджэнне надзвычай важнай неабходнасці абароны маральных ідэалаў, свабоды нашай Радзімы. Многія з вас і сёння ўдзельнічаюць ва ўсіх значных мерапрыемствах органаў унутраных спраў і ўнутраных войскаў, з'яўляюцца жаданымі гасцямі ў школах, музеях. Для нас вельмі важныя вашы дапамога, парада і жыццёвая мудрасць, — падкрэсліў міністр.

Пасля завяршэння прагляду відэафільма, прысвечанага знамянальнай падзеі і падрыхтаванага супрацоўнікамі МУС, ветэранаў павіншавалі з 70-й гадавінай вызвалення краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Днём Незалежнасці. Ігар Шуневіч асабіста кожнаму ўручыў юбілейны медаль. Акрамя таго, ветэраны атрымалі і па незвычайным падарунку — рэчаваму мяшку — кшталту таго, што быў у кожнага на фронце.

Святлана БАРЫСЕНКА.

■ Незалежнасць — гэта...

ГОНАР, САМАСВЯДОМАСЦЬ, ПАТРЫЯТЫЗМ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Алена СПІРЫДОВІЧ, тэлевядучая, заслужаная артыстка Беларусі:

— На міжасабовым узроўні, куды ні зірні, мы паўсюдна залежым адно ад аднаго. Каб атрымалася добрая сям'я, трэба, каб людзі кахалі, любілі і залежалі адно ад аднаго; тое ж неабходна для моцнага сяброўства. Каб зрабіць разам вялікую, вартую справу, людзі павінны залежаць ад таленту, працы, прыстойнасці сваіх калег. Асабіста ў мяне — чым больш я ад кагосьці залежу, тым лепш усё атрымліваецца. Таму я вітаю такую залежнасць — у чалавечых стасунках. Сябры, давайце будзем залежаць адно ад аднаго!

А вось што датычыцца краіны, то вельмі хочацца, каб у свеце нашу краіну паважалі, каб прыслухоўваліся да яе пазіцыі. І для гэтага якраз не проста патрэбная, а жыццёва неабходная незалежнасць. Каб ніхто звонку не ўказваў, як нам жыць і што рабіць.

Святлана СІТНІКАВА, рэктар Мінскага абласнога інстытута развіцця адукацыі, кандыдат педагагічных навук:

— Для мяне незалежнасць — гэта магчымасць развіцця краіны ў тым кірунку, які дазваляе ёй быць канкурэнтаздольнай на сусветным рынку, калі казаць пра эканоміку. Калі браць іншыя аспекты, то гэта свабода перамяшчэння і волевыяўлення грамадзян па любым пытанні. Гэта — магчымасць фарміравання іміджу канкрэтнай установы, арганізацыі або спецыяліста не толькі ўнутры краіны, але і ў сусветным кантэксце. Калі гэтыя складнікі рэалізуюцца, тады фарміруюцца самасвядомасць, патрыятызм, людзі ганарацца сваёй краінай, домам, родам. А значыць — жывуць у згодзе з сабой.

Васіль ПРАДУН, мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор Баранавіцкага гарадскога канцэртнага аркестра:

— Я думаю, што гэта магчымасць свабодна хадзіць па вуліцах, калі няма налётаў і абстрэлаў. Я сам родам з Украіны, і мне балюча глядзець на тое, што там цяпер адбываецца. А яшчэ незалежнасць асабіста для мяне — гэта магчымасць займацца сваёй любімай справай, тварыць без якіх-небудзь перашкод.

Давід РОТМАН, дырэктар Цэнтра сацыялагічных і палітычных даследаванняў Белдзяржуніверсітэта:

— Мяркую, размову трэба весці пра магчымасць і права дзяржавы прымаць самастойныя рашэнні. Гэтыя рашэнні павінны быць не толькі выгаднымі нашай дзяржаве, але і, безумоўна, адпавядаць міжнародным нормам і правілам.

Раман КРУЧКОЎ, сямейны псіхолог:

— Незалежнасць, па вялікім рахунку, пачынаецца са стану душы, унутранай свабоды канкрэтнага чалавека, з яго жадання і магчымасці мець уласнае меркаванне. Тое, што ўяўляе сабой унутраная свабода кожнага з нас, і складае нашу агульную незалежнасць — на ўзроўні грамадства, народа.

Яўген КЯПУРКА, выпускнік 2014 года Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь:

— Калі казаць пра незалежнасць на ўзроўні дзяржаўнага ладу, то гэта значыць, што краіна не залежыць ад іншых дзяржаў: сваёй палітычнай сістэмай, эканамічным і ваенным патэнцыяламі. Нават наяўнасць сваіх Узброеных Сіл сведчыць аб незалежнасці краіны. Безумоўна, у тым, што сёння мы жывём у такой краіне, вялікая заслуга ветэранаў. Калі нямецкая машына хацела захапіць нашу тэрыторыю і зняволіць беларускі народ, нашы дзяды і прадзеды, бабулі і прабабулі адстойвалі сваю зямлю цаной уласных жыццяў. Гонячы фашызм на захад, яны гэтым самым захоўвалі для нас мір, тэрытарыяльную цэласнасць і незалежнасць.

СЫНОЎНІ ПАДАРУНАК

Беларускаму грамадскаму аб'яднанню ветэранаў Белаграпрамбанк прадаставіў 1 мільярд рублёў у выглядзе бязвыплатнай (спонсарскай) дапамогі. Пра гэта стала вядома на святе, прымеркаваным да 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, якое прайшло у цэнтральным офісе фінансавай установы.

З гэтых грошай 900 млн пойдзе на аказанне матэрыяльнай падтрымкі ветэранам Вялікай Айчыннай вайны. Трыста чалавек атрымаюць дапамогу ў памеры 3 млн рублёў для набыцця медыкаментаў, прадуктаў харчавання, неабходных бытавых прыбораў. Астатнія 100 млн плануецца выдаткаваць на арганізацыю і правядзенне Рэспубліканскім саветам ветэранаў мерапрыемстваў па ўшанаванні герояў вайны. «Матэрыяльная дапамога — гэта сыноўні і даччыны падарунак нашым ветэранам, які надасць ім сіл. Гэта знак прызнання іх заслуг і ў гады вайны, і ў пасляваенны час», — лічыць Анатоль Новікаў, старшыня Рэспубліканскага савета Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў.

Ён адзначыў, што беларускія ветэраны, нягледзячы на пажылы ўзрост і хваробы, захоўваюць актыўную грамадзянскую пазіцыю: сустракаюцца з працоўнымі калектывамі, моладдзю, даносяць праўду пра вайну. «У нас выдатная моладзь, і, калі спатрэбіцца, яна самаддана стане на абарону нашай Айчыны. А пакуль гэтая абарона праяўляецца ў паўсядзённай працы. Мы марым, каб Беларусь квітнела, але для гэтага трэба, каб асабліва моладзь сваёй працай, талентам і рукамі рабіла гэтую казку быллю», — упэўнены Анатоль Новікаў.

Ушанаваў Белаграпрамбанк таксама ветэранаў — сваіх былых супрацоўнікаў, кожнаму з якіх да 70-годдзя вызвалення будзе аказана фінансавая дапамога ў памеры 3 млн рублёў. Старшыня праўлення Белаграпрамбанка Уладзімір Падкавыраў звярнуў увагу на тое, што гэтыя людзі жывуць у розных абласцях краіны і, тым не менш, знайшлі магчымасць, каб прыехаць у сталічны офіс на свята: «Ганаруся тым, што ўвесь калектыў банка ўдзельнічаў у арганізацыі ўшанавання нашых ветэранаў. Будзем рабіць гэта штогод».

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ

«АДПУСКНЫЯ» ЗМЕНЫ

У Беларусі ўводзяцца новыя віды падтрымкі

Гэта прадугледжана Указам Прэзідэнта «Аб дзяржаўнай падтрымцы сем'яў, якія ўсынавілі (удачарылі) дзяцей».

Дакумент накіраваны на ўдасканаленне механізма дзяржаўнай падтрымкі сем'яў, якія ўсынавілі (удачарылі) дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, у мэтах стымулявання нацыянальнага ўсынаўлення.

Указам устаноўлена, што штомесячныя грашовыя выплаты такім сем'ям будуць назначацца толькі ў адносінах да ўсыноўленых (удачароных) дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў і пастаянна пражываюць у Беларусі. Пры гэтым раней назначаныя штомесячныя грашовыя выплаты на дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, што былі ўсыноўлены (удачараны) за мяжой, будуць выплачвацца да дасягнення такімі дзецьмі 16 гадоў.

Назначэнне штомесячных грашовых выплат будзе ажыццяўляцца з дня падачы ўсынавіцелямі ў мясцовы выканаўчы і распарадчы орган дакументаў, прадугледжаных для іх назначэння пералікам адміністрацыйных працэдур.

Указ таксама ўводзіць новыя віды дзяржаўнай падтрымкі асоб, якія ўсынавілі (удачарылі) дзяцей ва ўзросце ад 3 да 16 гадоў, якія пастаянна пражываюць у Беларусі.

Гэта, у прыватнасці, права на кароткачасовы водпуск без захавання заработнай платы тэрмінам да 90 каляндарных дзён на працягу 6 месяцаў з дня ўступлення ў сілу рашэння аб усынаўленні. Такі водпуск будзе прадастаўляцца па месцы працы аднаго з усынавіцеляў (адзінага ўсынавіцеля) для адаптацыі ўсыноўленых дзяцей у новых сем'ях і вырашэння сацыяльна-бытавых пытанняў.

Акрамя таго, прадугледжана дадатковая (разавая) грашовая выплата, якая будзе ажыццяўляцца пры выкарыстанні ўсынавіцелем кароткачасовага водпуску працягласцю не менш як 30 каляндарных дзён у выглядзе штомесячных грашовых выплат у двайным памеры за першы месяц, які прыпадае на такі водпуск.

«ВЯЛІКІ КАМЕНЬ»

Такую назву атрымаў Кітайска-беларускі індустрыяльны парк

Гэта прадугледжана адпаведным Указам Прэзідэнта.

«Ва ўказе зменена найменне Кітайска-беларускага індустрыяльнага парку на «Індустрыяльны парк «Вялікі камень», у аснову якога пакладзена беларуская назва вёскі, што знаходзіцца на яго тэрыторыі», — праінфармавалі ў прэс-службе.

Дакументам прадугледжаны нормы, якія садзейнічаюць стварэнню спрыяльных умоў для прыцягнення айчынных і замежных інвестыцый у Кітайска-беларускі індустрыяльны парк, паскарэнню работ па будаўніцтве яго аб'ектаў, а таксама павышэнні эфектыўнасці работы адміністрацыі парку. Акрамя таго, праведзена карэкціроўка плошчы тэрыторыі парку.

Указам таксама ўносяцца змяненні ў парадак праходжання дзяржаўнай экспертызы праектнай дакументацыі, распрацаванай па тэхнічных нарматыўных прававых актах КНР і іншых замежных дзяржаў. Акрамя таго, прадастаўляецца магчымасць ажыццяўляць будаўніцтва аб'ектаў парку паралельна з распрацоўкай, экспертызай і зацвярджэннем ва ўстаноўленым парадку неабходнай праектнай дакументацыі на кожны з этапаў будаўніцтва.

Усё гэта дасць магчымасць аптымізаваць інвестыцыйныя затраты на пачатковым этапе будаўніцтва парку, прыцягнуць неабходнае фінансаванне на стварэнне яго інфраструктуры.

«Прыняцце ўказа забяспечыць адпаведныя гарантыі і ўпэўненасць патэнцыяльных інвестараў, будзе садзейнічаць больш хуткаму будаўніцтву аб'ектаў парку і рэалізацыі іншых дамоўленасцяў па гэтым праекце», — адзначылі ў прэс-службе.

Паводле паведамленняў Прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

■ Лёсы

ПЕРААДОЛЕННЕ

Былы дэсантнік пасля цяжкага ранення наноў навучыўся хадзіць, атрымаў адукацыю, адкрыў дзіцячы спартыўны клуб

Яго жыццё — змаганне і пераадоленне. Максім гаворыць, што ўсё даецца яму з максімальнымі цяжкасцямі. Відаць, лёс такі. Але выпрабаванні яшчэ больш загартоўваюць яго душу. Калі-небудзь потым ён думае напісаць кнігу, каб стала яна апорай для тых, хто трапіў у падобную сітуацыю. У яго таксама былі апоры і саломінкі, якія не давалі захлынуцца ў адчаі. Але аб усім па парадку.

РАНЕННЕ

Максім Фадзееў з Маларыты марыў служыць у дэсантнай брыгадзе. І рыхтаваў сябе да службы свядома — сур'ёзна займаўся спортам. А калі мара ў 1992 годзе спраўдзілася, то ў сваёй роце ён аказаўся самым падрыхтаваным. Дэсантнікі часта выступаюць на розных святах. Вось і ў Бярозе ладзіліся паказальныя выступленні з нагоды юбілею авіяцыйнай часці. Максім павінен быў іграць ролю забітага салдата. Да яго каскі прывязалі муляж з кардону з выбуховым рэчывам і чырвонай тушшу. У гэтым нумары, калі ў салдата страляюць, адбываецца невялікі выбух, твар залівае фарба, і ён падае, як нежывы... Але па нейчым недаглядзе замест бутафорскага выбуху прагучаў сапраўдны. І салдат атрымаў цяжкае раненне ў галаву.

Ён аказаўся цалкам парализаваны. Цяпер Максім Фадзееў успамінае, як аперацыя за аперацыяй урачы змагаліся за яго жыццё і фактычна выцягвалі з таго свету. Чатыры месяцы хлопец правёў у бальніцах амаль нерухомы. А калі забіралі дадому, урач параіў маці купіць інвалідную каляску, каб аблегчыць сабе догляд. Тады яго ўнутранае «я» ўпершыню запратэставала: «Ніякіх калясак, кійкоў і мыліц! Я буду хадзіць!» Не ведаў тады былы дэсантнік, што крокі акажуцца такімі цяжкімі, а дарога да фізічнага аднаўлення такой доўгай — зацягнецца больш як на дзясятак гадоў. Але ён вырашыў не здавацца.

Цяпер кажа, што вельмі дапамаглі заняткі спортам. Спорт наогул як лад жыцця, як яго філасофія. Дзякуючы ранейшым заняткам ведаў, як трэніраваць тую ці іншую мышцу, і што вынік прыходзіць не адразу. Таму сістэму заняткаў прыдумляў і ўдасканальваў сам. Доўга і настойліва трэніраваў кожную руку, прывязваў пэўны груз і спрабаваў узнімаць. Практыкаванні паўтараў па 1000 разоў. Усё роўна нічога не выходзіла...

ПЕРАЛОМНЫ МОМАНТ

На яго таксама навальваліся хваліны адчаю. Асабліва калі ўсе сыходзілі на працу, Максім пераварочваўся на жывот і плакаў тварам у падушку, каб суседзі не чулі. Калі не давалі вынікаў месяцы, нават гады намаганняў, сябе было вельмі шкада. Ну, за што ўсё гэта яму? Чаму яго равеснікі працуюць, ходзяць з дзяўчатамі на танцы, бестурботна бавяць час, а ён, каб схадзіць у прыбіральню, вымушаны скочвацца на падлогу і паўзці, трымаючыся за сцяну? На такія пытанні не бывае адказаў. Таму многія людзі і не вытрымліваюць, прызнаюць сябе пераможанымі, лічыць Максім. Колькі ў яго было адчайных момантаў! Адзін з іх ён лічыць пераломным.

Хлопец ужо паціху перасоўваўся па пакоі, трымаючыся за розныя поручні. Аднойчы ўдзень, калі ў кватэры нікога не было, дабраўся да кухні, бо хацеў піць. У акне ўбачыў пахавальную працэсію: з пад'езда выносілі суседа. І ён... пазайздросціў нябожчыку, што той не адчувае болю, што наогул атрымаў спакой. Тады Максіму раптам прыйшла думка скончыць усё разам. З лямак парашута, які яму прынеслі для трэніровак, ён хутка зрабіў пятлю, прымацаваў яе і накінуў на шыю. Яго калаціла, нібы ў страшэннай ліхаманцы. Заставалася зрабіць адзін крок... І тут у дзверы нехта моцна пагрукаў. Грукат быў вельмі настойлівы. І, як успамінае Максім, нібы нейкая сіла яго ўласнай рукой рашуча скінула тую пятлю. Ён дасунуўся да дзвярэй, адчыніў: на парозе стаяў прыяцель, які прынёс брашуру з новай сістэмай заняткаў. Пасля таго нешта дакладна змянілася ў яго жыцці. Ён стаў больш настойліва і ўпарта трэніравацца, займаўся са злосцю, з надломам, не шкадуючы сябе, а

часам нават здзекуючыся з сябе, нібы кідаў некаму выклік. І...

Першыя крокі даваліся цяжка. Пáдаў да ста разоў на дзень. Потым навучыўся падаць правільна, а напачатку бразгаўся вобзем, як выпадала. Пастаянна хадзіў у сіняках. Таварышы ўшчувалі, маці плакала. А ён працягваў гэты жорсткі эксперымент над сабой і ўрэшце атрымліваў маленькія перамогі.

АРЫЕНЦІР

Максім Фадзееў лічыць, што для чалавека яго тагачаснага стану вельмі важная нейкая саломінка, прыклад, арыенцір. Каб можна было ўвесь час сабе ўнушаць, паўтараць, як мантру: у яго атрымалася — і ў мяне атрымаецца, ён змог — змагу і я. Такім арыенцірам у свой час для яго стаў расійскі цыркавы артыст Валянцін Дзікуль, які пасля цяжкай траўмы доўга вяртаўся да паўнавартаснага жыцця. Артыст потым напісаў брашуру, дзе выклаў сваю сістэму трэніровак і рэабілітацыі. Нешта з гэтай сістэмы ўзяў для сябе і былы дэсантнік Фадзееў. Узяў галоўнае — ідэю аб тым, што чалавечы арганізм тоіць у сабе неабмежаваныя здольнасці. Важна толькі ўмець задзейнічаць яго рэзервы.

...Мы сядзім з Максімам у маларыцкім парку на беразе невялікага маляўнічага вадаёма. І ён так тлумачыць сваю думку:

— Калі вас прымусіць пераплыць гэта возера, то на сярэдзіне вы дакладна стоміцеся. А калі на вас жа выпусціць тыгра з клеткі, то вы пераадолееце гэты вадаём за лічаныя хвіліны і самі не заўважыце. Так і любы чалавек, любы арганізм у экстрэмальнай сітуацыі здольны вельмі хутка мабілізаваць уласныя рэзервы. Таму я і стараўся для сябе экстрэмальныя сітуацыі.

Напрыклад, ён ставіў для сябе мэту навучыцца бегаць, калі не мог... упэўнена хадзіць. Аднойчы яму, ляжачаму, прысніўся сон, што ён бяжыць. І тады ўпершыню сказаў сабе, што гэта будзе! Сказаў толькі сабе, бо ніхто не паверыў бы. Бегаць вучыўся дзесяць гадоў. Гэтаму папярэднічалі кожны дзень па дзве трэніроўкі, глытаючы слёзы, пераадольваючы боль. Час трэніровак даходзіў да шасці гадзін. Хто яшчэ з інвалідаў першай групы можа пахваліцца такой працаздольнасцю? Таму ў ваенным шпіталі, куды ён прыязджаў штогод на курс лячэння, на хлопца з Маларыты глядзелі, як на іншапланецяніна. Нават вельмі вопытныя ўрачы не маглі згадаць выпадку са сваёй практыкі, каб пасля такой траўмы чалавек да такой ступені аднавіў сваю рухомасць.

Дапамаглі ў гэтай справе, несумненна, і заняткі плаваннем. Першыя тры гады, калі навучыўся хадзіць, наогул адчуваў нейкі страх перад вадой, баяўся патануць. Але страх пераадольваў зноў жа сваімі экстрэмальнымі метадамі. Потым былі розныя методыкі загартоўвання. І вось ужо амаль 15 зім Максім рэгулярна купаецца ў палонцы. У трэнажорнай зале працуе на ўзроўні са здаровымі людзьмі, адціскаецца ад падлогі (чаго не робіць ніхто з падобным дыягназам). Можна яшчэ доўга пералічваць спартыўныя поспехі і дасягненні Максіма Фадзеева, але галоўнае яго дасягненне — перамога над сабой. І праявілася яна не толькі ў фізічным вымярэнні.

ВУЧОБА

Падлеткам ён шмат увагі надаваў спорту, але зусім запусціў вучобу. А калі стаў інвалідам і гаворка не магла ісці аб рабочай прафесіі, паўстала пытанне аб адукацыі. Паступіць ва ўніверсітэт азначала прайсці папярэдне школьную праграму самастойна. І такую задачу паставіў перад сабой наш герой. Найперш ён выпісаў праграмныя творы мастацкай літаратуры (іх аказалася 63) і перачытаў іх. З англійскай мовай спраўляўся пры мінімальнай дапамозе рэпетытараў. А вось з матэматыкай аказалася больш складана. Двое рэпетытараў адмовіліся працаваць, як толькі высветлілі ўзровень абітурыента, яны прызвычаіліся працаваць з моцнымі старшакласнікамі. Тут жа ўзровень быў блізкі да нуля. І толькі адна настаўніца-пенсіянерка ўзялася дапамагчы напарыстаму пераростку. З ёй прайшоў асновы матэматычнага курса, далей засвойваў праграму самастойна. А ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт эканомікі паступаў аж сем (!) разоў. І пасля кожнай няўдачы зноў садзіўся за падручнікі і вучыў. Пасля таго, як на сёмы раз паспяхова здаў уступныя іспыты, стаў адным з лепшых студэнтаў на сваім курсе.

СПАРТЫЎНЫ КЛУБ

Пасля заканчэння ўніверсітэта Максім працаваў у маркетынгавай службе аднаго вядомага брэсцкага прадпрыемства. Але потым сутыкнуўся з праблемай негатыўнага стаўлення да інвалідаў. Усе з разуменнем ківаюць галовамі, на словах выказваюць падтрымку, а на справе стараюцца ўзяць на працу і тым больш прасунуць па службовай лесвіцы чалавека без дыягназу. Яго вельмі крыўдзіла такое стаўленне, было баліча сутыкацца з крывадушшам і адкрытай непрыязню. Але не ў яго правілах было адступаць. Ён вырашыў рэалізаваць сябе ў сваім родным горадзе. Менавіта ў Маларыце, паводле слоў Максіма Фадзеева, апошнім часам шмат робіцца для развіцця фізкультуры і спорту. І ён вырашыў зрабіць свой унёсак — адкрыў для дзяцей секцыю бокса. Секцыя працуе на камерцыйнай аснове. І займаецца ў ёй да пяці дзясяткаў дзяцей, што для невялікага райцэнтра не так і мала. Гэта азначае, што школьнікаў удалося адарваць ад камп'ютараў і тэлевізараў, захапіць фізічнымі заняткамі. Спартыўны клуб таксама даваўся яго арганізатару з цяжкасцямі. Але ўдалося знайсці паразуменне ў старшыні райвыканкама, аблвыканкама, да якіх Максім хадзіў на асабістыя прыёмы. І працэс пайшоў. Цяпер выхаванцы яго секцыі ўдзельнічаюць у розных спаборніцтвах і дэманструюць неблагія вынікі.

З пазіцыі саракагадовага чалавека Максім Генадзевіч часам і сам здзіўляецца, як у яго, зусім маладога і разбітага хваробай, хапіла сіл згрупавацца і прайсці той шлях, які ён прайшоў. «Часам думаю — ці нармальны я? — нявесела ўсміхаецца суразмоўца. — Але прыходжу да высновы, што калі нехта там, наверсе, пакінуў мне жыццё і дапамог не зламацца, значыць, так трэба было. Трэба для таго, хто ў крытычны момант скарыстаецца маім прыкладам, трэба для маёй дачушкі Лізы, каб яна жыла на свеце і магла ганарыцца сваім бацькам. Усім, хто задумваецца над сваім жыццём, магу сказаць: чалавек можа дабіцца ўсяго настойлівай працай. Варта браць за тое, чаго асабліва баішся, і ўсё атрымаецца».

Святлана ЯСКЕВІЧ,
г. Маларыта

ЧАС — СВЯТОЧНЫ, АЛЕ... «ГАРАЧЫ»

Прынамсі, для абітурыентаў гэтага года

Для абітурыентаў наступілі, бадай што, самыя трывожныя дні, бо зусім хутка распачнецца прыём дакументаў у ВНУ. І сёння ўсе спрабуюць, абапіраючыся на вынікі ЦТ, пралічыць свае шанцы на паступленне. Пра апошнія навіны з «фронту» прыёмнай кампаніі і магчымасці, якія адкрываюцца перад маладымі людзьмі, — наша падборка.

НАВУЧАННЕ Ў МІТСО: ДЛЯ ЛЕПШЫХ — БЯСПЛАТНАЕ!

У новым навучальным годзе ў Міжнародным універсітэце «МІТСО» колькасць студэнтаў, якія атрымліваюць вышэйшую адукацыю бясплатна, павялічыцца ў 6 разоў.

Для самых паспяховых абітурыентаў МІТСО ўводзіць 80 бясплатных месцаў: ад 10 да 15 на кожнай спецыяльнасці дзённай формы навучання. Гэта на 65 месцаў больш, чым летась. Варта нагадаць, што ўпершыню магчымасць навучацца ў МІТСО бясплатна з'явілася ў мінулым годзе. Падчас леташняй прыёмнай кампаніі было выдзелена 15 бясплатных месцаў для абітурыентаў, якія паступалі на спецыяльнасць «Міжнароднае права». На іх маглі прэтэндаваць лепшыя з тых, хто падаў дакументы. Такім чынам, прахадны бал на бясплатныя месцы склаў 289.

— Аднак права навучацца бясплатна студэнтам трэба пацвярджаць. Практычна палова з тых, хто паступіў на бясплатную форму навучання, змаглі пацвердзіць свой высокі ўзровень падрыхтоўкі і паспяхова здалі першую сесію, — паведаміла **намеснік дэкана юрыдычнага факультэта, адказны сакратар прыёмнай камісіі Міжнароднага ўніверсітэта «МІТСО» Алена СМАХЦІНА.** — Але некаторым, на жаль, давядзецца саступіць сваё бясплатнае месца больш амбіцыйным студэнтам. Налета ў іх будзе магчымасць палепшыць сваю паспяховасць, вырвацца наперад і зноў прэтэндаваць на бясплатнае навучанне. Гэта будзе для іх стымулам заўсёды быць на вышыні.

Абавязковага размеркавання ў МІТСО няма, нават для студэнтаў, якія навучаюцца бясплатна.

— Але мы аказваем нашым выпускнікам дапамогу ў працаўладкаванні. З многімі кампаніямі, арганізацыямі і прадпрыемствамі ў нас ёсць дагаворы аб супрацоўніцтве, і калі выпускнікі звяртаюцца ў дэканат або аддзел выхаваўчай работы з просьбай пасадзейнічаць у працаўладкаванні, то мы, безумоўна, ідзём ім насустрач, — дадала Алена Смахціна. — Акрамя таго, у нас дзейнічае магутная прафсаюзная арганізацыя студэнтаў, якая пастаянна абнаўляе сваю базу аб вакансіях нашага профілю і садзейнічае ў пошуку работы. Шэраг кампаній самастойна выходзіць на кіраўніцтва ўніверсітэта з просьбай накіраваць да іх маладых спецыялістаў. Самых паспяховых і выдатных студэнтаў працадаўцы «расхопліваюць» яшчэ на апошніх курсах.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

НА ЦТ ПА ЗАМЕЖНЫХ МОВАХ — 13 СТАБАЛЬНЫХ ВЫНІКАЎ

Днямі арганізатары цэнтралізаванага тэсціравання агучылі вынікі двух апошніх прадметаў ЦТ — па замежных мовах і геаграфіі.

Высветлілася, што англійскую мову на 100 балаў здалі 5 чалавек. Менш як 20 балаў па гэтай дысцыпліне набралі 3 623 чалавекі, у тым ліку 4 абітурыенты ўмудрыліся набраць нуль балаў. Па нямецкай мове на 100 балаў тэсты напісалі таксама 5 чалавек. Нулявых вынікаў па гэтай дысцыпліне няма, але 501 чалавек аказаўся за парогам устаноўленага мінімальнага бала. Па французскай мове стабальныя сертыфікаты атрымаюць 3 абітурыенты, а менш як 20 балаў набралі 155 чалавек. На французскай мове абышлося без нулёў. На ЦТ па іспанскай мове самы высокі вынік — 98 балаў. Такую суму набраў адзін абітурыент. І менш як 20 балаў атрымалі 25 чалавек. Нагадаем, што англійскую мову здавалі 17 714 чалавек, нямецкую — 2 684, французскую — 690 і іспанскую — 184 чалавекі.

На ЦТ па геаграфіі да 100 балаў не змог дацягнуцца ніводны абітурыент. Лепшы вынік — 93 балы, але і нулявых вынікаў таксама няма. А менш як 20 балаў набралі 270 чалавек. Тэсты па геаграфіі пісалі 1 399 абітурыентаў.

Сярод удзельнікаў ЦТ гэтага года ёсць тры ўладальнікі двух стабальных сертыфікатаў.

Арганізатары цэнтралізаванага тэсціравання паведамілі, што ўжо прыступілі да друкавання сертыфікатаў, якія абітурыенты змогуць атрымаць у пунктах рэгістрацыі да пачатку падачы дакументаў у ВНУ. Сертыфікаты атрымаюць усе ўдзельнікі ЦТ, якія набралі 1 бал і больш. Нягледзячы на ўстаноўленыя для прэтэндэнтаў на атрыманне вышэйшай адукацыі парогі ў 10, 15 і 20 балаў, паступаць у сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы можна з любой колькасцю балаў (акрамя нуля!). Да таго ж будзе яшчэ і другая хваля залічэння ў ВНУ на вакантныя бюджэтныя месцы, дзе для прэтэндэнтаў мінімальны парог будзе знікаць па ўсіх дысцыплінах на 5 балаў.

ПАДАЁМ ЗАЯВУ, СЕДЗЯЧЫ... НА ЛЮБІМАЙ КАНАПЕ

Маладзёжнае тэлебачанне БДУІР сумесна з прэс-службай універсітэта запусціла серыю рэкламных ролікаў пра магчымасці, якія адкрываюцца сёлета перад абітурыентамі ўніверсітэта. Героямі роліка сталі бабуля і ўнук, які рыхтуецца да паступлення. Адзін з ролікаў прысвечаны стварэнню персанальнага электроннага кабінета абітурыента. Гэта новая распрацоўка БДУІР, дзякуючы якой абітурыенты змогуць цяпер падаваць у прыёмную камісію электронныя заявы, седзячы на канапе дома.

Парадак падачы заяў будзе наступны: абітурыент стварае свой персанальны кабінет на сайце www.bsuir.by для папярэдняй рэгістрацыі заявы ў прыёмнай камісіі. Заява фарміруецца з дапамогай электроннай формы ў інтэрактыўным рэжыме, затым рэгіструецца ў прыёмнай камісіі, і яе копія разам з запрашэннем на падачу дакументаў адпраўляецца абітурыенту на ўказаны пры рэгістрацыі электронны адрас.

Несумненны плюс электроннай заявы ў тым, што ў абітурыента будзе магчымасць у спакойных абставінах расставіць прапанаваныя спецыяльнасці ў парадку прыярытэту. А выбіраць давядзецца аж з 34 спецыяльнасцяў тэхніка-тэхналагічнага профілю. Калі хтосьці сапраўды вырашыць указаць два ці тры дзясяткі спецыяльнасцяў, то запоўніць заяву з першага разу будзе не так і проста. А ў хатняй атмасферы ў абітурыента будзе час, каб паразважаць і вызначыцца з выбарам. Вельмі важна, што спецыяльнасці, якія абітурыент унясе ў свой уласны спіс, будуць аўтаматычна знікаць з агульнага пераліку — а гэта значыць, што паўторы немагчымыя. Атрыманы спіс абітурыент можа шматразова пераправерыць, абмеркаваць яго з бацькамі, скарэктаваць і адправіць ужо канчатковы варыянт. Прыёмная камісія дашле абітурыенту паведамленне, што яго заява прынята, пасля чаго будзе створана pdf-версія заявы, якая адправіцца ў электронны кабінет абітурыента.

Зрэшты, без асабістага візіту ва ўніверсітэт пакуль усё роўна не абысціся. Але маладому чалавеку застанецца толькі прыйсці ў вызначаныя тэрміны ў прыёмную камісію і прынесці з сабой арыгіналы ўсіх патрэбных дакументаў: атэстат аб адукацыі, сертыфікаты ЦТ, медыцынскую даведку, фатаграфіі і дакументы, якія пацвярджаюць права на льготы. Для самых «прасунутых» абітурыентаў падача дакументаў зойме літаральна некалькі хвілін.

Ёсць у персанальнага кабінета і яшчэ адна важная перавага: цяпер уся інфармацыя аб паступленні будзе даступная абітурыенту ў рэжыме анлайн у яго асабістым кабінеце. Акрамя таго, з асабістага кабінета можна будзе задаць пытанне, якое хвалюе, і аператыўна атрымаць падрабязны адказ ад членаў прыёмнай камісіі.

Тэма трох іншых ролікаў — дыстанцыйнае навучанне, мадэль навучання 4+2 і навучанне на англійскай мове. Ролікі будуць дэманстравацца на беларускіх тэлеканалах і на знешніх экранах побач з Палацам Рэспублікі, Палацам спорту і галоўным корпусам БДУ. Акрамя таго, у 150 вагонах метро з'явяцца плакаты з героямі ролікаў, якія стануць дапаўненнем да агульнай канцэпцыі рэкламы сёлетняй прыёмнай кампаніі. Між іншым, у ролі сцэнарыстаў, рэжысёраў, аператараў, мантажораў, стваральнікаў анімацыйнай графікі і фатографаў выступілі студэнты і супрацоўнікі БДУІР. Гэта першы іх падобны досвед...

Падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.

СУР'ЁЗНЫ ПАДЫХОД ДА ВЫХАВАННЯ КАДРАЎ

Каб закрыць патрэбу ў высокакваліфікаваных кадрах, Беларускі металургічны завод аднаўляе практыку выдачы мэтавых накіраванняў абітурыентам, якія паступаюць у ВНУ.

Па-першае, наяўнасць накіравання ад БМЗ забяспечвае студэнту месца праходжання ўсіх практык і працаўладкаванне на вядучае еўрапейскае металургічнае прадпрыемства. Па-другое, БМЗ збіраецца матэрыяльна заахвочваць студэнтаў за паспяховую вучобу. Так, для студэнтаў, якія атрымаюць па выніках сесіі сярэдні бал ад 7,5 да 7,9, памер дадатковай штомесячнай стыпендыі складзе 3 базавыя велічыні, ад 8,0 да 8,9 бала — 5 базавых велічынь і ад 0,9 да 10,0 бала — 7 базавых велічынь. Базавая велічыня складае сёння 150 тысяч рублёў.

Выпускнікам агульнаадукацыйных устаноў, узнагароджаных залатымі і сярэбранымі медалямі, пераможцам і прызёрам абласных і рэспубліканскіх школьных алімпіяд, членам зборных камандаў Беларусі, якія ўдзельнічалі ў міжнародных алімпіядах па агульнаадукацыйных прадметах, даплата будзе налічвацца з першага дня навучання ў памеры трох базавых велічынь.

Таксама БМЗ абавязуецца выдзяліць пры працаўладкаванні маладым спецыялістам, якія маюць патрэбу ў жыллі, месца ў добраўпарадкаваным інтэрнаце. Немалаважным аспектам з'яўляецца і садзейнічанне развіццю прафесіяналізму маладых спецыялістаў.

■ Вакол футбола

Фаварыты ідуць далей

Якіх сенсацый варта чакаць ад чвэрцьфінальных матчаў?

Гульні 1/8 фіналу чэмпіянату свету сюрпрызаў не прынеслі. У чвэрцьфінал выйшлі тыя зборныя, якія павінны былі там апынуцца. Тым не менш амаль што ўсе стартавыя матчы плэй-оф склаліся як пад капірку — няпроста і напружана. Да апошняй секунды нельга было прадказаць, хто ў выніку будзе святкаваць перамогу.

Першы чвэрцьфінал. 4 ліпеня, 19.00. ГЕРМАНІЯ—ФРАНЦЫЯ.

Алжырцаў «бундэнсманшафт» перайграла на класе. Але для гэтага спатрэбілася два экстра-таймы. Афрыканцы прадэманстравалі, што і супраць «нямецкай машыны» можна паставіць «жалезную заслону» шчыльнай абароны. І калі Томас Мюлер разам з паплечнікамі працягне раз за разам губляць свае шанцы, як гэта было ў стартавым матчы плэй-оф, відавочныя фаварыты турніру могуць застацца за бортам медальных разборак.

Французы правялі вельмі эфектны матч супраць нігерыйцаў. «Трохколерныя» паступова і метадычна прэсінгавалі на чужой палове поля і пад канец другога тайма зламалі саперніка. Лагічным завяршэннем гэтага матча стаў... аўтагол нігерыйскага абаронцы. Здаецца, у Дзідзье Дэшама атрымалася настроіць сваіх падапечных на мундзіяль.

Прагноз ад «Звязды»: Зборная Германіі даб'ецца перамогі ў дадатковы час.

Другі чвэрцьфінал. 4 ліпеня, 23.00. БРАЗІЛІЯ—КАЛУМБІЯ.

Ад вышэйзгаданага сцэнарыя адышла толькі зборная Калумбіі. У Бразіліі падапечныя Хасэ Пекермана выступаюць больш чым упэўнена. Чатыры перамогі запар, адзінаццаць забітых галоў і толькі два прапушчаныя ў свае вароты. Не дзіва, што і ўругвайцам гэтыя хлопцы не пакінулі ніякіх шанцаў, вырашыўшы ўсе пытанні яшчэ ў першай палове матча. А Хамес Радрыгес, дзякуючы дублю ў вароты Фернанда Муслеры, выйшаў на першае месца ў табліцы лепшых бамбардзіраў чэмпіянату. Пяць галоў на турніры больш ніхто не забіваў.

А вось зборнай Бразіліі не хапіла асноўнага часу, каб перайграць чылійцаў. Выхад у чвэрцьфінал гаспадары мундзіялю аформілі толькі ў серыі пенальці. Прычым перавага атрымалася мінімальнай — 3:2. І, напэўна, сімвалічна, што тлустую кропку ў гэтай сустрэчы паставіў самы зорны гулец бразільцаў — Неймар.

Прагноз ад «Звязды»: Зборная Калумбіі ўпершыню выйдзе ў паўфінал чэмпіянату свету.

Трэці чвэрцьфінал. 6 ліпеня, 19.00. ГАЛАНДЫЯ—КОСТА-РЫКА.

Галандцы на пару з мексіканцамі стварылі адзін з самых цікавых матчаў 1/8 фіналу. «Ацтэкі» недатравалі дзве хвіліны да перамогі, дазволіўшы Уэслі Снэйдару зраўняць лік. У дабаўлены час «аранжавыя» гулялі на куражы і свой момант ужо не ўпусцілі: Клас-Ян Хюнтелар з пенальці забіў свой другі гол за зборную на чэмпіянатах свету.

У першай гульні плэй-оф костарыканцы, як гэта ні дзіўна, трапілі пад абстрэл грэкаў. Але «эліны» дабіліся свайго, зраўняўшы лік у дабаўлены час, і перавялі гульню ў серыю пенальці. У футбольнай латарэі лёс усміхнуўся прадстаўнікам Цэнтральнай Амерыкі: костарыканцы рэалізавалі ўсе пяць удараў і ўпершыню ў сваёй гісторыі выйшлі ў чвэрцьфінал мундзіялю.

Прагноз ад «Звязды»: Зборная Галандыі спыніць казку костарыканцаў.

Чацвёрты чвэрцьфінал. 6 ліпеня, 21.00. АРГЕНЦІНА-БЕЛЬГІЯ.

На гэтым чэмпіянаце хлопцы ў нябесна-блакітных футболках не ўражваюць. Не хапае націску, хуткасці і прыгожых галоў. Кожны наступны матч для аргенцінцаў складваецца яшчэ больш складана за папярэдні. Так, швейцарцаў двухразовыя чэмпіёны свету перайгралі толькі на заканчэнне дадатковага часу. І калі капітан каманды Ліянель Месі неаднаразова падкрэсліваў незадаволенасць гульнёй зборнай, у фаварытаў сапраўды ёсць праблемы.

Бельгійцы ж пакуль апраўдваюць выданыя ім авансы. Каманда Марка Вільматса выйграла свой чацвёрты матч запар (у экстра-таймах перамагла зборную ЗША. — **Аўт.**), устанавіла нацыянальны рэкорд сваёй краіны на мундзіялях і гатова ісці далей. Паядынак супраць топавай зборнай стане выдатнай праверкай для «маладых ды ранніх», пагадзіцеся!

Прагноз ад «Звязды»: Зборная Бельгіі падарыць балельшчыкам яшчэ адну сенсацыю, перайграўшы аргенцінцаў.

Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ

ЖАНЧЫНА-ЛЕГЕНДА

Пра яе пісала Святлана Алексіевіч, Анатоль Эфрас паставіў спектакль, а Роберт Раждзественскі прысвяціў ёй оду

Пра Валянціну Чудаеву мне расказаў адзін знаёмы падчас падрыхтоўкі чарговага рэпартажу. «Сяржант, камандзір зенітнага разліку, адзіная жанчына-камандзір гарматы ў Беларусі!», — знаёміў мяне з ёй сураз-моўца. — Вельмі прыгожая на свой узрост жанчына, на дзіва сціплы, разумны, добры чалавек». Тады я і падумаць не магла, што ён гаворыць пра адну з гераінь кнігі Святланы Алексіевіч «У вайны не жаночы твар» — як-раз пра тую, лёс якой найбольш уразіў, споведзь якой доўгі час не давала спакою, з якой вельмі хацелася сустрэцца, толькі тады гэта здавалася немагчымым.

І вось я іду да яе ў Дом міласэрнасці, дзе ветэранка праходзіць лячэнне ў рэабілітацыйным цэнтры.

— Бачыце, я жыву ў сапраўдным палацы, — сустракае мяне Валянціна Паўлаўна і праводзіць у свой пакой. — Людачка, нясіце пачастунак!

Афіцыянтка выходзіць з пакою, а Валянціна Чудаева тым часам уводзіць мяне ў курс справы.

— Я тут ужо дванаццаты раз, чатыры аперацыі перанесла. Як жа добра да мяне ўрачы ставяцца, столькі ўвагі!

Затым адчыняе тумбачку і дастае некалькі публікацый, фотальбом, брашуры… Мы ўсаджваемся, і я ўключаю дыктафон.

ДЫКТАФОН ПРАЦАВАЎ ДА ТРОХ НОЧЫ...

— Ведаеш, як Алексіевіч на мяне выйшла? — пачала гутарку Валянціна Паўлаўна. — Ёй падказаў Адамовіч. Ён якраз з Быкавым быў на з'ездзе пісьменнікаў ад Беларусі. Брэжнеў паставіў задачу прадстаўнікам самай партызанскай рэспублікі: напісаць пра дзяўчат, якія былі на фронце. Маўляў, шукайце, пакуль яны жывыя — франтавічкі, партызанкі, падпольшчыцы. Знайдзіце маладзенькую журналістку, каб яна з імі прапаўзла ўсе траншэі, франты прайшла. Няхай суперажывае ім!

Тэлефануе мне аднойчы Адамовіч і кажа, што прыйдзе маладая журналістка. Думаю, навошта мне гэта трэба, колькі іх у мяне ўжо было! Ды і не да таго мне. І дні праз два заяўляецца да мяне такая ж дзяўчынка, як і ты. У абадраным паўпаліто была, у стаптаных боціках. Бедна была апранута. Худзенькая. А мне хутка трэба было сыходзіць: перад важным выступленнем шыла новы касцюм, вось і спяшалася на прымерку. Я ёй кажу: «Дзяўчынка, пра мяне ўжо шмат напісана, фільм зняты. Доўга размаўляць не будзем». А сама — на кухню, накрываю стол: пельменяў наляпіла, напякла сібірскіх пірагоў. А яна ўвайшла ў пакой, нешта падключаць пачала. Я і не ведала, што дыктафон. Мяне яна запісвала на маленькі, які ёй Адамовіч прывёз з Японіі. Казаў: «Калі прыцягнеш свой вялікі, бандуру, то дзяўчаты-франтавічкі спалохаюцца». Вось яна яго і падключала. Села на крэсла, а мяне ўсаджвае на канапу. Думаю, чаго яна мяне ўсё ў гэты кут «піхае»? Я ж тады не ведала, што трэба бліжэй да дыктафона. У яе нешта не атрымлівалася. Думаю, як добра, хутка пойдзе. І тут нешта шчоўкнула… А яна мне і кажа: «Валянціна Паўлаўна, адмяняйце сваю прымерку! Будзем гутарыць!» І запісвала мяне Святлана ажно да трох ночы. Той дыктафон наматаў столькі (некалькі разоў мяняла плёнку)…

Валянціна Чудаева да апошняга не верыла, што нешта атрымаецца, а тым больш выйдзе кніга. І — нарэшце! І не проста выйшла, а прагрымела на ўвесь свет!

НАС ЗАБ'ЮЦЬ — А ШАКАЛАД ЗАСТАНЕЦЦА...

— Табе, напэўна, цікава, што прымусіла мяне, 17-гадовую, ісці на вайну? — пытаецца Валянціна Паўлаўна. — У першую чаргу — трагедыя маёй сям'і. Я — дачка камсамолкі, якая загінула ў барацьбе за хлеб. Маму застрэлілі кулакі падчас калектывізацыі. Мне тады было 9 месяцаў. Бацька мой — герой грамадзянскай вайны, камандзір браняпоезда, накіраванага супраць чэшскага бунту Калчака. Пра яго ёсць нават фільм, «Залаты эшалон» называецца. Да свайго цягніка ён прычапіў вагоны з золатам, не даўшы яго перадаць у Японію. У гэтым баі мой бацька атрымаў 19 раненняў. За выратаванне «залатога эшалону» ў 1931 годзе яго ўзнагародзілі ордэнам Чырвонага Сцяга, які яму ўручыў сам Калінін. Нашу сям'ю вельмі паважалі. Але ў 1937 годзе бацька стаў ворагам народа.

Жанчына і зараз памятае, як яе выганялі са школы, а аднакласнікі не хацелі з ёю сябраваць. Няпроста было і дома. Падчарку асабліва не песцілі. Часта хадзіла па дварах, прасіла ежу. Мачыха нават ёй торбу пашыла. Шмат бачыла гора. Бацька пра гэта не ведаў: партыйны работнік, дома амаль не бываў.

— І як жа я магла застацца ўбаку, калі пачалася вайна? Як зараз памятаю: нядзеля, шыкоўнае надвор'е. Мы з аднакласнікамі якраз былі на рацэ Об, дзе пасля заканчэння школы адпачывалі, лавілі рыбу. Вяртаемся — горад (Новасібірск. — **Аўт.**) бурліць. Нічога не разумеем. Людзі плачуць, чуваць голас Молатава: «Вайна…» Як вайна? Учора не было, а сёння вайна?! Мы цэлым класам — у ваенкамат. Нас выгналі, сказалі, каб развітваліся з бацькамі, якія ідуць на фронт.

Толькі праз некаторы час яны дабіліся свайго. Дзве тысячы камсамольцаў з Новасібірска цягнік павёз на фронт. У дарозе вывучалі матэрыяльную частку кулямёта, вінтоўкі, карабіна. Інструктары дапамагалі разабрацца ў сувязі, паказвалі, як правільна зрабіць перавязку, як накласці жгут. На некаторых станцыях іх высажвалі, кармілі — і назад у вагоны. Аднойчы дзяўчатам раздалі шакалад. Шкадавалі, адкладвалі на потым, а пасля вырашылі: «Давайце з'ядзім, а то нас заб'юць, а шакалад застанецца». Высадзілі амаль праз два месяцы ў Купінску, ва Украіне.

— Прывезлі ў нейкую вёску, арганізавалі нам лазню, — працягвае Валянціна Паўлаўна. — Там на нас наляцелі «месеры» («Месершміты», нямецкія самалёты. — **Аўт.**), пачалі бамбіць. Усе кінуліся да дзядзькі, які глядзеў за лазняй. Крычым: «Дзядзька, ратуйце!» А ў яго на галаве — чырвоны ручнік. Ён мне і кажа: «Здымай! Дэмаскіруеш!» А я яму: «Мне маці не дазваляе з мокрай галавой хадзіць».

У той першай для іх бамбёжцы стала зразумела: на вайну прыйшлі дзеці. 48 дзяўчат не даехалі да фронту…

«ХАЧУ Ў КАМАНДЗІРЫ!»

— У нас столькі было патрыятызму, часам здавалася, што Перамога без нас проста немагчымая, — узгадвае Валянціна Паўлаўна. — Там, у той вайне, у той крыві, голадзе, холадзе мы так гаварылі сабе: «Дзяўчаты, застанемся жывымі, народзім дзяцей, і будзе новае пакаленне, якое калісьці да нас прыйдзе і спытае — як вам жывецца, веданы? А можа, і кубак гарбаты падасць ці хлеб з маслам? Не той, які мы грызлі, сухі і замерзлы, а мяккі ды цёплы».

У Купінску хлопцы і дзяўчаты прайшлі трохмесячную «вучэбку». Давучыцца не паспелі: немцы былі на падыходзе. Адступалі з рэгулярнымі войскамі. Праўда, паспелі прыняць прысягу, атрымаць абмундзіраванне.

— Памятаю, як дайшла чарга да нас: прывезлі гімнасцёркі і спадніцы. Вялікія. Асабліва мне: я тады 41 кілаграм важыла. Думаю, што рабіць: без спадніцы ж не будзеш? Выхад знайшоўся, калі нам далі так званыя рэчмяшкі. Адарвала лямкі, нацягнула на сябе гэты мяшок і тымі ж лямкамі падвязалася. А чаравікі 42-га памеру. Ужо потым пачалі нас абмяраць. Панчохі шарсцяныя шылі, бюстгалтары…

Валянціна Чудаева прайшла Калінінскі, Цэнтральны, Карэльскі і 2-і Беларускі франты. Адразу трапіла ў зенітную часць.

— Чаму Света Алексіевіч назвала артыкул «Тэлефонная трубка не страляе…»? — пытаецца і тут жа знаходзіць адказ Валянціна Паўлаўна. — Я была сувязісткай. А калі ў 1942-м атрымала ад мачахі ліст, што бацька загінуў пад Масквой, у мяне ўсё ўнутры перавярнулася. Думаю, як жа я ваюю! Сяжу ў штабе, у глыбокай зямлянцы, тэлефаную, а мой бацька гіне на полі бою! І тады я бягом да камандзіра палка, кажу яму: «Хачу страляць!» Якраз тады камандзір гарматы быў патрэбен. А ён мне: «Ды цябе ж выбуховай хваляй адкіне, дзяўчынка!», а сам смяецца. А праз некалькі дзён на пастраенні пытае ва ўсіх: «Хто хоча камандзірам гарматы быць?» І я — крок наперад.

Неўзабаве Валянціну Чудаеву адправілі ў тыл, на кароткачасовыя курсы. Вярнулася ў свой полк, на Калінінскі фронт, у званні гвардыі сяржант. Так васямнаццацігадовая дзяўчына стала камандзірам гарматы.

ЦІШЫНЯ НА ФРОНЦЕ — ЧАКАЙ БЯДЫ

— Мы, зенітчыкі, чым займаліся? — успамінае ветэранка. — Мы не хадзілі ў атаку. Мы прыкрывалі то артсклады, то масты, то самалёты, то пэўныя злучэнні… Тыя ж танкісты вельмі любілі, каб перад імі стаялі зенітчыкі. Каб яны ішлі і ведалі, што неба перад імі раскрытае.

У падпарадкаванні Чудаевай знаходзілася 18 дзяўчат. Зараджаючы і яго памочнік — хлопцы. Снарады былі вельмі цяжкімі. Часам дасягалі 16 кілаграмаў — дзяўчатам не па сілах.

Валянціна Паўлаўна прачытала мне оду Роберта Раждзественскага «Балада аб зенітчыцы». Менавіта знаёмства з франтавічкай натхніла яго на гэты твор. Перачытваючы невядома які раз ужо знаёмыя ёй радкі, жанчына расплакалася. «Не трэба ўсё ж такі мне больш прымаць журналістаў, прабачце. Цяжка ўспамінаць. Сэрца…»

Мы перайшлі на іншую тэму. Ужо абмяркоўвалі мірнае жыццё. Але за размовай, самі таго не заўважыўшы, зноў вярнуліся да таго, з чаго пачалі.

— У тую ноч я была начальнікам каравулу батарэі. Мы прыкрывалі артсклад: тысячы, тысячы снарадаў! А Калінінскі фронт, між іншым, — плячо Масквы. Упала б хоць адна бомба, цяжка ўявіць, што магло б быць. У нас — загад: трымаць абарону, чаго б гэта ні каштавала. У маім разліку была Саша Ступнікава. Прыгожая такая, ёй толькі споўнілася 19. Яе бацька, як і мой, лёг пад Масквой… Бачу, яна строчыць ліст і просіць: «Сяржант, ты мяне крыху раней змяні, я дапішу». Я паабяцала, але слова сваё не стрымала…

На артсклад наляцелі 14 нямецкіх самалётаў. Цяжка загружаныя, ажно зямля дрыжала. Відаць, разведка данесла, што тут за сховішча.

— Ніхто нават размовы не вёў, каб збіць іх. Хаця б не дапусціць пажару! Для нас галоўным было «загарадзіць» артсклад. Вялі загараджальны агонь, у выніку немцы зніклі: хацелі, напэўна, жыць, гады. А потым такая цішыня наступіла… А на фронце калі цішыня — дык ажно мурашкі па целе: значыць, чакай бяды. Я запаўзла ў зямлянку, а з носу, з вушэй кроў ідзе… Раптам дальнамернічыкі крычаць: «Паветра!» А там — лёгкі нямецкі бамбардзіроўшчык. І пасыпалася з яго нешта кшталту запальнічак. І адна ўпала каля Сашы. Мне потым дзяўчаты сказалі, што яна гарэла, як факел. Каб запальнічка не выбухнула, Саша прытуліла яе да сябе і пабегла далей ад скрыняў са снарадамі…

Аляксандра Ступнікава засталася жывая. Камандзір дывізіі прывёз яе ў полк толькі праз год. Яе ніхто не пазнаў: вельмі моцна абгарэла. Пасля вайны не пазнала і маці. На шчасце, выратавала радзімая пляма пад лапаткай.

На шчасце, да родных «пашпарт смерці» не дайшоў. Але сумную вестку яны ўсё ж такі атрымалі: застанецца калекай. Камандзір гарматы, пакуль ляжала ў снезе, вельмі абмарозілася.

«ПАШПАРТ СМЕРЦІ» ВЫРАТАВАЎ ЖЫЦЦЁ

— Нас, Веранічка, успомнілі толькі на 25-годдзе Перамогі, — з болем у голасе гаворыць Валянціна Паўлаўна. — Дагэтуль франтавічак ніхто не лічыў за ўдзельнікаў вайны. Мы не насілі ні ордэнаў, ні медалёў. Саромеліся. Многія думалі, што дзяўчаты на фронце толькі салдат задавальнялі. А мы, між іншым, не менш, чым яны ваявалі, не менш нацярпеліся…

Памятаю, на Ржэўскім кірунку моцныя баі былі. Мяне адкінула, і я адляцела на мінае поле — у варонку з-пад бомбы. Маю шапку-вушанку і выцягнуў з-пад снегу санітарны сабака, якога адправілі на пошукі. Чыя шапка, у палку разабраліся хутка. Дапамагла паперка, укладзеная ў падкладку.

— Мы яе называлі «пашпартам смерці», — успамінае жанчына. — Гэта цяпер яны — медальёны. Там быў напісаны адрас, куды на выпадак смерці пахаванку дасылаць. У нас іх было дзве: другая ляжала ў невялічкай кішэні ў штанах. Чаму дзве? Таму што мы, зенітчыкі, звычайна гінулі ад ранення ў галаву: мелі справу з небам. Вось і падстраховаўваліся.

На шчасце, да родных «пашпарт смерці» не дайшоў. Але сумную вестку ўсё ж такі атрымалі: застанецца калекай. Камандзір гарматы, пакуль ляжала ў снезе, вельмі абмарозілася.

— Мае ногі ўвесь час былі мокрымі. Зайду, бывае, у зямлянку, гляджу, дзяўчаты сушаць валёнкі, анучы. Як жа я магла іх адагнаць ад гэтай цяплушкі? Што я тады за камандзір?!

З-за гэтай сваёй далікатнасці той камандзір мог застацца без ног. Паўгода Валянціна Чудаева праляжала ў шпіталі ў Яраслаўлі. Пачалася гангрэна. А ёй — усяго 19. Вырашылі ампутаваць ногі, іначай не жыць дзяўчыне. Ужо рыхтавалі да аперацыі. На адмене настаяў палатны ўрач, які быў да прыгожай сібірачкі неабыякавы. Ён вычытаў, як можна выратаваць ногі, і пераканаў у гэтым урачоў. Ніхто не верыў, але ўвядзенне пад скуру кісларoду ўсё ж такі дапамагло. І Валянціна Паўлаўна пачала хадзіць. Толькі дома яе ніхто не чакаў…

Мачаха даслала на палявую пошту грошы. Маўляў, мне калека не патрэбна. Рабіце, што хочаце… Выпадковасць ці не: праз некаторы час на вытворчасці мачысе адрэзала пальцы рукі. Напэўна, той самай, якой адпраўляла грошы…

ВЫЗВАЛЕННЕ СА СМАКАМ ЦУКРУ

Заставалася адна дарога — на фронт. Вызвалялі Беларусь.

— Калі мы ўвайшлі ў Мінск, гэта быў не горад, а пажарышча, — успамінае Валянціна Паўлаўна. — Нас, зенітчыкаў, кінулі прыкрываць танкі. А самалёты над Мінскам ляталі чорнай хмарай. Стаяла задача — даць «акно» небу і зямлі. І танкі праваліся! Сталіца была вызвалена, была вызвалена Беларусь!

Паступіў загад — цягнуць гарматы на ўскраіну горада і чакаць. А там хаткі, урослыя ў зямлю. Каля адной з іх стаяла жанчына. «Мы чакалі салдацікаў», — расчаравана сустракала яна нас. А потым і кажа: «Я тут пачастунак падрыхтавала». І з-за пазухі дастае брудную анучку, а там — дробны кавалачак цукру. «Падсаладзіся, начальнік», — і працягвае мне.

А ў дзяўчат-зенітчыц у галаве іншае. Убачылі чыгун у дварэ, увесь у сажы. Побач — цагліны. Значыць, можна ваду падагрэць і… памыцца!

Кажу ёй: «Не трэба мне, цётачка, цукар. Лепш для дзетак сваіх пакіньце». А яна ў адказ: «Якія дзеткі? Мне ж толькі 22 гады». А перада мной стаяла старая — знямоглая, сівая…

Дзяўчаты ў гэтай жанчыны ўсе вымыліся, свае кашулі памылі. За гэта ёй далі кавалак мыла — тое, што мелі. Як жа яна ўдзячна была!..

ЗНОЎ ВЯРНУЛАСЯ Ў МІНСК...

Пасля вайны Валянціна Чудаева паехала ў Новасібірск. Толькі дома яе ніхто не чакаў. Некаторы час жыла ў цёткі. А ў 1946 годзе выйшла замуж. З мужам-вайскоўцам паехала ў Вільнюс, дзе працавала ў ЦК камсамола.

Побыт наладзіўся не адразу. У аднапакаёвай кватэры, што ім далі, было пуста. Елі на падаконніку, спалі на шынялях. Добра, што хоць было па два кацялкі і па дзве лыжкі.

— Аднойчы муж дамоў прыходзіць вясёлы-вясёлы, — узгадвае жанчына. — Кажа, што ў штабе вісіць вялікая палітычная карта свету. Маўляў, адмыеш — добрая прасціна атрымаецца! На наступны дзень прынёс. Спатрэбілася. Пасля гэтая карта пайшла на пялёнкі дачушцы. А адной ноччу з разбомбленай хаты прынеслі старую канапу. Пазней я ў дварэ прыкмеціла скрыню з фанеры. Неяк прыцягнула, абматала анучамі — атрымаўся столік. Вось з чаго мы пачыналі. Але якімі мы былі шчаслівымі!

У 1950 годзе мужа перавялі ў Мінск. Яна зноў вярнулася сюды, як у 1944-м. І засталася назаўсёды.

— Працавала ў абкаме камсамола, а пасля работы — на мінскіх вуліцах: на аднаўленні горада, — успамінае Валянціна Паўлаўна. — Кожнаму патрэбна было адпрацаваць па 100 гадзін. Франтавікі, падпольшчыкі, партызаны, усё насельніцтва горада, здавалася, увесь Савецкі Саюз адраджаў Мінск.

І яна, інвалід на мыліцах разбірала завалы. Станавілася на калені і падавала іншым камяні, жалеза… Дапамагала садзіць ліпы ў парку, што недалёка ад цырка растуць і сёння. А ўвечары, пасля працоўнага дня, насіла палонным немцам хлеб. Шкадавала. Ведала, што многія з іх ваявалі не па сваёй волі.

У абкаме доўга не пратрымалася: вайна нагадала аб сабе. У адной з камандзіровак застудзіла ногі так, што яны адняліся. Урачы на ногі паставілі, толькі працу трэба было мяняць. Уладкавалася ў Політэхнічны інстытут, дзе і адпрацавала 30 гадоў.

З мужам пражылі 46 гадоў. Нарадзілі дачушку Наташу, дачакаліся ўнукаў Андрэя і Паўла. А Валянціна Паўлаўна — яшчэ і праўнучку Маргарыту.

…На развітанне яна пытае: «Ну, як я табе, Веранічка? Як маё мысленне?» І тут жа адказвае: «Гэта ўсё гены, а яшчэ вельмі шмат чытала і вельмі шмат перажыла». Сыходжу з пачуццём поўнага задавальнення ад знаёмства з гэтай цудоўнай жанчынай. А на душы — адчуванне, што яшчэ сустрэнемся. Магчыма, і неаднойчы.

Вераніка КАНЮТА.
Фота аўтара.

■ Праз гады

ВЯРТАННЕ Ў ЗЕЛЯНІЦУ...

Расповед у «Звяздзе» ад 6.06.2014 г. «Мы жылі ў неймаверным страху» глыбока ўзрушыў мяне, чалавека, які сваё першае баявое хрышчэнне прыняў у 16 гадоў. Бачу, нібы наяве, дзяўчынку з малым дзіцем на руках, якая разам з іншымі жыхарамі вёскі Зеляніца Кіраўскага раёна хаваецца ад фашысцкіх карнікаў...

Вёска Зеляніца запала ў маю душу як сімвал нялёгкага партызанскага жыцця. Для нашага атрада № 259 8-й Рагачоўскай партызанскай брыгады Зеляніца была апошнім прытулкам перад паходамі ў прыфрантавую зону ў Рагачоўскім раёне.

Першае знаёмства з Зеляніцай адбылося ў канцы лістапада 1943 года. Наша брыгада з набліжэннем фронту да Рагачова перапраўлялася ў партызанскую зону Клічаўскага раёна. Гэты пераход быў адным з самых цяжкіх. У цемру і непагадзь па ўскрайку дрыгвы 2000 партызан з абозамі павінны былі перайсці шашу Магілёў — Бабруйск, якая ахоўвалася немцамі. У час руху з аднаго бункера пачуліся стрэлы. Але наша баявая ахова іх падавіла, і да поўначы мы выйшлі да бліжэйшых вёсак. Для кароткага адпачынку нам «дасталася» Зеляніца.

Перад намі была не вёска, а папялішча, на якім дзе-нідзе праглядаліся невялікія зямлянкі. У адной з іх, што прытулілася да ўскрайку лесу, і размясціўся наш узвод. На печцы сядзела гаспадыня пажылога ўзросту, а на прыпечку гарэла лучына. На падлозе ўсе палеглі ўпокат і заснулі.

Ноччу высветлілася, што партызан, які патруляваў вёску, пакінуў свой пост і лёг адпачываць у зямлянцы. Па загадзе камандзіра атрада раніцай пастроеныя ў калону партызаны абралі трыбунал, які пасля разбору справы вынес прысуд — расстраляць! Прысуд усе ўхвалілі, і парушальнік партызанскай прысягі на ўскрайку вёскі быў пакараны.

...Праз месяц наша брыгада размясцілася ў зямлянках ва Усакінскім лесе, непадалёк ад спаленай разам з жыхарамі вёскі Усакіна. Мы добра ведалі пра ўсё, пра што распавядала на старонках «Звязды» Зінаіда Авяр'янаўна Комбар: і пра лёс мясцовых жыхароў, і пра тое, што Клічаў знаходзіўся пад уладай партызан брыгады Ісоха, і пра аэрадром сярод Усакінскага лесу, адкуль на самалётах адпраўлялі за лінію фронту дзетак і параненых партызан.

Галоўнай справай нашай брыгады былі баявыя дзеянні на Рагачоўшчыне, хаця ваявалі таксама і на Кіраўшчыне. Нашаму ўзводу пашчасціла пабываць у Зеляніцы больш за 10 разоў, робячы рэйды пад Рагачоў. Аднойчы ўзвод зрабіў засаду на немцаў ля вёскі Крушынаўка і забіў 9 фрыцаў. Падчас іншых паходаў мы ставілі міны, праводзілі разведку. Да паходу і пасля выканання баявога задання кожны раз заходзілі ў тую самую, прытуленую да ўскрайку лесу зямлянку. Есці ў гаспадыні мы не прасілі, бо ведалі, што ў вёсцы нічога няма, ды і самім не было чым аддзячыць. (Толькі аднойчы, сабраўшы ў лесе мёду ад калоды са спілаванай сасны, мы самі паласаваліся і далі пакаштаваць гэтай жанчыне.)

Не пакідае мяне ўспамін пра яшчэ адзін вельмі цяжкі паход, які скончыўся ў той самай Зеляніцы.

У другой палове лютага 1944 года наша брыгада спрабавала прабіцца да сваіх праз калідор, які «адкрыўся» ў Быхаўскім раёне падчас баёў за вызваленне Рагачова. Па засыпаным снегам бездарожжы, пасля пераходу ў 70 км, брыгада на досвітку падышла да лініі фронту. Блізка чуліся выбухі і кулямётныя стрэлы. Сталі чакаць цемры. Вогнішчаў не палілі. Есці нічога, акрамя кавалачка сырой мерзлай каніны, не было.

Але «калідор» быў немцамі закрыты, а нашу разведку заўважылі. Прыйшлося хутка, не затрымліваючыся, бегчы назад. Неяк дабраліся да шашы, але сілы пакідалі людзей. Пад соснамі трапляліся па 3-5 партызан, якія спалі. Нашаму атраду — ён ішоў апошнім — даводзілася будзіць спячых, каб не змерзлі... Сабраўся ж атрад зноў у Зеляніцы.

Да канца вясны баявыя дзеянні атрада і ўсёй брыгады ладзіліся ля шашы Магілёў — Бабруйск і ля гарнізона немцаў у Кіраўску (мініраванне, засады). «На развітанне» мне з двума паплечнікамі (Санька Шаўцоў і Іван Паштароў) пашчасціла выканаць няпростую ролю. У апошнюю дэкаду мая 1944 г. камандзір брыгады даручыў нам правесці ў раёне рэчкі Друць ля мяжы Кіраўскага і Рагачоўскага раёнаў разведку, каб высветліць, дзе немцы ладзяць пераправы, дзе стаяць па вёсках гарнізоны, батарэі. Нам выдалі па дзве гранаты («эфкі»), трохі хлебных сухароў, і мы адправіліся ў паход. З дапамогай мясцовых жыхароў і сялянскіх хлопчыкаў выявілі адну пераправу цераз Друць і два нямецкія гарнізоны. Мы і не здагадваліся, што разведка гэта была патрэбна перад пачаткам аперацыі «Багацён».

І вось апошняя сустрэча з Зеляніцай. 22 чэрвеня 1944 г. Ноччу армады нашых самалётаў паляцелі ў бок Асіповічаў і Мінска. Пачуліся моцныя выбухі. Праз пару дзён наша разведка сустрэлася з савецкімі разведчыкамі, а на наступны дзень 8-я Рагачоўская партызанская брыгада рушыла ў бок шашы Магілёў — Бабруйск, каб перакрыць адыход немцаў з Магілёва. Але Чырвоная Армія нас апярэдзіла, і 26 чэрвеня ля той самай Зеляніцы мы злучыліся з нашымі. Так скончылася партызанская эпапея.

На ўскрайку лесу брыгада была расфарміравана. З 900 партызан сфарміравалі запасны армейскі батальён. Нас направілі пешшу даганяць сваю часць у бок Мінска...

Пасля парада партызан 16 ліпеня нас расфарміравалі. У кожнага лёс склаўся па-свойму.

...Праз некалькі гадоў у складзе следчай групы я займаўся раскрыццём забойства дзяўчыны ля шашы Магілёў — Бабруйск, якраз насупраць Зеляніцы. Ну як не схадзіць і не паглядзець на такую блізкую вёску? Пешшу я пакрочыў у Зеляніцу. На развілцы дарог стаяў той самы драўляны крыж з абярэгам. Перад вачыма з'явілася невялікая вёска, забудаваная ладнымі новымі хатамі. Пахадзіў па хатах, пагаварыў з мужыкамі. На пытанне — ці памятаюць яны рагачоўскіх партызан — мне адказалі, што праз вёску праходзіла многа партызан і ніхто не пытаў, адкуль яны... Але пра тых, што «асудзілі і расстралялі свайго», мужчыны не толькі памяталі, але і ўнукам расказвалі...

...І вось не так даўно прачытаў у «Звяздзе», што Зеляніца абязлюдзела. Маладыя паразʼязджаліся, а старыя адыходзяць... Вельмі шкада — і людзей, і вёску, і памяць аб ёй...

Леанід КАЛІНКОВІЧ,
былы партызан 8-й Рагачоўскай партызанскай брыгады

■ Май на ўвазе

НА СВЯТЫ ТРАНСПАРТ ПРАЦУЕ ДА ТРОХ НОЧЫ

У сувязі з правядзеннем святочных мерапрыемстваў, прымеркаваных да 70-й гадавіны вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь, у рабоце сталічнага гарадскога транспарту чакаюцца змены.

Як паведамілі ў дзяржаўным прадпрыемстве «Мінскстранс», падчас правядзення святочных мерапрыемстваў, прысвечаных Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь, будзе павялічана колькасць рухомага саставу: на аўтобусным маршруце №1 3 ліпеня ў перыяд з 11 да 17 гадзін, 4-5 ліпеня — з 10 да 20 гадзін; на аўтобусным маршруце № 100 3 ліпеня ў перыяд з 11 да 1.00, 4-5 ліпеня — з 10 да 20 гадзін.

У перыяд з 21 гадзіны да заканчэння мерапрыемства (прыкладна да 23.20) 3 ліпеня, калі будуць ускладацца вянкі да манумента Перамогі, зменяцца трасы наступных маршрутаў: №№ 100, 115Э, 300Э, 18, 26, 57, 1, 69. Для цягнікоў першай лініі метрапалітэна прыкладна з 22.20 да 23.20 выключаецца пасадка/высадка пасажыраў на станцыі «Плошча Перамогі».

З ліпеня (прыкладна да 0.30 4 ліпеня) у сувязі з правядзеннем парада войскаў і тэатралізаванага шэсця «Беларусь — ад вызвалення да незалежнасці», а таксама гала-канцэрта каля абеліска «Мінск — горад-герой» будуць зменены трасы аўтобусных маршрутаў №№ 1, 69, 73, 91, 119Э, 163, 29, 44, 136. Трамвайны рух у напрамку ДС «Возера» адмяняецца з адна-

часовай арганізацыяй часовага аўтобуснага маршруту № 903 «ДС «Возера» — З. Бядулі» (да 3.00 4 ліпеня).

У перыяд з 16.00 і да заканчэння парада (прыкладна да 22.50) змяняюцца трасы аўтобусных маршрутаў №№ 18, 26, 19, а тралейбусны № 22 адмяняецца. Затое з 0.00 да 3.00 4-5 ліпеня будзе арганізавана работа наступных маршрутаў: аўтобусных №№ 1, 9Д, 18, 42, 43, 57, 73, 100, 112С, 113С, 147, 149, 153Д, 159, 921; тралейбусных №№ 3, 6, 20, 25, 26, 27, 53, 60. Дадаткова ў перыяд з 0.00 да 3.00 4 ліпеня будзе арганізавана работа аўтобуснага маршруту № 903 і трамвайных №№ 1, 6; у перыяд з 0.00 да 3.00 5 ліпеня — работа трамвайных маршрутаў №№ 1, 3.

3-4 ліпеня работа першай і другой ліній метрапалітэна будзе доўжыцца да 3 гадзін ночы. Апошнія адпраўленні цягнікоў з канцавых станцый па абедзвюх лініях будуць прадугледжаны ў 2.50, закрыццё станцый «Няміга», «Кастрычніцкая», «Купалаўская» для ўваходу пасажыраў — у 3.00.

Сяргей РАСОЛЬКА

Дзень вызвалення Беларусі — у ЗША

На амерыканскім кантыненце таксама прайшлі мерапрыемствы, звязаныя з 70-годдзем вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На ўрачыстым сходзе ў Нью-Ёрку прысутнічала больш за 100 ветэранаў. Перад прысутнымі выступіў і пасланец Мінска — калекцыянер старых паштовак, лаўрэат Прэміі Прэзідэнта «За духоўнае адраджэнне» Уладзімір Ліхадзедаў. Ён расказаў і пра тое, як ушаноўваецца гераіка-патрыятычная тэма ў беларускіх масмедыя, найперш у газетах «СБ. Беларусь сегодня» і «Звязда», прэзентаваў свае філакартычныя альбомы серыі «У пошуках страчанага». А ў Балтымары беларускае пасольства сумесна з Балтымарскай асацыяцыяй ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны правялі ўручэнне юбілейных медалёў і памятных «трохкутнікаў». Сярод 14 узнагароджаных удзельнікаў вайны двое ўжо пераступілі 100-гадовы рубеж. На сустрэчы былі і перажыванні, і слёзы, з якімі беларускія эмігранты глядзелі фільм «Партызаны супраць Вермахта: вызваленне Беларусі», знаёміліся з фотавыставай БелТА, прысвечанай 70-годдзю вызвалення нашай Айчыны ад фашыстаў.

Сяргей ШЫЧКО.

ТРЫ «ЗВЯЗДЫ»

МЕНАВІТА ПАДПОЛЬНАЯ «ЗВЯЗДА» ЎНЕСЛА ВАЖКІ ЎКЛАД У ЗНЯЦЦЕ «ЯРЛЫКОЎ» З МІНСКІХ ПАДПОЛЬШЧЫКАЎ

Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны, лёс насельніцтва, што пражывала на яе тэрыторыі ў той час, — тэмы, якім айчынныя і замежныя гісторыкі прысвяцілі сотні розных прац. Але мала месца ў іх адводзіцца ролі беларускага друку ў барацьбе з ворагам. Дзеля ліквідацыі прабелу хачу звярнуцца да гісторыі старэйшай у рэспубліцы газеты.

Па-першае, «Звязда» ў час вайны выдавалася ў Мінску — як орган Мінскага падпольнага гаркама КП(б)Б. Па-другое, на Палессі — як орган Мінскага абкама. А была яшчэ газета «Минский большевик» — орган Мінскага падпольнага гаркама, які з восені 1943 г. дзейнічаў у партызанскай зоне. Яна з'яўлялася (як лічыць яе рэдактар Аляксандр Сакевіч) прамой пераемніцай «Звязды».

«Рэканструкцыя» гісторыі акупаванага немцамі Мінска пачалася яшчэ ў час вайны. Дзейнасць падпольшчыкаў не была простай. Акупанты ў другой палове 1942 г. звярнуліся да распаўсюджвання правакацыйных чутак аб кіраўніках падполля. Так яны хацелі адарваць гарадскі падпольны цэнтр (Іван Кавалёў, Дзмітрый Караткевіч, Вячаслаў Нікіфараваў, Канстанцін Хмялеўскі) не толькі ад жыхароў Мінска, але і ад партызан. У гэтых умовах і зарадзіўся так званы абвінаваўчы ўхіл Вялікай зямлі ў дачыненні да Мінскага падпольнага гаркама КП(б)Б і яго кіраўніка Івана Кавалёва. У дачыненні да Кавалёва ён праіснаваў аж да 1990 г.

У цэлым жа ў Беларусі, часова занятай германцамі, выходзіла 157 падпольных газет. З іх рэспубліканскіх — толькі дзве: «Звязда» і «Чырвоная змена».

Актыўны ўдзел у вывучэнні гісторыі падпольнага Мінска прынялі камісіі па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, ідэалагічныя аддзелы ЦК КП(б)Б, Цэнтральны і Беларускі штабы партызанскага руху, органы НКУС. У 1965 г. адбылося другое масавае ўзнагароджанне былых партызан і падпольшчыкаў «за мужнасць і адвагу ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у перыяд Вялікай Айчыннай вайны». Узнагароды атрымалі 3269 ураджэнцаў Беларусі, 2902 — Украіны, 1637 — РСФСР, 1162 — Літвы, 73 — Малдавіі, 91 — Латвіі, 6 — Эстоніі. Сама газета была ўзнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Пры ўручэнні ордэна палітычны кіраўнік Беларусі Пётр Машэраў, у прыватнасці, сказаў: «Звязда» заняла пачэснае месца ў радах народа-змагара… Ад рук ворага загінуў першы рэдактар падпольнай «Звязды» Герой Савецкага Саюза Уладзімір Сцяпанавіч Амельянюк. У лютым 1944 г. на баявым пасту загінуў рэдактар газеты, палымяны савецкі патрыёт Міхаіл Парфёнавіч Барашкаў. Пры выкананні баявога задання забіта варожай куляй літаратурная супрацоўніца Зінаіда Завістовіч. Трагічна загінула сям'я наборшчыцы газеты Ніны Палонскай».

Прымалі ўдзел у выданні мінскай падпольнай «Звязды» і былі ўзнагароджаны: С. А. Благаразумаў (ордэн Айчыннай вайны I ст.), М. М. Воранаў (друкар 1-га нумара «Звязды», ордэн Айчыннай вайны II ст.), М. П. Воранаў (ордэн Айчыннай вайны II ст.), У. С. Казачонак (літаратурны рэдактар, адзін з асноўных аўтараў лістоўкі «Да насельніцтва Беларусі»), В. К. Нікіфараў (ордэн Айчыннай вайны I ст.), М. П. Рынкевіч (ордэн Айчыннай вайны II ст.), Я. М. Савіцкая (ордэн Чырвонага Сцяга), Г. Г. Фалевіч (ордэн Айчыннай вайны I ст.) і іншыя.

З-за няпоўнай ліквідацыі абвінаваўчага ўхілу засталіся без узнагарод (і не ўзнагароджаны да гэтага часу): Х. М. Александровіч (ім набраны і надрукаваны 2-і, 3-і і 4-ы нумары «Звязды»), А. А. Карпусенка (удзельнічала ў падрыхтоўцы 2–5 нумароў газеты), А. Я. Платайціс (адзін з арганізатараў выдання «Звязды»), Б. Пупко, М. Свірыдаў (наборшчыкі), К. П. Фалдзіна (прымала ўдзел у друкаванні «Звязды»), А. Я. Цітовіч (літработнік).

Ідэя неабходнасці арганізацыі і выдання ў глыбокім тыле ворага шырокавядомых беларускіх газет з багатай біяграфіяй нараджалася і абапіралася на запатрабаванасць з месцаў. «Лістоўкі, газеты, брашуры нам патрэбны як паветра», — пісаў Кірыл Мазураў у Маскву з тэрыторыі Мінскага партызанскага злучэння. Духоўнай асновай і адначасова штуршком да ваеннага адраджэння «Звязды» і «Чырвонай змены», часова прыпыненых у жніўні 1941 г., стала распаўсюджванне лозунгаў: «Не трэба баяцца партызанскага і падпольнага руху» (бо быў перыяд, калі Берыя аддаваў перавагу толькі арганізаванаму «зверху» партызанскаму руху), «Выданне даваенных аўтарытэтных газет можна аднавіць і на захопленай ворагам тэрыторыі».

Амаль у той жа час Цэнтральны і Беларускі штабы партызанскага руху, НКУС СССР, Наркамат абароны СССР аб'явілі конкурс на вынаходцтва партатыўнай друкарскай машыны. Яго пераможцам стаў грамадзянін БССР, механік фабрыкі «Палесдрук» Ф. М. Пільцыненка. Ужо летам 1943 г. у Беларусь было напраўлена больш за 160 доўгачаканых друкарскіх машын.

Ідэя стварэння падпольнай «Звязды» зыходзіла ад кіруючых органаў Вялікай зямлі. З матэрыялаў справаздач Мінскага гарадскога падпольнага цэнтра вынікае, што ў праграму дзейнасці падпольшчыкаў ужо на першым этапе іх існавання ўваходзіла ў якасці адной з цэнтральных задач «арганізацыя падпольнай друкарні на базе матэрыялаў былых раённых друкарань». Усе варыянты «Звязды» так і ўтвараліся. Але нельга лічыць выхад «Звязды» толькі выкананнем спушчанага «зверху» плана. Яе з'яўленне — вынік канцэнтрацыі ў адным месцы мужных і таленавітых людзей. Выхад падпольнай газеты, па вырозе немцаў, выклікаў уражанне бомбы, якая ўзарвалася.

Аб асаблівасцях выдання «Звязды» ў Мінску ў чэрвені — верасні 1942 г. апавядае ў лісце ў ЦК КП(б)Б Уладзімір Казачонак (1944 г.): «Калі друкарня перайшла ў мае рукі, я і Александровіч зрабілі яе вельмі простай і зручнай для выкарыстання. Жонкай т. Александровіча было пашыта больш за 200 маленькіх мяшочкаў, і ў кожным такім мяшочку змяшчаўся адзін друкарскі знак. Схему касы начарцілі на паперы. У адпаведнасці з гэтай схемай мяшочкі раскладаліся на стале, і своеасаблівая каса была падрыхтавана для набору. Было вельмі зручна ў выпадку небяспекі пераносіць друкарню з аднаго месца ў другое. На ўсякі выпадак у нас заўсёды, акрамя шрыфтоў, было некалькі гранат Ф-1 і пісталет ТТ. Тыраж газеты і лістовак у сярэднім складаў 4,5–5 тысяч экзэмпляраў, на што патрабаваліся не менш за 2–3 сутак бесперапыннай працы».

У цэлым жа ў Беларусі, часова занятай германцамі, выходзіла 157 падпольных газет. З іх рэспубліканскіх — толькі дзве: «Звязда» і «Чырвоная змена». У гэтым бачыцца, акрамя ўсяго іншага, значэнне беларускай мовы ў ідэалагічнай барацьбе супраць захопнікаў. Газеты «Савецкая Беларусь», «За Савецкую Беларусь», «За свабодную Беларусь», часопіс «Беларусь», сатырычныя выданні «Раздавім фашысцкую гадзіну», «Партызанская дубінка» засылаліся ў тыл ворага.

…Зімой 1943 г. самалётам прыбылі на Любаншчыну будучы рэдактар партызанскай «Звязды» і «Чырвонай змены» Міхаіл Барашкаў і суправаджаючы яго сакратар ЦК ЛКСМБ Міхаіл Зімянін. З боку ЦК КП(б)Б Міхаіла Барашкава курыраваў сакратар ЦК Мікалай Аўхімовіч, але ён перанёс свой палёт на жнівень 1943 г. На востраў Зыслаў, дзе размяшчаўся аэрадром, былі дастаўлены друкарская машына, наборныя касы са шрыфтамі, фарба, папера. Разам з Барашкавым у рэдакцыю партызанскай «Звязды» ўваходзілі былы рэдактар Любанскай раённай газеты Піліп Касцюкавец і былы супрацоўнік газеты «Советская Белоруссия» Георгій Шчарбатаў. У друкарні працавалі Амяльян Шурпач, Мікалай Курыка і Ніна Цылько. Роля галоўнага друкара газеты належала Шурпачу. Хто адраджаў «Звязду», той ствараў і маладзёжную «Чырвоную змену».

Ідэя неабходнасці арганізацыі і выдання ў глыбокім тыле ворага шырокавядомых беларускіх газет з багатай біяграфіяй нараджалася і абапіралася на запатрабаванасць з месцаў.

Імя Міхаіла Барашкава ўпрыгожвае не толькі гісторыю журналістыкі, але і гісторыю краіны. Ён быў заўсёды жаданым удзельнікам партызанскіх нарад, на якіх абмяркоўваліся важныя баявыя аперацыі. Многія ўспамінаюць праведзеныя Барашкавым дваццацікіламетровыя пераходы праз густыя лясы, незнаёмыя багны, пасля чаго работнікі газет спалі, а Міхаіл Парфёнавіч заставаўся нядрэмным, вартуючы спакой сваіх таварышаў. Ён вучыў падначальных не толькі журналістыцы, але і ўменню пераадольваць багну, адшукваць брод на рэчках. Усё гэта сустракала ўзаемаразуменне і станоўча ацэньвалася… Памёр Міхаіл Парфёнавіч 21 лютага 1944 г., але не ад цяжкай хваробы, як многія думалі. Партызанскі доктар сказаў праўду: М. П. Барашкаў развітаўся з жыццём не ад тыфу, а ад раны, атрыманай ім пад Віцебскам яшчэ ў самым пачатку вайны.

Скупымі звесткамі характарызуюцца ў літаратуры жыццё і дзейнасць рэдактара «Чырвонай змены» Івана Матыля. На гэту пасаду ён быў зацверджаны ў сакавіку 1944 г., адразу пасля смерці Міхаіла Барашкава. Іван Аляксандравіч нарадзіўся 18 верасня 1914 г. у вёсцы Дуброўскія Коханаўскага раёна Віцебскай вобласці, у сялянскай сям'і. Закончыў двухгадовае Аршанскае педвучылішча. З 1932 г. — у журналістыцы. У 1941 г. атрымаў дыплом выпускніка Мінскага інстытута журналістыкі. Вось што сказаў пра Івана Матыля Міхаіл Зімянін: «Па рашэнні ЦК ЛКСМ Беларусі ў 1942 г. тав. Матыль І. А. быў накіраваны ў тыл праціўніка. За кіраўніцтва абласной (Магілёўскай. — **Аўт.**) падпольнай камсамольскай арганізацыяй узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі «Партызану Айчыннай вайны», «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне. 1941–1945 гг.» Тав. Матыль правёў вялікую работу па стварэнні аўтарскага калектыву, па выхаванні рэдакцыйных кадраў». Іван Матыль, якому восенню гэтага года споўнілася б 100 гадоў, працягваў нейкі час узначальваць «Чырвонку» і ў пасляваенныя гады.

Уладзімір АМЕЛЬЯНЮК.

Міхаіл БАРАШКАЎ.

Іван МАТЫЛЬ.

73 гады таму, 22 чэрвеня 1941 г., «Чырвоная змена» змясціла даныя аб 3000 выпускнікоў 20 вышэйшых навучальных устаноў Беларусі. Сярод тых, хто атрымаў дыпломы, — 211 матэматыкаў, фізікаў, гісторыкаў, географаў, біёлагаў, 1400 настаўнікаў, 560 урачоў, 300 інжынераў-механікаў, гідратэхнікаў, хімікаў-прадзільшчыкаў, 88 планавікоў-эканамістаў, 69 юрыстаў, 300 спецыялістаў з Горацкага сельскагаспадарчага, Гомельскага лесатэхнічнага, Віцебскага ветэрынарнага інстытутаў. Амаль 60 працэнтаў выпускнікоў — прадстаўнікі мужчынскага полу. Зробленае газетай можна выкарыстаць для вывучэння лёсу юнакоў і дзяўчат так званага «вогненнага выпуску». Першую такую работу выдалі выкладчыкі юрыдычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

«Звязду» ж у 1944 годзе ўзначаліў таленавіты чалавек, Васіль Самуцін. (Перад ім некаторы час абавязкі галоўнага рэдактара выконваў адказны сакратар газеты Георгій Шчарбатаў.) Культурныя дзеячы Беларусі 1920–1930-х гадоў крытычна ўспамінаюць Васіля Самуціна за яго развод з жонкай па той прычыне, што яна была дачкою нацдэма, арыштаванага ў 1930 г. У 1944 годзе, будучы кіраўніком партызанскага руху ў заходніх раёнах Беларусі, ён адмоўна аднёсся да ідэі перагляду межаў з Польшчай на шкоду Беларускай ССР. Лічыў, што весці такія перагаворы напярэдадні Беларускай наступальнай аперацыі «Багацён» не патрыятычна.

«Звязда» аб'ядноўвала антыфашысцкі падпольны рух амаль на ўсёй тэрыторыі Беларусі. У Мінску ёй дапамагала газета «Минский большевик». Пабываўшы ў Беларусі, сакратар ЦК КП(б)Б Мікалай Аўхімовіч у кастрычніку 1943 г. паведаміў Панцеляймону Панамарэнку: «Знаходзячыся ў Палессі, я разам з тав. Казловым (Васілём. — **Аўт.**) наведаў друкарню газет «Звязда» і «Чырвоная змена», гутарыў з працаўнікамі друкарні… Тав. Барашкаву, які рэдагуе дзве газеты, неабходна прысласць 1–2 газетных працаўнікоў для «Звязды» і рэдактара для «Чырвонай змены», бо аднаму рэдагаваць дзве газеты не пад сілу». Просьбы Аўхімовіча Масква не задаволіла. Кадравыя пытанні «Звязды» і «Чырвонай змены», «Минского большевика» вырашыліся за кошт мясцовых газетных працаўнікоў.

Менавіта мінская падпольная «Звязда» ўнесла важкі ўклад у зняцце «ярлыкоў» з гісторыі першага перыяду дзейнасці мінскіх падпольшчыкаў. Адбылося гэта 7 верасня 1959 г. на гістарычным пасяджэнні бюро ЦК КПБ, прысвечаным некаторым актуальным пытанням гісторыі Мінскага партыйнага падполля. Прамова першага сакратара ЦК Кірыла Мазурава, які расказваў аб ролі «Звязды» ў вырашэнні праблем антыфашысцкага супраціўлення, выклікала ў зале моцныя і шчырыя апладысменты. Так у той дзень з дапамогай «Звязды» быў поўнасцю ачышчаны ад наносная і сфальсіфікаванага і яе палітычны стваральнік — Мінскі ГК КП(б)Б, арганізаваны ў верасні-кастрычніку 1941 г.

…5 мая 1975 года… Вёска Дварэц, што на самым поўдні Любанскага раёна Мінскай вобласці. За восем кіламетраў ад яе знаходзіцца востраў Зыслаў. І вось наступае тое, дзеля чаго прыехалі дзясяткі былых партызан і падпольшчыкаў. Спадае пакрывала са сцяны новага дома, і прысутныя бачаць на металічнай дошцы словы: «Тут у студзені 1943 г. аднавілі ў падполлі выхад газеты «Звязда» — орган ЦК і Мінскага абкома КП(б) Б і «Чырвоная змена» — орган ЦК і Мінскага абкома ЛКСМБ».

Яўген БАРАНОЎСКІ,
кандыдат гістарычных навук.

■ Старонкі гісторыі

«НЕВЯДОМАЯ» МЫТНЯ

ГЕРОІ ЁСЦЬ У ЛЮБЫ ЧАС, НА ЛЮБОЙ ТЭРЫТОРЫІ, У ЛЮБОЙ СФЕРЫ

Адна з найменш вывучаных тэм ваеннага перыяду гісторыі нашай краіны — тэма мытні. Мы шмат ведаем пра герояў-франтавікоў, якія служылі ў мірны час на мяжы, у міліцыі, у авіяцыі — у дзясятках важных і карысных для краіны сфер. І амаль нічога не ведаем пра людзей, чые лёсы нейкім чынам былі звязаны з мытняй.

Аляксей Флягонтаў, 1942 год.

МІЖ тым, гісторыя паступова «дапісвае» малавывучаныя і непапулярныя старонкі, веданне якіх падаецца важным у агульнай карціне Вялікай Айчыннай вайны. Пра некаторыя з іх па нашай просьбе расказаў загадчык кафедры мытнай справы факультэта міжнародных адносін Белдзяржуніверсітэта Віктар Астрога:

— Савецкі ўрад падвяргаў мытныя органы шматлікім рэарганізацыям і перападпарадкаванням на працягу доўгіх дзесяцігоддзяў. Манаполія знешняга гандлю не дазваляла мытням БССР набраць значную вагу, што пасля адбілася на іх колькасці. Так, на 1941 год на тэрыторыі цяперашняй Беларусі служыла ўсяго 12 мытнікаў, ды і тое ў параўнанні з 20 тысячамі пагранічнікаў! Дзіўна, але ў сталіцы БССР мытню ліквідавалі яшчэ ў 1928 годзе — як непатрэбную.

Нешматлікія брэсцкія мытнікі загінулі ў чэрвені 1941-га пры бамбёжцы крэпасці і чыгуначнага вакзала. Да гэтага часу няма дакладных звестак, ці змог нехта з іх выжыць.

Практычна адразу на акупаванай тэрыторыі паўночна-заходняй часткі БССР з'явіліся гітлераўскія мытні — нароўні з іншымі акупацыйнымі органамі. Вядома аб дзейнасці здвюх мытняў — Гродзенскай і Ваўкавыскай. Адкамандзіраваныя з Рэйха супрацоўнікі імперскай мытнай службы ўсталявалі прапускны рэжым на мяжы Усходняй Прусіі і так званай генеральнай акругі «Беларусь». Жорстка кантралявалася перасоўванне тавараў — зброя не павінна была трапіць у рукі партызанаў разам з падводамі. Для часткоўых функцый памежнікаў нават выкарыстоўвалі спецыяльна навучаных сабак.

Сярод асноўных функцый мытнапамежнай службы Рэйха вылучаліся адсочванне і затрыманне ўцекачоў вязняў канцлагераў і ваеннапалонных. Для зручнасці работы акупацыйных мытняў адміністрацыя канцлагераў высылала спецыяльныя вышуковыя лісты. Цікава, што беларусы ў гэтых мытнях не служылі, нягледзячы на прыклады калабарацый у іншых, не менш важных для нямецкага ўрада органах (СС, разведцы, мясцовым самакіраванні), дзе працавалі і савецкія грамадзяне. Гэта пацвярджае знойдзеная дакументацыя — выключна на нямецкай мове.

Былі ў СССР мытні, якія падчас вайны працягвалі сваю працу ў штатным парадку. Гэта тычылася неакупаваных тэрыторый Далёкага Усходу і Сярэдняй Азіі. На Поўначы СССР, у прыватнасці, у Мурманскай вобласці, дзейнічалі пераважна «жаночыя» мытні. І гэта невыпадкова — адважныя грамадзянкі працавалі за мужчын, якія пайшлі на фронт. Па паўночных марскіх шляхах для Чырвонай арміі ішлі тавары па ленд-лізу — спецыяльнай праграме дапамогі дзяржаў-саюзнікаў. Гэта была ваенная тэхніка, боепрыпасы, узбраенне, іншая маёмасць. Перад мытніцамі стаяла задача: кантраляваць транспартныя судны з таварамі. Гераізм гэтых жанчын выяўляўся ў неверагодна цяжкіх умовах службы, калі любы агляд судна мог стаць апошнім. У акваторыі каля порта суднам было цяжка манеўраваць, акрамя таго, існавала рэальная небяспека патаплення нямецкімі падлодкамі. Таму адважныя мытніцы накіроўваліся на сваіх лодках далёка ад берага і часта гінулі не толькі ад нападаў, але і ад штармавых хваляў.

ДОЎГІ час усе казалі пра франтавікоў, якія пасля вайны прыйшлі на службу ў мытні вызваленай беларускай зямлі, але ніхто дакладна не ведаў пра мытнікаў, якія набліжалі вызваленне ў баях. Мала хто ведае, напрыклад, пра тое, што гонар беларускай партызанскай гісторыі — Аляксей Канідзьевіч Флягонтаў у мінулым меў непасрэднае дачыненне да мытні. У пачатку сваёй працоўнай дзейнасці, з 1923 па 1928, Аляксей Канідзьевіч служыў у мытных органах Прымор'я. Ён прайшоў шлях ад інспектара Чыцінскага мытнага ўчастка да начальніка Далёкаўсходняй мытнай акругі — Далёкаўсходняга мытнага ўпраўлення ў Хабараўску. Аднак менавіта Мінская вобласць увекавечыла імя Флягонтава — камандзіра коннага атрада «Баявы» і камандуючага партызанскай брыгадай «За Радзіму», якая дзейнічала на тэрыторыі Чэрвеньскага раёна.

Служба ў мытні практычна не згадваецца ў біяграфічных публікацыях пра Флягонтава, таму мы звярнуліся ў Чэрвеньскі раённы краязнаўчы музей па ўдакладненні. Старшы супрацоўнік музея Ірына Вабішчэвіч пацвердзіла:

— Матэрыялаў аб працы ў мытні камбрыга Флягонтава сапраўды мала, практычна няма. У асноўным згадваецца яго партыйная дзейнасць. Але бясспрэчным сведчаннем работы ў мытнай службе сталі пісьмы прыёмнага сына Флягонтава вучням нашай школы, датаваныя 1970-мі гадамі.

Франтавы атрад «Баявы» пад камандаваннем Аляксея Флягонтава, які складаўся са 132 чалавек, быў сапраўды кавалерыйскім — з адпаведнымі знакамі адрознення. Узбраенне атрада складалі аўтаматы, процітанкавыя стрэльбы і міны. З Тарапца, пасля перасячэння лініі фронту паміж Вяліжам і Усвятамі (Віцебская вобласць) з 21 жніўня 1942 г. пачаўся паўтарамесячны рэйд атрада па беларускай зямлі. За 52 дні рэйду было пройдзена больш за 600 км, праведзена мноства баявых аперацый і дывэрсій, мясцовых партызанаў яны вучылі мінна-падрыўной справе.

Праца мытнікаў у 1944–1946 гг. арыентавалася на маштабную барацьбу з кантрабандай. Кантролю падвяргаліся савецкія войскі, што накіроўваліся на Далёкі Усход. На гэта былі важкія прычыны.

У Чэрвеньскім раёне Флягонтаў са згоды Цэнтральнага штаба партызанскага руху і мясцовых атрадаў стварыў пад сваім камандаваннем брыгаду «За Радзіму» — у складзе «Баявога», мясцовых атрадаў Ціхамірава, Лівенцава, Кузняцова, Філіпскіх і 44-га атрада, які прыбыў з-за лініі фронту. Брыгада праводзіла добра спланаваныя дывэрсіі, налёты на гарнізоны і ўдары па камунікацыях ворага, што прымусіла фашыстаў значна скараціць рух на шашэйных дарогах Мінскай вобласці.

Загінуў Флягонтаў у адным з баёў, пасля чаго брыгада «За Радзіму» атрымала імя яе камандзіра.

ЗЛета 1944 года, пасля вываду нямецкіх войскаў з тэрыторыі БССР, мытні пачалі адноўляцца. Першай аднавіла сваю працу Брэсцкая мытня — у адпаведнасці са сваім усесаюзным значэннем. Следам за ёю ўключыліся ў працу Гродзенская, «Бераставіца» і Мінская. Мытні папоўніліся франтавікамі, але заставаліся малалікімі.

Праца мытнікаў у 1944–1946 гг. арыентавалася на маштабную барацьбу з кантрабандай. Кантролю падвяргаліся савецкія войскі, што накіроўваліся на Далёкі Усход. На гэта былі важкія прычыны. Некаторыя ваенныя камандзіры і начальнікі злоўжывалі сваім службовым становішчам і вывозілі трафейную маёмасць з Германіі з мэтай перапродажу. Да запоўненых вагонаў выстаўлялі вартавых — нібыта для аховы ваеннай маёмасці, якую забаронена было правяраць. Мытнікі не губляліся і па дамоўленасці з камендантам адпаведнага чыгуначнага вакзала адпраўлялі такія саставы… у тупік. Там вагоны стаялі да таго часу, пакуль іх «гаспадары» самі не здаваліся.

— Адзін генерал-маёр прыехаў з шафёрам на трафейным аўтамабілі высокапастаўленага чына з Рэйха. Дакументаў на маёмасць не было, і яго, вядома, затрымалі. Генерал вырашыў «дамагацца праўды» ў Маскве, адкуль хутка вярнуўся… палкоўнікам. Разжалаванаму генералу прыйшлося пакінуць машыну, забраць салдата і з'ехаць назад у сваю часць у Германію, — кажа Віктар Астрога.

Яшчэ адной тэндэнцыяй да 1947 года было маштабнае перамяшчэнне насельніцтва, выкліканае дэмабілізацыяй, рэпатрыяцыяй вывезеных гвалтоўна ў Германію, вяртаннем бежанцаў. Былі перамяшчэнні паміж СССР і Польшчай, калі католікі ехалі ў Польшчу, а праваслаўныя беларусы — у БССР. Мытня кантралявала таварныя патокі, зыходзячы з устаноўленай нормы: адзін вагон маёмасці на сям'ю.

Гісторыя мытных органаў перыяду Вялікай Айчыннай вайны дагэтуль невядомая шырокай грамадскасці. Шэраг фактаў, імён і падзей схаваны пад тоўшчай часу і абставін — многія з іх яшчэ трэба дэталізаваць або адшукаць у архівах.

А наогул, героі ёсць у любы час, на любой тэрыторыі і ў любой сферы. Наша задача — не даць ім згубіцца на скрыжаваннях гісторыі. Таму праца ў гэтым кірунку працягваецца …

Настасся ВАЛАЖЫНСКАЯ,
галоўны інспектар
Мінскай рэгіянальнай мытні

■ Прэм'ера

ВАЙНА ЗНУТРЫ

Гомельскія тэлевізійнікі зладзілі экскурс у падполле Вялікай Айчыннай

Як простыя гараджанкі вялі разведку ў акупаваным Гомелі, а паволжскі немец падарваў гітлераўскую школу контрразведчыкаў у Магілеве? Каму ўдалося знайсці германскі цягнік з хімічнай зброяй і якія звесткі захоўваюць сакрэтныя старонкі летапісу КДБ? Усё гэта — у дакументальным цыкле «Падполле. Вайна ўнутры вайны», які падрыхтавала тэлерадыёкампанія «Гомель» да 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Прэм'ера яго адбудзецца 3 ліпеня на тэлеканале «Беларусь 1».

Усяго ў гэтым арыгінальным праекце чатыры серыі. Першы фільм «Жаночы твар вайны» распавядае пра падпольную групу афіцэра НКУС Івана Казельскага: чатыры жанчыны з ліку простых гараджанак былі падрыхтаваны для разведвальнай дзейнасці ў захопленым фашыстамі Гомелі і прадмесцях. Дзве разведчыцы загінулі літаральна на пачатку барацьбы, а дзве, якія засталіся ў жывых, прайшлі праз найскладанейшыя выпрабаванні і пазней былі адзначаны высокімі ўзнагародамі. Другая серыя «Хроніка нескароных» прысвечана дзейнасці падпольшчыкаў Гродзеншчыны — у прыватнасці, расказвае пра самую першую падпольную групу, арганізаваную былым вайскоўцам Мікалаем Волкавым і яго жонкай Варварай, а таксама пра стварэнне гродзенскага гета, дзейнасць гітлераўскіх карнікаў, доўгачаканае вызваленне горада і ўшанаванне памяці дзеячаў антыфашысцкага руху. Серыя «Татальнае знішчэнне» раскрывае падрабязнасці адной з самых малавядомых аперацый беларускіх падпольшчыкаў — выяўленні нямецкага цягніка з хімічнай зброяй, а таксама знаёміць з дзейнасцю спецатрада НКУС СССР «Адважнікі» (на працягу 1942–1944 гг. атрад правёў на тэрыторыі нашай краіны большасць самых паспяховых у гісторыі Вялікай Айчыннай вайны спецаперацый) і трагічным лёсам яго камандзіра, ураджэнца Бабруйскага павета Аляксандра Рабцэвіча. Чацвёртая, заключная, серыя «Магіла льва» прысвечана падпольшчыкам Магілёва, многія з якіх не дажылі да Перамогі, і нават сёння невядома, дзе яны пахаваны. Адзін з галоўных герояў гэтага фільма — паволжскі немец Валянцін Готвальд, які падарваў Магілёўскую абвераўскую школу, што рыхтавала контрразведчыкаў, а потым працягваў барацьбу ў складзе спецатрада НКУС «Беразіно».

…Невялікія па працягласці фільмы (кожная серыя ўсяго 26 хвілін) запатрабавалі шмат часу на падрыхтоўку. Толькі на збор фактуры і напісанне сцэнарыя спатрэбілася каля паўгода. Яшчэ некалькі месяцаў здымачная група на чале з рэжысёрам-пастаноўшчыкам Аляксандрам Цягуновым працавала «ў полі». «Інфармацыю давялося здабываць, як здабытчыкам золата, — перамываючы тону «руды», — прыгадвае аўтар праекта Віталь Доўгі. — Адпраўныя пункты знаходзілі ў інтэрнэце, потым бясконца тэлефанавалі па музеях, распытвалі мясцовых краязнаўцаў, штосьці даведваліся ўжо на месцы здымак, уносілі карэктывы ў сцэнарый. У некаторых выпадках удавалася знайсці сваякоў нашых герояў. Іншыя нітачкі абрываліся, і мы не маглі адшукаць нават магілы адважных падпольшчыкаў… Пэўныя звесткі да сёння засакрэчаны па розных прычынах — напрыклад, інфармацыя пра здрадніка з Гомеля».

У праекце «Падполле. Вайна ўнутры вайны» шмат фактаў — малавядомых, а то і наогул раней не вядомых. Але ўсё ж гэта не пашыраны мастацкі пераказ падручнікаў па гісторыі. Адметнасць цыкла, зазначаюць яго стваральнікі, у тым, што гэта «серыял пра людзей, якія вялі практычна персанальную вайну — вельмі часта без загаду «зверху», самастойна ўвязваючыся ў барацьбу. Няхай імёнамі гэтых людзей не названа ніводная вуліца, але яны сапраўдныя героі». Прычым атрымалася не чыста дакументальнае кіно, а напалову мастацкая работа: многія падзеі дапамагалі рэканструяваць акцёры, як аматары, так і прафесіяналы (акцёры гомельскіх тэатраў Юрый Вута, Андрэй Бардухаеў), каскадзёры, піратэхнікі — у здымках кожнай серыі цыкла задзейнічана да 50 чалавек.

Усе чатыры серыі праекта «Падполле. Вайна ўнутры вайны» тэлеканал «Беларусь 1» пакажа на гэтым тыдні, пачынаючы з Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь і па нядзелю ўключна.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК

А. Флягонтаў з ад'ютантам у партызанскім атрадзе.

■ Сустрэча праз 70 гадоў

ТУРКМЕНСКІ САЛДАТ ДАЧАКАЎСЯ ПРЫЕЗДУ НАШЧАДКАЎ

Салдаты і афіцэры Вялікай Айчыннай... Кожны з іх, загінулых, быў для кагосьці родным чалавекам. Але тая разбуральная вайна і праз некалькі дзясяткаў гадоў не раскрывае ўсіх сваіх страшных таямніц. Нехта застаўся непахаваным ляжаць на полі бою. Нехта пахаваны ў брацкай магіле, месца якой невядома. Чыёсьці прозвішча згубілася пазней, пры перапахаваннях. А іншыя і дагэтуль засталіся Невядомымі...

Здаецца, чым далей мы адыходзім ад вогненных саракавых, тым меней шанцаў адшукаць хаця б магілу дарагога чалавека, наведаць яго, адзінокага, гвалтоўна адарванага ад свайго роду, чыім апошнім прытулкам стала далёкая зямля.

Але здараюцца неверагодныя супадзенні, адбываюцца сапраўдныя цуды. Я гэта ведаю дакладна і гэтаму на пачатку красавіка стала сведкай. Але аб усім — па парадку.

ПЕРАДГІСТОРЫЯ

З сённяшняй выкладчыцай англійскай мовы Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя І.П.Шамякіна Святланай Кісялёвай мы на пачатку 90-х працавалі разам у СШ №4 г. Чэрвеня. Ведаю яе як цудоўнага педагога, шчырай душы жанчыну, вельмі добразычлівую як да дзяцей, так і да людзей усіх узростаў, неабыякавую і сумленную...

Так склалася, што яна стала хроснай маці для маёй сяброўкі Тамары. А пасля па шэрагу абставін пераехала ў Мазыр. Пра яе жыццё-быццё я раз-пораз даведвалася ад Томы. Вось дзякуючы нашым сяброўскім сувязям я і пачула яшчэ ўзімку гісторыю неверагодных супадзенняў, якую па прыездзе Святлана Вячаславаўна расказала больш падрабязна:

— У 2009 годзе ў Мазырскім педуніверсітэце з'явілася першая невялічкая (усяго чатыры чалавекі) група студэнтаў з Туркменіі. Я ў той час была старшынёй прадметнай камісіі на прыёмных іспытах па англійскай мове. Дарэчы, нават гэтая чацвёрка прыехала не разам. Першай дабралася да Беларусі адна дзяўчына. Мяне пасля заканчэння працоўнага дня папрасілі паехаць у галоўны корпус, у аддзел міжнародных сувязяў, і прыняць у яе экзамен па замежнай мове, правесці гутарку. Па яе выніках, маўляў, мы альбо прымем яе на факультэт, альбо — у тым выпадку, калі не вельмі добрая руская мова, калі недастатковы ўзровень англійскай, — прапануем пазаймацца на падрыхтоўчым аддзяленні.

І вось я заходжу ў такую вялізную лекцыйную аўдыторыю, а там сядзіць дзяўчынка — маленькая, худзенькая, у ружовай кофтачцы з кветкай і пазірае на мяне спужанымі вачыма. Па шчырасці, яна практычна нічога не гаварыла па-руску і практычна нічога — па-англійску. Але яе вочы... Ды і ўсё аблічча... Мне настолькі яна спадабалася, што я не магла сказаць ёй «не» ці накіраваць на падрыхтоўчыя курсы.

Вось так усё пачыналася. Энеджан было ўсяго 16 гадоў. 29 верасня мы святкавалі яе 17-годдзе. Група сабралася вельмі добрая, прасунутая, дзеці дружныя. У першы ж год, яны, падключыўшы і туркменаў, выйгралі конкурс «Першакурснік універсітэта» і нават «Першакурснік вобласці».

Але бліжэй да нашай гісторыі. У нас ёсць такі прадмет — «практыка вуснага маўлення». Адна з тэм — «Вайна ў маім жыцці, у жыцці маёй сям'і». І вось Энеджан пачала распавядаць пра дзеда, які загінуў у Беларусі. Пахаваны, маўляў, дзесьці там, дзе знаходзіцца невядомы горад Чэрвень.

Гэтыя заняткі праводзіла мая калега. Ва ўніверсітэце ўсе ведаюць, што я — з Чэрвеня. Энеджан параілі да мяне звярнуцца. На той час ва ўніверсітэт паступіла ўжо яе стрыечная сястра Гульбахар Анаева. І вось жа парадокс. Я — куратар групы, дзе вучыцца Энеджан, і за ўсе гады вучобы яна ні разу не сказала, што шукае магілу дзеда ля Чэрвеня.

Дарэчы, хачу патлумачыць, што ў гэтага народа паняцці «брат» і «сястра» крыху глыбейшыя, шырэйшыя і мацнейшыя, чым у нас. Нават узнікаюць цяжкасці з перакладам па тэме «Сям'я». Мы вучым, як называюцца сваякі, а ў іх на ўсё слова «брат».

На самой справе, загінулы — брат роднага дзеда, Елдаша, які, на шчасце, вярнуўся з вайны. Абдула ж быў маладым, ён не паспеў стварыць уласную сям'ю, займець дзяцей. Яго пляменнік, тата Энеджан, усё жыццё хацеў адшукаць магілу Абдулы. Дарэчы, ён вучыўся ў Ленінградзе. Але пра месца пахавання даведаўся пазней, інакш абавязкова наведаў бы. Для іх гэта — святое. І вось, адпускаючы Энеджан у далёкую Беларусь на вучобу, сям'я, мабыць, спадзявала, што яна зможа адшукаць месца пахавання. Словам, калі Энеджан і Гульбахар звярнуліся да мяне, я паабяцала звазіць іх на Чэрвеньшчыну.

ПАДРЫХТОЎКА

...Месцам пахавання дзеда Абдулы была названа вёска Горкі. Але Лена, дачка Святланы Вячаславаўны і мая колішняя вучаніца (чарговае супадзенне) вырашыла праверыць інфармацыю па кнізе «Памяць. Чэрвеньскі раён». Перагледзела спісы загінулых па населеных пунктах і адшукала дзеда Энеджан і Гульбахар у вёсцы Кутузаўка. Праўда, прозвішча напісана ў кнізе і на помніку з памылкамі — Халсанбердыеў. Але гэта — дакладна ён. (Чаму я так упэўнена, раскажу крыху пазней.) Лена ж рыхтавалася прымаць дзяўчат у сваім доме ў Чэрвені, дзе жыве з мужам Сяргеем і дзвюма маленькімі дачушкамі.

Ну, а я распытала ў Руднянскім сельвыканкаме, дзе ў вёсцы Кутузаўка (старажытная назва — Драчча Паненская) знаходзіцца брацкая магіла. Аказалася — на вясковых могілках. Арыенцір — высокі чорны помнік і чырвоныя зоркі на агароджы.

Мая сяброўка Тамара, цяперашні намеснік дырэктара СШ №2 г.Чэрвеня па выхаваўчай рабоце, прапанавала разнастаіць культурную праграму гасцей наведваннем музейнага пакоя касманаўтыкі.

І вось пятага красавіка гэтага года зоркі нарэшце сышліся...

ВАНДРОЎКА ПАМЯЦІ

Сярод халодных дзён пачатку красавіка гэты выдаўся сонечным і больш-менш цёплым. Сама Прырода дапамагала ў такой богаўгоднай справе. Прыехаўшы ў Чэрвень, госці разам са Святланай Кісялёвай напачатку накіраваліся да Лены, дзе адагрэліся (ноч у цягніку была вельмі халоднай) і... пераапрануліся ў нацыянальныя строі.

У прызначаны час да Кісялёвых прыйшла і я. Знаёмімся з дзяўчатамі і выпраўляемся ў дарогу. Адвезці нас у Кутузаўку ўзяўся муж Лены Сяргей на сваёй машыне. У Чэрвені дзяўчаты набылі жывыя чырвоныя гваздзікі. З сабой узялі яшчэ, каб набраць з пахавання зямлі і завезці яе ў далёкую Туркменію.

Па дарозе гутарым, але не вельмі актыўна. Усё ж хваляванне прысутнічае ва ўсіх. Першы здымак па падказцы Сяргея раблю пры ўездзе ў вёску, здымаючы дзяўчат пад шыльдай «Кутузаўка». Цяпер яны ніколі не забудуць гэтую назву...

Праз усю вёску, а тады праз поле едзем да могілак. І павольна — уздоўж плота, выглядаючы помнік і агароджу з зоркамі. Заўважаем усе адначасова і разам выдыхаем: «Вунь там!» Набліжаемся. Знаходзім патрэбнае прозвішча — бліжэй да зямлі. Дзяўчаты падыходзяць да помніка, ускладаюць кветкі, па чарзе пяшчотна праводзяць рукамі па літарах...

Далейшага некаторы час не бачу, бо вочы засцілаюць слёзы. Дужа свежыя ўражанні ад наведвання магілы свайго дзеда ў літоўскай Седзе ў 2010 годзе — адшуканай з вялікімі намаганнямі праз 65 гадоў пасля яго смерці. Святлана Вячаславаўна Кісялёва, якая і сама выцірае слёзы, супакойвае мяне, а потым кажа:

— Ідзі, яны моляцца... Сфатаграфуй...

Кранальныя хвіліны...

Колькі часу мы яшчэ там, прысеўшы крыху далей на лаўцы, каб не замінаць Энеджан і Гульбахар здзяйсняць патрэбныя рытуалы. Дзед туркменскіх дзяўчат загінуў 3-га ліпеня 1944 года — у дзень вызвалення Беларусі. 70 гадоў таму...

РАЗМОВА ПА ДУШАХ

Назад едзем сцішаныя, пад вялікім уражаннем. Ад дзяўчат даведваюся, што перад пачаткам пятага курса тата сказаў Энеджан, што гэты год — апошні шанц знайсці ў Беларусі магілу дзеда і наведаць яе. І каб яна не вярталася дадому, пакуль гэтага не выканае. Дзякуй Богу, атрымалася. Пацверджанне таму — аповеды, зямля з брацкай магілы, цэлы стос фотаздымкаў і гэтая публікацыя...

Напачатку ж пытаюся ў Энеджан, чаму яна вырашыла вучыцца менавіта ў Беларусі. Аказваецца, дзяўчына са школы марыла вывучыць рускую мову, выбірала паміж Расіяй і нашай краінай. Перавагу аддала Беларусі, бо ў горадзе Горкі ўжо вучылася яе траюрадная сястра. Мама таксама была за Беларусь, бо ад цётчынага мужа, які служыў у войску ў Гомелі, ведала, што беларусы — вельмі добрыя, гасцінныя і працавітыя...

Сястра сустрэла Энеджан у Мінску, прывезла ў Мазыр.

— Калі я прыляцела ў аэрапорт і мы выйшлі ў горад, мне здавалася, што ўсе беларусы — надта белыя, — з усмешкай распавядае дзяўчына. — У нас ёсць нацыянальнае адзенне, якое носяць штодня. У замужніх жанчын на галаве абавязкова хустка. У Беларусі апранаюцца зусім па-іншаму: штаны, спадніцы, джынсы, світары... Такімі былі мае першыя ўражанні. Я ўбачыла, што вакзал зроблены па-іншаму. А як мне спадабалася ваша бібліятэка! Падумала: «Ну вось я і ў еўрапейскай краіне...» Дагэтуль жа нікуды не выязджала са сваёй вёскі! Калі я была ў старэйшых класах, бацька расказаў мне пра дзеда Абдулу. Я зацікавілася і распытала ў яго пра меркаванае месца пахавання. А калі пасля чацвёртага курса паехала дахаты, спытала, як называецца горад, як звалі дзеда, калі ён нарадзіўся і загінуў. Усё гэта запісала... І вось мы паехалі ў Кутузаўку... Ужо ў гэты час, на могілках, я думала: «Наш дзядуля ваяваў з фашыстамі, каб абараняць сваю Радзіму, зямлю, будучыню, жыццё сваіх нашчадкаў — наша жыццё...» Наведванне яго пахавання — гэта вельмі кранальна. Мы плакалі, маліліся аб тым, каб памерлыя спакойна жылі ў раі. Для мяне вялікі гонар, што я пабыла на магіле дзеда, першая з роду. Буду расказваць усім шматлікім сваякам і паказваць фотаздымкі.

Пытаюся пра ўражанні ад вандроўкі памяці ў Святланы Кісялёвай.

— Я кранута, уражана нават больш, чым думала, — заўважае яна. — Расчулена сапраўды да слёз! Усё ж такі дзіўна, што гэта здарылася са мной. А з іншага боку, мабыць, добра і правільна. Вось Энеджан сказала, што яна рада і будзе пра гэта распавядаць сваякам. А я рада, што ўся мая сям'я спрычынілася да гэтага.

Я ж буду вельмі рада, калі так складзецца, што мы з Энеджан не згубімся і пасля яе заканчэння ВНУ. Я хачу, каб Энеджан ведала, што ў Беларусі ў яе ёсць... радня! Пакуль дамовіліся, што будзем перапісвацца па інтэрнэце, «Скайп» падключым. Галоўнае — не згубіцца. Будзе жаданне — значыць, будзем мець стасункі.

...Дзень пятага красавіка праляцеў вельмі хутка! Правёўшы дзяўчат на маршрутнае таксі, на якім яны паехалі ў Мінск, мы яшчэ доўга не разыходзіліся, абмяркоўваючы ўсё ўбачанае і пачутае. Уражаннямі поўніцца душа і сёння. Дастаткова толькі зірнуць на шматлікія фотаздымкі і нацыянальныя туркменскія тапачкі-шкарпэткі, падораныя на памяць...

САМЫ ВАЖНЫ ДАКУМЕНТ

Гэты аповед быў бы няпоўным без падмацавання здагадак, так бы мовіць, фактамі. Шукаю ў аб'яднанай базе даных (АБД) «Мемарыял» у інтэрнэце звесткі пра дзеда дзяўчат Абдулу. Адна спроба, другая... Перастаўляю літары ў прозвішчы і так, і так... Звестак няма. Даўно спрактыкаваная ў такіх пошуках, вырашаю ўзяць першае ж рускае прозвішча з помніка на брацкай магіле ў вёсцы Кутузаўка.

Гэта лёс! У спісах беззваротных страт (самы арыгінальны дакумент часоў Вялікай Айчыннай вайны, дакладней — яго лічбавая копія) ніжэй выпадкова абранага прозвішча яшчэ два прозвішчы загінулых і пахаваных там жа, у вёсцы Драчча. І сярод іх — дзед Энеджан і Гульбахар! Пішу Энеджан на электронную скрынку паведамленне з просьбай папытацца ў таты па тэлефоне, дзе нарадзіўся іх родзіч. Колькі дзён чакання (званкі дарагія!), адказ... Усё сышлося! Вобласць, раён, імя роднага дзеда Энеджан, якому амаль 70 гадоў таму накіравалі пахавальную...

Дасылаю дзяўчатам старонку дакумента — і атрымліваю гарачую слоўную ўдзячнасць. Вось такая неверагодная ў сваіх супадзеннях гісторыя, якая проста не магла не адбыцца...

Святлана АДАМОВІЧ.
Фота аўтара.

ЗА ВЫЗВАЛЕННЕ РОДНАЙ БЕЛАРУСІ

Каму прысвечана кніга Сэндзі Конрада «Загінулыя цывілізацыі»

Знаёмячыся з творчасцю Эдуарда Міхайлавіча Кандратава, журналіста, які чвэрць стагоддзя працаваў уласным карэспандэнтам «Известий», аўтара папулярных кніг савецкага перыяду: «Па чырвонай сцежцы Эльдарада», «Трывожныя ночы ў Самары», эпапеі «Жорсткі год», я даведаўся, што ён нарадзіўся ў Магілёве. Гэты факт мяне зацікавіў. І я вырашыў звярнуцца да Ларысы Эдуардаўны, дачкі нашага земляка, якая жыве ў Самары. Яна распавяла шмат цікавага пра свайго бацьку і пра дзядзьку Аляксандра Міхайлавіча, вядомага лінгвіста, біёлага, журналіста і паэта, якога называлі бацькам савецкага андэграўнду — легендарнага Сэндзі Конрада.

Начальнік штаба 92-га знішчальнага авіяцыйнага палка падпалкоўнік Міхаіл Аўдзеевіч КАНДРАТАЎ.

Разглядваючы фотаздымкі хатняга архіва, я звярнуў увагу на партрэт бравага ваеннага лётчыка з ордэнам Чырвонай Зоркі на грудзях.

— Гэта мой дзядуля, Міхаіл Аўдзеевіч Кандратаў, які загінуў у 1943 годзе, але калі дакладна і дзе пахаваны, невядома, — расказала Ларыса Эдуардаўна. Яго малодшы сын Аляксандр прысвяціў бацьку кнігу «Загінулыя цывілізацыі»...

Хто ж ён такі, беларус Міхаіл Аўдзеевіч Кандратаў? Нарадзіўся ў 1906 годзе ў вёсцы Прыбярэжжа Быхаўскага раёна Магілёўскай вобласці. Дваццацігадовым юнаком быў прызваны ў Чырвоную Армію. У 1939 годзе скончыў авіяцыйнае аддзяленне акадэміі імя М.В. Фрунзе, удзельнічаў у савецка-фінскай вайне. Вялікую Айчынную маёр Кандратаў сустрэў на пасадзе начальніка штаба 92-га знішчальнага авіяцыйнага палка. Баявыя дзеянні полк пачаў 22 чэрвеня 1941 года, а ў верасні 1941 года ў раёне Кіева трапіў у акружэнне.

З яго тэхнічны склад прарываўся ў напрамку Харкава і праявіў адвагу і адданасць Радзіме. Вось як пра гэта пісаў камандзір палка маёр Ячмянёў у прадстаўленні на ўзнагароджанне маёра Кандратава ордэнам Чырвонай Зоркі: «Начальнік штаба Кандратаў разам з групай асабістага складу палка змог прабіцца да сваіх. Пасля чаго прыклаў максімум сіл у навучанні палка. У выніку праведзенай работы полк як баявая адзінка атрымаў новую матэрыяльную частку і з новымі сіламі прыступіў да знішчэння ворага...»

А вось яшчэ адно прадстаўленне на ўзнагароджанне, ужо падпалкоўніка Кандратава ордэнам Айчыннай вайны II ступені, падпісанае 13 жніўня 1943 года камандзірам 279-й знішчальнай авіяцыйнай дывізіі палкоўнікам Дзяменцьевым: «З чэрвеня па кастрычнік 1942 года на Волхаўскім і Ленінградскім франтах таварыш Кандратаў паспяхова кіраваў як штабам авіяпалка, так і штабам авіягрупы трох авіяпалкоў. За гэты перыяд 92-гі знішчальны авіяцыйны полк, дзе начальнікам штаба быў падпалкоўнік Кандратаў, зрабіў 929 баявых вылетаў, правёў 343 паветраныя баі, у якіх было збіта 40 самалётаў праціўніка...»

Апошні год службы Міхаіла Аўдзеевіча быў звязаны з Цэнтральным фронтам, які ў кастрычніку 1943 года быў перайменаваны ў Беларускі. Менавіта гэты фронт з 10 па 30 лістапада правёў Гомельска-Рэчыцкую наступальную аперацыю, у выніку якой 26 лістапада 1943 года быў вызвалены Гомель. У паветраных баях за вызваленне Беларусі ўдзельнічаў і 92-і знішчальны авіяцыйны полк.

Калі пачытаць аператыўныя зводкі за снежань 1943 года, то можна заўважыць, што ў гэты перыяд на паўднёва-заходнім кірунку ад Жлобіна ішлі жорсткія бітвы, у якіх удзельнічала і авіяцыя... У гэтых баях, за вызваленне сваёй роднай Беларусі 23 снежня 1943 года загінуў начальнік штаба 92-га знішчальнага авіяцыйнага палка падпалкоўнік Міхаіл Аўдзеевіч Кандратаў.

Міхаіл Аўдзеевіч КАНДРАТАЎ з жонкай Тамарай Дзмітрыеўнай і сынамі Эдуардам і Аляксандрам.

Архіў аб'яднанай базы даных «Мемарыял» сведчыць, што наш зямляк пахаваны ў брацкай магіле ў вёсцы Майская Жлобінскага раёна Гомельскай вобласці. Усяго тут пахавана 1 тыс. 385 воінаў, якія загінулі ў баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў снежні 1943-га — студзені 1944-га.

Мікалай БОЙКА

АКЦЫЯ «ТЫДЗЕНЬ ПАМЯЦІ» СТАРТАВАЛА Ў ЭФІРЫ БЕЛАРУСКАГА РАДЫЁ

З нагоды 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў на Першым нацыянальным канале Беларускага радыё стартавала эфірная акцыя «Тыдзень памяці», паведамілі БЕЛТА.

Так, 3 ліпеня на канале пройдзе радыёдзень «Дзень Незалежнасці». Яго галоўнай асаблівасцю стане прамы рэпартаж з параду войскаў Мінскага гарнізона і тэатралізаванага шэсця «Беларусь — ад вызвалення да незалежнасці». На працягу дня ў выпусках навін будуць гучаць прамыя ўключэнні са святочных пляцовак у сталіцы і рэгіёнах.

Публіцыстычная перадача «Беларускі шлях» правядзе віртуальную радыёэкскурсію па залах новага будынка Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Радыёпартрэт рэжысёра-пастаноўшчыка дзяржаўных свят і канцэртных праграм Вячаслава Паніна створыць нарысавая праграма «Галерэя». У ёй пойдзе размова аб асаблівасцях падрыхтоўкі і правядзення важных дзяржаўных святочных мерапрыемстваў, а таксама аб некаторых рэжысёрскіх сакрэтах, прыёмах і навацыях.

Перадача для дзяцей і моладзі «Адкрытая пляцоўка» раскажа аб вахце памяці Беларускай рэспубліканскай піянерскай арганізацыі. Культурна-пазнавальная перадача «Арт-салон» таксама будзе прысвечана тэме захавання гістарычнай памяці.

З культурнай праграмай святкавання Дня Незалежнасці, тэматычнымі тэатральнымі пастаноўкамі, выстаўкамі і музейнымі экспазіцыямі пазнаёміць праект «Культурная прастора». У гісторыка-дакументальнай праграме «Эпізоды Вялікай вайны» на тыдні прагучаць успаміны ветэранаў, якія прымалі ўдзел у вызваленчай аперацыі «Багацыён».

Першы нацыянальны канал Беларускага радыё можна слухаць па правадной сетцы, на доўгіх, ультракароткіх хвалях, у FM па ўсёй краіне, а таксама ў рэжыме рэальнага часу ў інтэрнэце.

■ Напярэдадні свята

АБНАВІЛІ ПОМНІК ТАЛАКОЙ

Мемарыял у гонар васьмі загінулых у Афганістане воінаў-інтэрнацыяналістаў адкрыўся пасля рэканструкцыі ў Стаўбцоўскім раёне

Сродкі на абнаўленне помніка жыхары райцэнтра збіралі ўсёй талакой. Значны ўнёсак зрабілі індывідуальныя прадпрымальнікі. Эскіз зроблены мясцовым мастаком Алегам Навіцкім. Работы па рэканструкцыі выканалі мясцовыя арганізацыі і прадпрыемствы.

У цырымоніі ўрачыстага адкрыцця мемарыяла ўдзельнічалі дэпутат Палаты прадстаўнікоў Беларусі Мікалай Іванчанка, прадстаўнікі дабрачыннага фонду дапамогі воінам-інтэрнацыяналістам «Памяць Афгана», Мінскай абласной арганізацыі «Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане», сваякі і родныя загінулых.

Для прысутных прайшла прэзентацыя ваенна-патрыятычнага клуба, што дзейнічае ў школе №3 Стоўбцаў. Кіруе ім Рыгор Мамайка — старшыня раённай ветэранскай арганізацыі, які прайшоў Афганістан.

МОЛАДЗЬ — ВЕТЭРАНАМ

Адкрыты раённы маладзёжны конкурс патрыятычнай песні «Чырвоны гваздзік» прайшоў ва ўрочышчы Векерава Салігорскага раёна. Ён стаў часткай ваенна-патрыятычнай рэканструкцыі «И поет мне в землянке огонь...», прысвечанай 70-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Дню Незалежнасці.

Удзельнікі і госці адведалі салдацкай кашы, партызанскай поліўкі, спявалі песні каля вогнішча. А старт мерапрыемству даў мотапрабег з ускладаннем кветак па маршруце: Салігорск — помнік братам Цуба — Курган славы, вёска Чаланец — помнік Васілю Каржу, вёска Хорастава — урочышча Векерава.

У якасці ганаровых гасцей на конкурс былі запрошаны ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, дэлегацыі Слуцкага і Любанскага раёнаў.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

САЛДАТ НЕ ВЯРНУЎСЯ З ВАЙНЫ

На Магілёўшчыне ўстанавілі імёны яшчэ трох воінаў Вялікай Айчыннай вайны. Гэта радавыя Яфім Трафімавіч Ярмаш і Іван Харытонавіч Норка з Палтаўскай вобласці, прызваныя ў маі-чэрвені 1941 года Аржыцкім РВК, а таксама радавы Мітро Уласенка з Чарнігаўшчыны. Іх астанкі знойдзены ў наваколлі быхаўскай вёскі Прыбар, дзе ў ліпені сорак першага ішлі жорсткія баі.

Наогул пошукавікамі абласнога гісторыка-патрыятычнага клуба «ВІКРУ» і 52-га асобнага пошукавага батальёна падчас вахты памяці ў Быхаўскім раёне былі знойдзены астанкі 23 чырвонаармейцаў, і, на жаль, толькі тры так званыя «смяротныя» медальёны.

— Воіны дагэтуль лічыліся зніклымі без вестак, — кажа кіраўнік «ВІКРУ» Мікалай Барысенка. — На жаль, мы пакуль не ведаем, у якім падраздзяленні яны служылі. Тэарэтычна гэта маглі быць салдаты 187, 102, або 151 стралковых дывізій, якія змагаліся на Дняпроўскім рубяжы.

Нэлі ЗІГУЛЯ

■ Запрашальнік

«МАРЫЯ — УЗОР МАЛІТВЫ»

Пад такім дэвізам пройдуць урачыстасці ў Будславе

Традыцыйныя мерапрыемствы ў гонар прастольнага свята Будслаўскага абраза Божай Маці адбудуцца ў Будславе 4—5 ліпеня. Названы абраз — адзін з найбольш ушанаваных у каталіцкай царкве і вядомы многімі цудамі. Пакланіцца яму штогод збіраюцца шматлікія паломнікі з усіх куткоў Беларусі і з-за мяжы. У прыватнасці, летась Будслаў наведалі больш як 40 тысяч вернікаў.

Як паведаміла галоўны спецыяліст аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мядзельскага райвыканкама Валянціна Зуеўская, сёлета ўрачыстасці пройдуць пад дэвізам «Марыя — узор малітвы». Адметнасцю святкавання стане прыбыццё крыжа Сусветнага дня моладзі. Рэліквія зроблена ў 1984 годзе і знаходзілася каля галоўнага алтара базілікі святога Пятра ў Ватыкане. Затым Папа Ян Павел II уручыў яго маладым людзям як сімвал любові Хрыстовай да чалавецтва. З таго часу крыж падарожнічае па ўсім свеце. У Беларусі святыня будзе знаходзіцца да 12 ліпеня і пабывае ва ўсіх каталіцкіх дыяцэзіях.

Галоўнае богаслужэнне ў будслаўскім касцёле Унебаўзняцця Найсвяцейшай Панны Марыі адбудзецца 5 ліпеня аб 11 гадзіне раніцы. Яго правядзе апостальскі нунцый у Беларусі архіепіскап Клаўдыя Гуджароці. У набажэнстве прыме ўдзел Мітрапаліт Мінска — Магілёўскай архіепархіі Рымска-каталіцкай царквы Тадэвуш Кандрусевіч.

2 ліпеня ў касцёле Святых Сымона і Алены ў Мінску ён праславіў верапаломнікаў, што накіраваліся ў Будслаў, а таксама праехаў з імі на веласіпедзе частку шляху.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ

■ Руіны страляюць

ПАД НАГАМІ ФАШЫСТАЎ ГАРЭЛА ЗЯМЛЯ...

За звесткі пра Данілу Райцава акупанты абяцалі 50 тысяч рублёў

У пачатку красавіка жыхары Віцебшчыны адзначылі векавы юбілей свайго земляка, арганізатара партызанскага руху, камандзіра партызанскай брыгады імя Чырванасцяжнага Ленінскага камсамола, ганаровага грамадзяніна горада Віцебска Данілы Фядотавіча Райцава.

...З Данілам Фядотавічам я была знаёма асабіста. Ён даволі часта прыходзіў да нас, у рэдакцыю абласной газеты «Віцебскі рабочы». Тут працавалі журналісты, якія таксама ваявалі з фашыстамі. Данілу Фядотавіча цягнула да іх: пагаварыць, параіцца, успомніць былое, калі і чарку разам кульнуць. Ён заўсёды прыносіў яблыкі са свайго саду — чырванабокія, хрумсткія, сакавітыя, часта ваў маладых супрацоўнікаў. Прыемна было атрымаць з рук шыракаплечага двухметровага волата райскі яблычак, наліты сонцам...

Пазней, калі яго рэдакцыйныя сябры сталі пенсіянерамі, а нехта з іх адышоў у іншы свет, я атрымала заданне напісаць матэрыял да 80-годдзя славутага партызанскага камандзіра. Было трохі боязна: як ён успрыме маю асобу, якая «пораху не нюхала»? Аб чым з такой гаварыць? Але хвалявалася дарэмна. Мяне запрасілі ў госці, вельмі цёпла сустрэлі. У двухпакаёвай утульнай кватэры не было нічога лішняга. На сцяне — партрэт Данілы Фядотавіча, напісаны вядомым віцебскім мастаком Пятром Явічам. Там яму было недзе гадоў сорак пяць чарнавалосы, з агеньчыкамі ў вачах. І з узнагародамі на магутных грудзях: ордэнамі Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны I ступені, медалямі «За адвагу», «Партызану Айчыннай вайны» I і II ступеняў. Завіхалася на кухні жонка гаспадара Вольга Міхайлаўна, жыццё якой дастойнае рамана. (У якасці медработніка яна аддала 7 гадоў арміі, чатыры з якіх адабрала вайна — Вялікая Айчынная і так званая японская.) Без яе мужу цяжка было б дасягнуць такіх поспехаў у працы. А Даніла Фядотавіч у мірным жыцці кіраваў Заходне-Дзвінскім упраўленнем асушальных сетак, за што атрымаў ордэн «Знак Пашаны», медаль «За працоўную доблесць» і званне заслужанага меліятара БССР.

Успамінаць вайну не хацелася, але ж яе з жыцця не выкрасліш.

— 22 чэрвеня 1941 года я апынуўся ў Суражы, — расказваў Даніла Фядотавіч. — Прыбыў у камандзіроўку з Астравецкага раёна Вілейскай вобласці, дзе ў вёсцы Міхалішкі будаваў аэрадром. Дыханне вайны адчувалася ўжо выразна. І не трэба казаць, што застала яна нас знянацку. Проста не паспелі мы да яе падрыхтавацца.

Пачуўшы пра тое, што пачалася вайна, тут жа адправіў у тыл жонку з шасцігадовым сынам і нованароджанай дачушкай. У Наркамаце ўнутраных спраў мне загадалі прыбыць у Віцебск, далей — загад будаваць аэрадром каля Суража. Аднак ваенныя падзеі развівaліся імкліва, фронт набліжаўся... І — новы загад: людзей эвакуяваць, аэрадромнае абсталяванне знішчыць, каб нічога не дасталася ворагу.

Праз некаторы час сюды, у Сураж, прыбыў вядомы яшчэ з часоў грамадзянскай вайны Мінай Піліпавіч Шмыроў. Сакратар райкама Камароў, параіўшыся з ім, прапанаваў стварыць на шклозаводзе ў Ноўцы і на кардоннай фабрыцы ў Пудаці баявыя атрады, а ў Суражы — знішчальны батальён пад камандаваннем начальніка раённага аддзела міліцыі Пузакі. Узначаліць раённую разведку было даручана мне. Чаму? Напэўна, таму, што я ўвесь Суражскі раён прайшоў уздоўж і ўпоперак. Па-першае, гэта мая радзіма. А па-другое, я амаль пяць гадоў працаваў тут старшым землеўпарадчыкам.

Запомніліся словы Міная Шмырова: «Тое, што немцы палезлі ўглыб, — горш для іх, у пастку трапяць. Наша задача — стварыць у іх тыле другі, партызанскі фронт. Каб кожны куст, кожная купіна стралялі па ворагу!»

Раніцай 11 ліпеня ў Сураж уварвалася восем танкаў, немцы асмялелі настолькі, што палезлі змываць свой бруд у Касплі. Распрануліся дагала і... трапілі пад нашы кулі.

Заданне па знішчэнні мастоў цераз Касплю і Суражанку мы выканалі і пайшлі лясной сцяжынай у напрамку Касплянскай дачы. Некалькі разоў натыкаліся на адступаючых чырвонаармейцаў, паказвалі ім дарогу, дзяліліся харчамі, прасілі залічыць у вайсковую часць. Нам адмаўлялі. Казалі, што больш карысці ад нас будзе ў варожым тыле. Тады мы вырашылі арганізаваць баявы партызанскі атрад. Камандаваць ім мае таварышы даверылі мне. У атрадзе было спачатку сто чалавек, потым у яго ўліваліся нашы акружэнцы, якія прабіраліся на ўсход. Атрад папаўняўся не толькі кадравымі ваеннымі, але і ўзбраеннем.

Ляскаючы зубамі ад страху ён дастаў з сейфа трыццаць тысяч рублёў, усе чыстыя бланкі акупацыйных дакументаў, у тым ліку — пропускаў у нямецкія гарнізоны і круглую пячатку са штампам управы.

Неяк на лясной паляне знайшлі кіпы лістовак за подпісамі наркама абароны СССР, Маршала Савецкага Саюза С.К. Цімашэнкі і першага сакратара ЦК Кампартыі Беларусі П.К. Панамарэнкі. Напэўна, з самалёта скінулі. Лістоўкі заклікалі стварацъ у тыле ворага партызанскія атрады, дыверсійныя групы, знішчаць гітлераўцаў, граміць варожыя гарнізоны, пускаць пад адхон эшалоны, дапамагаць фронту з тылу, аж пакуль апошні акупант не знойдзе сабе месца ў магіле. Значыць, правільна мы паступілі, стварыўшы атрад. Гэтыя лістоўкі мы прынеслі Мінаю Піліпавічу Шмырову. Ён узрадаваўся ім, як сапраўднаму скарбу, і шматзначна сказаў: «Пачынаецца ўсенародная партызанская вайна...» Шмат я тады пачуў ад яго каштоўных парад, разумных прапаноў адносна вядзення бою, разведкі, засад і дыверсій, сувязі з насельніцтвам, папаўнення атрада, забеспячэння яго зброяй, адзеннем, харчамі.

У верасні атрад спыніўся ў зоне Ноўкінскага лясніцтва. Вялі глыбокую разведку, вывучалі становішча. Фашысты шныралі ўсюды, шукаючы партызан. У Суражы і Жабянцях стаялі буйныя гарнізоны, у Курыне, Пышняках і Мікалаёве дзейнічалі нямецкія ўправы. Кантраляваліся ўсе дарогі, што звязвалі вёскі з Віцебскам, Суражам і Веліжам. Рабавалася насельніцтва. Каб пазбавіць фашыстаў кароткага шляху дастаўкі правіянту ў Віцебск ды і наогул паралізаваць усе акупацыйныя «нарыхтоўкі», мы знішчылі паромную пераправу цераз Заходнюю Дзвіну, а потым наведаліся да мясцовага бургамістра Баканава. Ляскаючы зубамі ад страху ён дастаў з сейфа трыццаць тысяч рублёў, усе чыстыя бланкі акупацыйных дакументаў, у тым ліку — пропускаў у нямецкія гарнізоны і круглую пячатку са штампам управы. Канфіскавалі ў яго шэсць паляўнічых ружжаў, вінтоўку і боепрыпасы.

Неўзабаве на адрэзку дарогі Шухвасты — Віцебск трое маіх партызан — Іван Кандраценка, Міхаіл Сільніцкі і Пятро Скупаў — з засады расстралялі нямецкую легкавушку, у якой ехаў эсэсаўскі генерал з афіцэрамі. Потым партызаны разграмілі млын у вёсцы Шакелі, маслазавод у Маскальках, перастралялі немцаў у Ходараве, калі тыя пагрузілі ўжо на аўтамашыну шэсць ладных парсюкоў... Гітлераўцы, якія шалелі ад партызанскіх «пачастункаў», вызначылі, што камандуе ляснымі салдатамі Даніла Райцаў. І вырашылі злавіць яго рукамі мясцовых жыхароў, паабяцаўшы 50 тысяч рублёў таму, хто паведаміць, дзе хаваецца партызанскі камандзір. Чакалі доўга і дарэмна. Ніхто на тыя грошы не паквапіўся.

А партызаны па-ранейшаму не давалі акупантам адчуваць сябе гаспадарамі на чужой зямлі. Атрады нашай брыгады ў сваіх абавязацельствах называлі, колькі яны бяруцца пусціць пад адхон эшалонаў, узарваць аўтамашын, здзейсніць дыверсій. На кожнага партызана заводзіўся баявы рахунак.

— 28 сакавіка 1942 года спецыяльны батальён СС, які налічваў 500 адборных ваяк, атрымаў загад знішчыць партызан у трохкутніку Віцебск — Гарадок — Сураж. Мы даведаліся пра гэта. У выніку дакладна распрацаванай аперацыі, стратэгічна ўдалага выбару месца засады (каля вёскі Платы) 320 эсэсаўцаў знайшлі сваю смерць ад куль народных мсціўцаў. Але і мы страцілі чатырох сяброў, у тым ліку і кулямётчыка, камсамольца Міхаіла Сільніцкага. Менавіта за гэты бой ён пасмяротна ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР 25 партызан былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі, — узгадваў Даніла Фядотавіч.

Пагалоска аб буйной перамозе партызан над акупантамі разляцелася далёка. У атрад пацягнуліся людзі. На 1 мая 1942 года іх ужо налічвалася 1500, атрад быў пераўтвораны ў брыгаду імя Чырванасцяжнага Ленінскага камсамола. І не даваў спакою акупантам ні днём, ні ўначы.

...Доўгай была вайна і жорсткай. Многія злажылі свае галовы дзеля перамогі над ворагам. Былі расстраляны фашыстамі бацька Данілы Райцава, Фядот Пахомавіч — удзельнік Першай сусветнай вайны, інвалід, маці Пелагея Сцяпанаўна, сястра Кацярына з маленькім сынком. Не вярнуліся з нямецкай няволі сёстры Марыя і Соф'я. Усяго 14 чалавек радні пазбавіла жыцця вайна. Не абмінула фашысцкая куля і самога Данілу Фядотавіча, пакінула інвалідам.

Праз два гады пасля нашай размовы, 3 чэрвеня 1996-га, ён сышоў ад нас, далучыўшыся да многіх баявых сяброў...

Таццяна КУЗЬМІЧ.

г. Віцебск.

Нарадзіўся народны герой у 1914 годзе ў вёсцы Міхалкава тагачаснага Віцебскага павета ў сялянскай сям'і. Скончыў Ноўкінскую фабрычна-заводскую сямігодку і шасцімесячныя настаўніцкія курсы. Два гады працаваў настаўнікам пачатковай Курынскай школы. А ў 1932-м паступіў у Горацкі сельскагаспадарчы інстытут на землеўпарадкавальны факультэт. Па загадзе наркама сельскай гаспадаркі СССР у 1935 годзе, датэрмінова здаўшы экзамены, быў накіраваны землеўпарадчыкам у Суражскі раён. Тут ажаніўся. У красавіку 1941-га малады камуніст Райцаў атрымаў заданне — прыбыць у якасці начальніка геадэзічнай групы на ваенную спецбудоўлю № 12-39 у пагранічную зону...

P.S. ***Камбрыг Райцаў, будучы ўпэўненым, што гэта патрэбна нашчадкам, захаваў практычна ўвесь архіў сваёй партызанскай брыгады. Пасля смерці Данілы Фядотавіча яго ўдава Вольга Міхайлаўна перадала дакументы ў абласны музей імя М.П. Шмырова.***

Пры падрыхтоўцы матэрыялу я карысталася запісанымі мной успамінамі Данілы Фядотавіча Райцава, а таксама яго 90-гадовай сястры Ганны Фядотаўны Гаголкінай — былой партызанкі 1-й Віцебскай партызанскай брыгады пад камандаваннем Біруліна, якая жыве ў Віцебску.

БЛАСЛАВЕННЕ НА ПОДЗВІГ

Царква ўжо ў першы дзень вайны заклікала савецкіх грамадзян ахвяраваць сабой дзеля Радзімы

Пра ўдзел Царквы ў вызваленні нашай зямлі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, пра тое, аб чым пакуль не пішуць у свецкіх падручніках па гісторыі, «Звязда» распытала выкладчыка мінскіх духоўных акадэміі і семінарыі протадыякана Паўла Бубнова.

— Айцец Павел, ці шмат сярод свяшчэннаслужыцеляў ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны?

— Цяпер сярод маіх асабістых знаёмых такіх ужо не засталося. Але яшчэ 10 гадоў таму іх было досыць шмат.

— Гэта былі людзі, якія ваявалі, а потым сталі святарамі? Ці яны ў гады вайны спалучалі сан і барацьбу з захопнікамі?

— Былі і такія, але большасць ветэранаў унутры Царквы стала святарамі пасля заканчэння вайны. З іх ліку — насельнік Жыровіцкага манастыра схіархімандрыт Мітрафан (Ільін), якога шанавалі як старца. У гады вайны ён ваяваў у партызанскім атрадзе імя Дзімітрава брыгады Панамарэнкі, якая дзейнічала ў Брэсцкай вобласці. Камандаваў дыверсійнай групай, быў узнагароджаны медалём «За адвагу». У 1958 годзе ён прыйшоў у Жыровіцкі манастыр, доўгія гады быў духоўным настаўнікам і памочнікам тысячам людзей.

— Ён што-небудзь расказваў пра сваё ваеннае мінулае?

— Ён стараўся гэта не афішыраваць. Былі выпадкі, калі нехта з яго былых паплечнікаў па партызанскім атрадзе сустракаў яго ў манастыры, але айцец Мітрафан не дэманстраваў былыя сувязі.

Мітрапаліт Круціцкі і Каломенскі Мікалай (Ярушэвіч) уручае фармуляр танкістам калоны імя Дзімітрыя Данскога. Сакавік 1944 года.

— Айцец Павел, раскажыце, у якім стане Праваслаўная царква на нашай зямлі сустрэла пачатак Вялікай Айчыннай вайны?

— Пасля прыходу да ўлады бальшавікоў у Расіі, пачынаючы з 1918 года, прымаецца шэраг дэкрэтаў, якія накіраваны фактычна на знішчэнне Царквы. Ажыццяўленне гэтых дэкрэтаў і іншых законаў у 1920-1930-я гады прывяло да таго, што на тэрыторыі Савецкай Беларусі да 1939 года, як і на ўсёй тэрыторыі Савецкага Саюза, царкоўнае жыццё было ліквідавана. У Савецкай Беларусі не дзейнічаў ніводны праваслаўны храм, ніводны манастыр, ніводная навучальная ўстанова, ніводнае перыядычнае выданне ці іншая арганізаваная форма царкоўнага жыцця. Царква і рэлігія былі аб'яўлены ідэалагічнымі ворагамі, паплечнікамі папярэдняга ладу. Дзясяткі тысяч свяшчэннаслужыцеляў і манахаў (у маштабах Саюза — мільёны) былі асуджаны, сотні тысяч — расстраляны або загінулі ў лагерах.

На далучаных у 1939 годзе да Савецкага Саюза тэрыторыях царкоўнае жыццё не знішчалася настолькі хутка з-за нестабільнай знешнепалітычнай сітуацыі, хаця гэта было ў планах савецкай улады.

Пасля 22 чэрвеня 1941 года савецкая рэлігійная палітыка карэнным чынам змянілася. Бо цяпер не столькі ў ваенным, колькі ў ідэалагічным супрацьстаянні Савецкага Саюза і германскага нацызму Царква аказалася патрэбнай асабіста Сталіну і савецкай уладзе. Кіраўнік Рускай праваслаўнай царквы, прадстаяцель Мітрапаліт Сергій (Старагародскі), Патрыяршы Месцаблюсіцель, з першага дня вайны і потым больш за 50 разоў атрымліваў магчымасць публічна звяртацца да Царквы з пасланнямі, што ў папярэднія гады было проста немагчыма.

Царква таксама атрымала магчымасць збіраць і перадаваць сродкі для арміі і фронту. У пачатку 1944 года на ахвяраванні вернікаў была пабудавана танкавая калона імя Дзімітрыя Данскога. Быў нават адкрыты спецыяльны банкаўскі рахунак Рускай праваслаўнай царквы, што было зроблена ў парушэнне савецкіх законаў, бо Царква не мела права юрыдычнай асобы.

— Што ў гэты час адбывалася на акупаваных тэрыторыях?

— Цяпер даследчыкам вядома, што нацысцкая ідэалогія прадугледжвала да 1965 года знішчэнне ўсіх хрысціянскіх канфесій на тэрыторыі Трэцяга рэйха і насаджэнне язычніцкага старажытнаарыйскага германскага культу. Але калі на акупаваных тэрыторыях пачалося стыхійнае адраджэнне царкоўнага жыцця, новыя ўлады гэтаму не перашкаджалі. Такім чынам было адкрыта 9400 храмаў, у тым ліку на тэрыторыі сучаснай Беларусі — каля 700. Праваслаўным прыходам былі вернутыя святыні з антырэлігійных музеяў — напрыклад, мошчы прападобнай Еўфрасінні Полацкай і праведнай Сафіі Слуцкай.

Асаблівую вядомасць у гэты час атрымаў насельнік Жыровіцкага манастыра архімандрыт Серафім (Шахмуць), які са святаром Рыгорам Кудрэнкам адкрываў храмы ва Усходняй Беларусі, здзяйсняў набажэнствы і таінствы. Сучаснікі назвалі той час Другім Хрышчэннем Русі. Прыходзілася працаваць дзень і ноч, каб насыціць духоўную прагу, якая ўтварылася за два папярэднія дзесяцігоддзі...

— Была ж яшчэ патрэба маліцца за блізкіх, з якімі разлучыла вайна.

— Так, не толькі меркантыльны разлік савецкай дзяржавы стаяў за пераменай адносін да Царквы, але і разуменне, што людзям у экстрэмальных абставінах патрэбна суцяшэнне і дапамога. Новыя храмы ў савецкім тыле пакуль не адкрываліся, але дзеючым ужо не рабіліся перашкоды, і нават вядома, што ў блакадным Ленінградзе дзеючыя храмы забяспечваліся мукой і віном для здзяйснення Літургіі.

Паваротным момантам у рэлігійнай палітыцы савецкага кіраўніцтва стала 4 верасня 1943 года, калі Сталін запрасіў да сябе Мітрапаліта Сергія (Старагародскага), Мітрапаліта Аляксія (Сіманскага) і Мітрапаліта Мікалая (Ярушэвіча). На гэтай сустрэчы, па-першае, было аб'яўлена пра стварэнне спецыяльнага савецкага органа па

Протаіерэй, былы настаяцель Нясвіжскай Свята-Георгіеўскай царквы Дзмітрый Хмель (памёр у 2009 г.), ганаровы грамадзянін горада Нясвіжа, кавалер ордэна Айчыннай вайны I ступені, узнагароджаны медалямі «За баявыя заслугі», «За ўзяцце Кенігсберга», «За перамогу над Германіяй», «За адвагу».

ўзаемаадносінах з Царквой — Савета па справах Рускай праваслаўнай царквы. Потым было паведамлена пра неабходнасць абрання Патрыярха. Пасля смерці Патрыярха Ціхана ў 1925 годзе савецкая ўлада не дазваляла праводзіць Сабор для абрання Патрыярха. На сустрэчы з мітрапалітамі Сталін папрасіў сабраць Сабор «бальшавіцкімі тэмпамі» (і яго сабралі за 4 дні). Таксама разглядалася пытанне пра магчымае вызваленне з месцаў пазбаўлення волі свяшчэннаслужыцеляў і епіскапаў...

— Што паслужыла нагодай?

— Існуе пэўная міфалагізацыя гэтага рашэння Сталіна, але ўсё дастаткова проста. Гэта было зроблена, у першую чаргу, дзеля знешнепалітычнага іміджу напярэдадні Тэгеранскай канферэнцыі. Важна было ўсяму свету паказаць, што Царква ў Савецкім Саюзе існуе і яна разам з савецкай уладай змагаецца супраць фашызму.

Абранне Патрыярха, да таго ж, стала ўдарам ніжэй пояса для фашысцкай прапаганды, якая сцвярджала, што Германія ідзе на Усход з «крыжовым паходам» па вызваленні хрысціянства, — а гэта было няпраўдай. Гебельс нават сцвярджаў, што на Сабор былі звезены пераапранутыя транспартныя рабочыя.

Фактычна гэта было выкарыстанне Царквы ў зямных мэтах, але чалавек веруючы ўсе гістарычныя падзеі разглядае ў святле Божай волі. Мы бачым, што нават тут, праз мэты зямнога кіраўніка, Гасподзь спрыяў Царкве, людзі атрымалі адкрытыя храмы і манастыры.

— Як паводзілі сябе свяшчэннаслужыцелі на акупаванай тэрыторыі?

— Яны аказаліся паміж двух агнёў. Большасць святароў разумела, што добразычлівасць акупацыйнай улады да Царквы часовая. Яны адкрыта і ў прыватных размовах казалі пра непазбежную перамогу нашай зброі. Абранне Патрыярха таксама сведчыла, што царкоўнае жыццё магчымае пры савецкай уладзе. Да таго ж партызаны, якія дзейнічалі па ўсёй Беларусі, разлічвалі на матэрыяльную і інфармацыйную дапамогу святароў. Часта святары хавалі людзей, выратоўваючы іх жыцці.

Настаяцель Одрыжскай Свята-Успенскай царквы Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці Васіль Капычка дапамагаў раненым воінам Чырвонай Арміі. Яго дом стаў месцам сустрэч падпольшчыкаў з партызанамі. Святар заклікаў вернікаў да супраціўлення, перапісваў і распаўсюджваў зводкі Савецкага інфармбюро, партызанскія лістоўкі, арганізоўваў збор адзення і прадуктаў для партызан, перадаваў ім зброю. Калі нацысты ўжо выпісалі ордэн на яго арышт, партызаны літаральна ў апошнія хвіліны вывезлі святара і яго сям'ю ў лес, і да вызвалення Беларусі ён знаходзіўся ў партызанскім атрадзе. Айцец Васіль быў узнагароджаны баявымі ордэнамі і медалямі.

Выступленне святара перад партызанамі.

Настаяцель царквы ў сяле Хворасна Лагішынскага раёна Пінскай вобласці святар Іаан Лойка прынародна ваславіў трох сваіх сыноў ісці ў партызаны. Калі пазней Хворасна было акружана карнікамі і партызаны вырашылі вывесці большую частку насельніцтва, айцец Іаан застаўся з тымі, хто не мог ісці (хворымі, старымі, калекамі), і быў спалены разам з 300 прыхаджанамі ў храме, дзе здзяйсняў Божую літургію.

У баявых аперацыях партызанскага злучэння ўдзельнічаў настаяцель іншага прыхода ў Лагішынскім раёне, у сяле Мала-Плотніцкае, протаіерэй Аляксандр Раманушка...

— Цікава, што ў сваёй кнізе «Беларусь у гістарычным дзяржаўным і царкоўным жыцці» архіепіскап Афанасій (Мартос) расказвае пра так званыя зарокі, якія рабілі беларусы ў гады вайны: за адну ноч выраблялі і ўсталёўвалі на ўездах у свае населеныя пункты паклонныя крыжы, звяртаючыся такім чынам па Божую абарону і знаходзячы суцяшэнне. А жыхары роднай вёскі архіепіскапа Вялікая Ліпа Нясвіжскага раёна расказалі мне, як падчас акупацыі жанчыны, чые мужчыны загінулі або былі на фронце, у партызанах, ці лёс іх быў невядомы, па зароку за адну ноч спралі і саткалі 8-метровае палатно, каб пакрыць іканастас...

— Падобны выпадак адбыўся ў 1942 годзе ў Барыса-Глебскім прыходзе ў вёсцы Накрышкі Дзятлаўскага раёна. Падчас карнай аперацыі ў Ліпічанскай пушчы была спалена вёска Дуброўка разам са 122 жыхарамі. На чарзе былі Накрышкі. І тады мужчыны далі зарок і за адну ноч пайшлі ў лес, ссеклі дуб, абчасалі, а потым з гэтых брусоў збілі і ўсталявалі крыж, а жанчыны той жа ноччу спралі і саткалі ручнік, каб гэты крыж упрыгожыць. Світанак вёска сустракала ля крыжа, з малітвай. Немцы чамусьці Накрышкі не кранулі. З таго часу і дагэтуль у кожную сераду Веліконага тыдня прыхаджане згадваюць цудоўнае выратаванне сваёй вёскі і дзякуюць Богу. Крыж, дарэчы, стаіць і цяпер.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

P.S. ***Калі я пазваніла настаяцелю Барыса-Глебскага прыхода ў Накрышках, каб удакладніць падзеі вясны 1942 года, протаіерэй Рыгор РОЙ распавёў мне яшчэ і пра свяшчэнніка Дзімітрыя Гладкова і псаломшчыка Андрэя Зенюка, якія выратавалі ў Накрышках моладзь ад угону ў Германію, а на гарышчы царквы, усяго за 250 метраў ад нямецкай камендатуры, размясцілі партызанскі лазарэт. Дачка айца Дзімітрыя Таццяна і нявестка Вера працавалі медсёстрамі ў немцаў і дзякуючы гэтаму маглі дастаць медыкаменты для параненых і хворых партызан. Акупанты так і не даведаліся пра сапраўдную веру беларускіх святароў і іх паствы.***

■ Гістарычны ўнікат

БЕЗ ГРЫФА «САКРЭТНА»

ЭКСКЛЮЗІЎНЫЯ ДАКУМЕНТЫ ВАЕННАГА ЧАСУ СТАЛІ ДАСТУПНЫМІ ШЫРОКАЙ ГРАМАДСКАСЦІ

У дні святкавання 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў беларускія даследчыкі прэзентавалі новыя творы. У Нацыянальным архіве краіны ўбачылі свет зборнікі дакументаў і матэрыялаў «Партызаны ў аперацыі «Баграціён» і «Хатынскі некропаль».

— Дзякуй Богу, што настаў той час, калі мы можам спакойна ствараць такія арыгінальныя, унікальныя дакументальныя зборнікі, дзе адкрываецца душа беларускага народа, — перакананы **акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі Аляксандр КАВАЛЕНЯ.** — Гэта помнікі ўсім тым, хто аддаў свае жыцці за вызваленне Беларусі, хто жыў, змагаўся на тэрыторыі нашай краіны тры цяжкія ваенныя гады. Гэта помнікі, у першую чаргу для тых, хто сёння жыве і працуе ў Беларусі, і для тых, хто прыйдзе пасля нас. Я думаю, што на базе такіх кніг будуць напісаны дыпломныя і курсавыя работы, бо, як паказвае жыццё, студэнты ВНУ усё часцей звяртаюцца да вечнай тэмы Вялікай Айчыннай вайны. Такія кнігі павінны быць у кожнай школьнай бібліятэцы, у грамадскіх бібліятэках. Падобныя выданні дазваляюць аб'ектыўна ўбачыць тыя складаныя і супярэчлівыя працэсы, якія адбываліся на акупаванай тэрыторыі Беларусі і ўвогуле ў гады вайны.

Кніга «Партызаны ў аперацыі «Баграціён» складаецца з 200 дакументаў. У іх — звесткі аб падрыхтоўцы і правядзенні беларускімі партызанамі трэцяга этапу «рэйкавай вайны», які пачаўся ў ноч на 20 чэрвеня 1944 года, дакументальныя доказы баявога ўзаемадзеяння партызанаў з часцямі Чырвонай Арміі ў ходзе аперацыі «Баграціён». Акрамя таго, у выданні публікуюцца загады, распараджэнні, дырэктывы, шыфртэлеграмы, радыяграмы, планы, справаздачы, дакладныя запіскі, інфармацыі, даведкі, зводкі, данясенні, рапарты, звароты.

Асаблівую цікавасць выклікае апублікаваная аператыўная дакументацыя: шыфртэлеграмы першага сакратара ЦК КП(б)Б Панцеляймона Панамарэнкі, начальніка Беларускага штаба партызанскага руху Пятра Калініна і яго намесніка Івана Ганенкі, начальнікаў аператыўных груп на БШПР на франтах і камандзіраў партызанскіх фарміраванняў. Дакументы дазваляюць літаральна дзень за днём прасачыць некаторыя тонкасці аператыўнага кіраўніцтва дзеяннямі партызанаў падчас вызвалення Беларусі.

За апошнія 20 гадоў архіўнай службай Беларусі выдадзена 69 зборнікаў дакументаў і даведачных зборнікаў рознага тыпу. Дарэчы, гэты — сямідзясяты!

— Здавалася б, пасля вайны прайшло ўжо амаль 70 гадоў, а мы знаходзім усё новыя і новыя тэмы, з якімі знаёмім шырокія колы грамадскасці, — сказаў **дырэктар Дэпартамента па архівах і справаводству Міністэрства юстыцыі Беларусі Уладзімір АДАМУШКА.** — Тэму ўдзелу партызанаў у аперацыі «Баграціён» мы раней не падымалі. Хоць я павінен зазначыць, што за апошнія 20 гадоў архіўнай службай Беларусі выдадзена 69 зборнікаў дакументаў і даведачных зборнікаў рознага тыпу. Гэты — сямідзясяты! Дакументы, якія знайшлі ўвасабленне ў зборніку, — пачатак справы. Яны адлюстроўваюць толькі асноўныя этапы ўдзелу партызанаў у аперацыі «Баграціён». А колькі яшчэ належыць вывучыць, прааналізаваць і выпусціць у свет!

Як расказаў **галоўны архівіст Нацыянальнага архіва Вячаслаў СЕЛЯМЕНЕЎ,** пры стварэнні кнігі аўтары акцэнтавалі ўвагу на тых дакументах, якія раней не публікаваліся. «Пэўная інфармацыя ў савецкі час не была даступнай даследчыкам, — прызнаўся адзін з укладальнікаў зборніка. — Сёння з іх зняты грыфы сакрэтнасці. Многія факты даўно вядомыя, але некаторыя дакументы пашыраюць нашы веды аб гэтай аперацыі і ўвогуле аб ролі партызанаў у ёй. Тым не менш, на жаль, даследчыкі мала цікавяцца падобнымі дакументамі. Магчыма, выхад гэтага зборніка падштурхне іх да больш актыўнай працы».

Сімвалічна, што другі зборнік дакументаў і матэрыялаў, прэзентаваны ў архіве, убачыў свет не толькі напярэдадні святкавання 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, а і ў год 45-годдзя адкрыцця мемарыяльнага комплексу «Хатынь». Кніга «Хатынскі некропаль» прысвечана стварэнню хатынскіх мемарыяльных могілак беларускіх вёсак, не адноўленых пасля вайны, і расказвае аб трагедыі, якую перажыла ў гады ваеннага ліхалецця кожная з увекавечаных там вёсак.

— Па гэтай тэме намі выдадзены ўжо не адзін твор, але ўсё роўна яшчэ ёсць над чым працаваць, — падкрэсліў Вячаслаў Селяменеў. — Чаму мы здзівіліся падчас працы над кнігай? Нягледзячы на тое, што з дня адкрыцця мемарыяла прайшло ўжо 45 гадоў, і дагэтуль па многіх вёсках увогуле няма звестак, таму мы нават не ведаем, як іх знішчылі. А яшчэ давялося высветліць, што на могілках у Хатыні няправільныя звесткі па адной спаленай вёсцы. Вёска Баравыя знаходзілася ў Верхнядзвінскім раёне, а яе «перанеслі» ў Браслаўскі.

У зборніку змяшчаюцца даведкі, інфармацыі, акты, пратаколы допытаў, успаміны сведак і іншыя дакументы, знойдзеныя ў Нацыянальным архіве Беларусі, Цэнтральным архіве КДБ краіны і Дзяржаўным архіве Расійскай Федэрацыі. Усяго ў кнізе — 181 дакумент.

— «Хатынскі некропаль» — адзін з тых зборнікаў дакументаў і матэрыялаў, які выдадзены ў межах праекта «Павышэнне статусу выратаваных жыхароў спаленых беларускіх вёсак», — расказала **каардынатар праекта, укладальніца зборніка Наталля КІРЫЛАВА.** — Так склалася, што наша гуманітарная дзейнасць непарыўна звязана з навуковай. У нас нямала аднадумцаў, якія дапамагаюць у тым ліку ў выданні падобных твораў. Напрыклад, краязнавец Антон Бубала, складальнік кнігі «Памяць. Верхнядзвінскі раён» шмат чаго зрабіў, каб увекавечыць памяць спаленых фашыстамі вёсак у сваіх родных мясцінах. Менавіта дзякуючы працы ў раёнах, атрымалася сабраць успаміны жыхароў спаленых вёсак і фотаздымкі помнікаў, усталяваных на іх месцах.

Як падзяліліся ўкладальнікі, у планах — стварэнне падобнага зборніка, у якім ужо будзе расказвацца пра лёс спаленых вёсак, якія былі адноўлены пасля вайны. Спадзяёмся, што лёсы гэтых населеных пунктаў хутка стануць набыткам шырокай аўдыторыі.

Вераніка КАНЮТА

■ Помніць, шанаваць, ганарыцца

ДВА ПОЛІ

Велізарным полем, на якім выспявала вялікая Перамога, стала наша Беларусь у чэрвеньскія дні семдзесят гадоў таму. Тут дынамічна разгортваліся гераічныя падзеі, у якіх гартаваліся воля і незалежнасць шматнацыянальнага народа, выкрышталізоўваўся яго магутны стваральны дух…

Лаканічнымі штрыхамі малюецца перамога ў песні «Два полі» Анатоля Вярцінскага і Эдуарда Ханка. Яна ўспрымаецца духоўнай напоўненасцю былiннай прасторы, якая набывае акварэльнае аблічча поля. Аўтары песні стварылі глыбоказначны вобраз гэтага поля ў шматаспектным выяўленні. Для кожнага з нас у маленстве яно паўстае казачнай нівай, дзе нашыя няхітрыя забавы і дзівосныя ўяўленні расквечваюць наваколле, а з гадамі ператвараецца ў працоўныя палеткі. Калі ж агрэсіўная навала дакоціцца да квітнеючых межаў, поле становіцца ратным, мужным, выратавальным. І заўсёды, што б ні адбывалася, яно было і застаецца Полем Жыцця. Мы працуем, дзейнічаем дзеля шчаслівай будучыні. І ахвяруем, змагаемся, паміраем дзеля светлага заўтра. І жыццядайнае поле ўвесь час з'яўляецца для нас як самае блізкае і дарагое, што і падкрэслена ў апошнім прыпеве песні. У ім перапаўтараецца расповед пра поле, яднаючы пачуцці-ўспаміны маленства і сталасці пра адзіны нязгасны вобраз Поля Жыцця…

Гэтак і нашая Беларусь. У разнастайных гістарычных варунках яна гартуецца як Поле Жыцця — вольнага і заможнага, велічнага і творчага.

Падрыхтаваў Міхась ШАВЫРКІН.

Верш Анатоля Вярцінскага. Музыка Эдуарда Ханка.

Было ў салдата два полі:
поле, дзе кветкі ірваў,
бегаў з сябрамі па волі,
і поле, дзе ён ваяваў.

Прыпеў:
Ціха было і чыста
у полі яго дзяцінства.
Былі агонь і дым
на полі ратным тым.

Два полі было ў салдата.
Адно зелянела травой.
Другое было ўзарата
Вайной і паліта крывёй.

Прыпеў.

Было ў салдата два полі:
поле, дзе кветкі збіраў,
бегаў з сябрамі на волі,
і поле, дзе ён паміраў.

Прыпеў:

Былі агонь і дым
на полі ратным тым.
Ціха было і чыста
у полі яго дзяцінства.
Былі агонь і дым
на полі ратным тым.



Пятра Іванавіча ПАЗНЯКА віншуюць са святам удзячныя вучні, калегі, сям'я.

УНП 191276576

«БЕЛАРУСЬ-ПАРТЫЗАНКА»



Па гарызанталі: 3. Урачыстае абяцанне. **8.** Жаргон. **9.** Твор, праца (жарт.). **10.** ... Ракасоўскі. Імя камандуючага 1-м Беларускім фронтам, які ўнёс вялікі ўклад у вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. **15.** «Стройся, першая ... !\\Запявалы, — на фланг!». З верша М.Калачынскага «Стралковая ...». **16.** ... віляе хвастом, а Гебельс — языком (прыказка ваенных часоў). **17.** «Быў чэрвень.\\Эшалоны ...\\На фронт спяшаліся, ішлі». З верша М.Танка «Мы зноў на месцы тым». **20.** «Нармандыя — ...». Французскі знішчальны авіяполк, які ўдзельнічаў у вызваленні Беларусі. **21.** Мінеральная фарба. **22.** «Ды там, дзе ўпаў баец на дол,\\У ... кожнае на ўгодкі\\Суніцы высыплюць наўкол». З верша В.Гардзея «Суніцы». **23.** «Мінскі ...». Поўнае акружэнне гітлераўскіх войскаў у наваколлі Мінска ў канцы чэрвеня — пачатку ліпеня 1944 года, калі было знішчана і ўзята ў палон больш за 100 тысяч нямецкіх салдат. **26.** Баявая машына камандзіра ўзвода Д.Фролікава, якая 3 ліпеня 1944 года першая ўварвалася ў Мінск. **27.** «Мы з бёрнаў сасновых\\Прасторныя хаты рубілі.\\... спапяліў іх,\\А мы і ... разбілі». З верша П.Панчанкі «Мы з тых беларусаў». **30.** Калючы куст або дрэва. **33.** «Не зламаць, не сагнуць мой народ,\\Бо ўся Беларусь — ...». З верша А.Астрэйкі «Беларусь- ...». **35.** «І слату і нягоды,\\І начныя паходы,\\І ... партызанскіх кастроў». З песні «Лясная песня» (сл. А.Русака, муз. У.Алоўнікава). **36.** «Чырвонасцяжная ...\\Святлом святочным фарбавала\\У Мінску ліст календара». З верша А.Вялюгіна «Трэцяе ліпеня». **37.** Прыпынак у дарозе для адпачынку.

Па вертыкалі: 1. Гарадскі пасёлак на Гомельшчыне; першы населены пункт, вызвалены савецкімі войскамі 23 верасня 1943 года. **2.** «Разышоўся Вільгельм Кубэ: -\\Беларусь — калонія!\\Партызаны міну ў ... -\\І ўся цырымонія» (прыказка ваенных часоў). **4.** ... горы разбівае (прык.). **5.** «Ты — ...\\Беларусі, маёй Радзімы.\\Колькі ўплецена ў ім падзей!». З верша А.Грачанікава «Круглая плошча». **6.** Салдацкі ... усюды салодкі (прык.). **7.** «А ён, плячысты беларус- ...,\\Упарта прабіваўся на Берлін». З верша М.Аўрамчыка «Салдацкая сляза». **11.** Майстар паветранага бою. **12.** «...-2». Самалёт, савецкі штурмавік часоў Вялікай Айчыннай вайны (скар.). **13.** Стома. **14.** Кодавая назва савецкай наступальнай аперацыі, у выніку якой да канца ліпеня 1944 года Беларусь была поўнасцю вызвалена ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. **18.** Памяшканне для стаянкі і рамонту самалётаў. **19.** Цёмная ... — дзень партызанскі (прык.). **24.** Орган самакіравання ў некаторых краінах Заходняй Еўропы. **25.** Гільза артылерыйскага снарада. **28.** «Яны ў суровую часіну\\Сваё жыццё, бясцэнны дар,\\Прынеслі на ... Айчыны». З верша А.Нафрановіча «Балючая памяць душы». **29.** «Такой эпапеі, герояў такіх\\Не чулі мы ў казках, у кнігах». З верша Я.Коласа «... героям!». **31.** Чацвёртая нота музычнай гамы. **32.** «... -47». Адзін з лепшых узораў індывідуальнай аўтаматычнай зброі (скар.). **33.** «Свае раны абмыем дняпроўскай вадою мы\\І на ... пераможцаў збяромся сюды». З верша П.Панчанкі «Курганы». **34.** Першапачатковыя веды.

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ,

г. Дзяржынск.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ:

Па гарызанталі: 3. Клятва. 8. Арго. 9. Опус. 10. Канстанцін. 15. Рота. 16. Сабака. 17. Рана. 20. Нёман. 21. Охра. 22. Лета. 23. Кацёл. 26. Танк. 27. Фашыст. 30. Цёрн. 33. Партызанка. 35. Агні. 36. Зара. 37. Прывал.

Па вертыкалі: 1. Камарын. 2. Бок. 4. Ласка. 5. Вянок. 6. Сон. 7. Асілак. 11. Ас. 12. «Іл». 13. Стамленне. 14. «Баграціён». 18. Ангар. 19. Ночка. 24. Ландтаг. 25. Стакан. 28. Алтар. 29. Слава. 31. Фа. 32. «АК». 33. Пір. 34. Азы.

Даты | Падзеі | Людзі

1983 год — на месцы вёскі Шунеўка (Докшыцкі раён Віцебскай вобласць), спаленай фашыстамі 22 мая 1943 года разам з яе жыхарамі, адкрыты мемарыяльны комплекс «Праклён фашызму» (скульптар А. Анікейчык, архітэктары Ю. Градаў, Л. Левін). У цэнтры кампазіцыі — бронзавая фігура жанчыны з паднятымі ў праклёне рукамі, якая стаіць у праёме стылізаванай брамы. Да краю абламанай гарызантальнай перакладзіны брамы прымацаваны 3 званы, 2 з якіх звоняць, а 3-ці расколаты — сімвал таго, што кожны трэці жыхар раёна загінуў у гады вайны. Недалёка ад манумента знаходзіцца зруб студні, куды гітлераўцы кінулі жывымі дзяцей і настаўніцу. Над ім бронзавая выява абпаленага паветранага змея з імёнамі загінулых дзяцей. На месцы кожнага з 22 былых дамоў — стылізаваны падмурак з ганкам, на верхняй прыступцы якога кампазіцыя ў выглядзе языкоў полымя з імёнамі былых гаспадароў.

1993 год — у Мінску на базе былога Музея гісторыі войскаў Чырванасцяжнай Беларускай ваеннай акругі створаны Дзяржаўны музей ваеннай гісторыі Рэспублікі Беларусь. Музей размяшчаецца ў трох экспазіцыйных залах. Першая зала прысвечана засяленню славянамі тэрыторыі Беларусі, гісторыі Беларусі ў складзе ВКЛ і Расійскай імперыі, падзеям 1-й сусветнай вайны. Другая зала адлюстроўвае падзеі грамадзянскай вайны 1918–1920 гадоў, ваенны перыяд, перыяд Вялікай Айчыннай вайны. Трэцяя зала прысвечана пасляваеннаму перыяду, станаўленню Узброеных Сіл СССР у мірны час. Асабліва шырока прадстаўлена гісторыя Узброеных Сіл Беларусі. У экспазіцыі асабістыя рэчы камандуючых Беларускай ваеннай акругай, матэрыялы пра першага Героя Беларусі У. М. Карвата, удзельнікаў ліквідацыі катастрофы на Чарнобыльскай АЭС.

1997 год — Прэзідэнтам Аляксандрам Лукашэнка ў памяць аб вызваленні сталіцы краіны горада Мінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў 3 ліпеня абвешчана нацыянальным святам Рэспублікі Беларусь — Днём Незалежнасці. Галоўнае свята краіны невыпадкова называецца Днём Незалежнасці. Незалежнасць асацыюецца ў кожнага чалавека найперш са свабодай ад іншаземнага рабства. Беларусы ведаюць цану свабодзе: у Вялікай Айчыннай вайне за яе загінуў кожны трэці жыхар рэспублікі. Рашэнне аб святкаванні Дня Незалежнасці (Дня Рэспублікі) было прынята восенню 1996 года — так прагаласавалі беларусы на рэферэндуме.

Было сказана

Амар ХАЯМ, персідскі паэт, вучоны:

«Можна спакусіць мужчыну, у якога ёсць жонка, можна спакусіць мужчыну, у якога палюбоўніца, але нельга спакусіць мужчыну, у якога ёсць каханая жанчына!»

70 ТВАРАЎ ВЯЛІКАЙ ВАЙНЫ

Столькі фотапартрэтаў абаронцаў Айчыны ва ўзросце ад 84 да 99 гадоў можна пабачыць у абласным грамадска-культурным цэнтры Гомеля.

Ініцыятарамі выставы «70 гадоў — 70 твараў Вялікай вайны» сталі супрацоўнікі газеты «Гомельскія ведамасці». Як расказала яе галоўны рэдактар Тамара Суботка, 70 розным фатографам — аматарам і прафесіяналам — было прапанавана зрабіць фотапартрэт аднаго франтавіка. Журналісты газеты ўзялі ў ветэранаў невялікія інтэрв'ю, якія ілюструюць яркі эпізод іх удзелу ў баях.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

У сувязі са святам наступны нумар газеты выйдзе 5 ліпеня г.г.

НАРОДЖАНЫЯ 3 ліпеня

Гэта хранікёры, летапісцы, людзі, якія збіраюць падзеі і традыцыі. Многія з іх лічаць сябе змагарамі за правы грамадзяніна. Могуць быць прыхільнікамі кансерватыўных поглядаў і звычак, хаця з задавальненнем успрымаюць любую эксцэнтрычнасць, тонка адчуваюць гумар. Яны гадамі шукаюць спадарожніка, здольнага зразумець і ацаніць іх. Асаблівую цікавасць для іх уяўляе чалавечы характар, яны зрэдку дазваляюць сабе ўмешвацца ў пачуцці навакольных. Натуры чуллівыя і цікаўныя, яны раскідваюцца па розных сферах, таму што заўсёды ў пошуку розных прыгод.

НАРОДЖАНЫЯ 4 ліпеня

Яны ніколі не забываюцца пра свае карані і цэняць іх, камфортна адчуваюць сябе ў ролі прадстаўнікоў той ці іншай групы. Натуры спагадлівыя, яны здольны ўлоўліваць нават патаемныя думкі і перажыванні іншых, заўсёды прапаноўваюць канкрэтную дапамогу, аб'ектыўна разбіраюцца ў цяжкай сітуацыі. Народжаным у гэты дзень неабходна асцерагацца эгаізму, пагардлівасці і беспадстаўнага гневу.

СЁННЯ

Сонца	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	4.43	21.44	17.01
Віцебск	4.25	21.41	17.16
Магілёў	4.33	21.34	17.01
Гомель	4.39	21.21	16.42
Гродна	5.00	21.57	16.57
Брэст	5.10	21.49	16.39

Месяц

Першая квадра 5 ліпеня. Месяц у сузор'і Дзевы.

Імяніны

Пр. *Іны, Рымы, Андрэя, Афанасія, Глеба, Дзмітрыя, Івана, Лукі, Навума, Мікалая.*

К. *Анатоля, Гіацынта, Фамы.*



Фота Алесі ВАРАБ'ЁВАЙ.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

— Дзяўчына, я ведаю, вы ж даўно чакаеце прынца на белым кані?
— Так.
— Ну вось. Я прыйшоў.
— Крута, а дзе прынц?

Яна была з тых жанчын, якіх асцерагацца мне раіла мама і якіх так рэкамендаваў тата.

— У вас піражкі свежыя?
— Свежыя, свежыя, яны ў нас даўно свежыя.

На дзень нараджэння хтосьці прынёс семачкі. Піць так і не пачалі.

— Мілая, ты не бачыла мой паскаральнік квантавых часціц?
— Тваё піва ў халадзільніку!

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by; e-mail: info@zvyazda.minsk.by, (для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.481. Індэкс 63850. Зак. № 2627.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 2 ліпеня 2014 года.